Цэнтр даследаванняў
беларускай культуры, мовы і літаратуры
НАН Беларусі




# Тадэвуш Касцюшка
## ў дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці

Матэрыялы
Міжнароднай навуковай
канферэнцыі

**Цэнтр даследаванняў**
**беларускай культуры, мовы і літаратуры**
**НАН Беларусі**

**Польскі інстытут у Мінску**

# Тадэвуш Касцюшка
## ў дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці

**Матэрыялы**
**Міжнароднай навуковай канферэнцыі**

**Мінск**
**ЭНЦЫКЛАПЕДЫКС**
**2018**

УДК 94(476)
ББК 63.3
Т13

*Рэцэнзенты:*

*доктар гістарычных навук, доктар архітэктуры, прафесар, акадэмік, А. І. Лакотка;*
*доктар філалагічных навук, прафесар І. В. Саверчанка*

**Т13** Тадэвуш Касцюшка ў дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці: матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 22 чэрвеня 2017 г.). – Мінск: УП “Энцыклапедыкс”, 2018. – 162 с., іл.

ISBN 978-985-7153-58-9

Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, праведзенай Цэнтрам даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ў рамках абвешчанага кіраўніцтвам Беларусі Года навукі, прадстаўляюць даклады беларускіх і польскіх даследчыкаў пра жыццё і дзейнасць Тадэвуша Касцюшкі, а таксама пра яго значэнне ў гісторыі і мастацтве. Выданне характарызуецца навізною навуковых даследаванняў і цікавымі, часам дыскусійнымі меркаваннямі.

**ISBN 978-985-7153-58-9**

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3**

## ЗМЕСТ

Прывітальнае слова дырэктара Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, акадэміка Лакоткі А.І. 5

**Жыццё, дзейнасць, эпоха Андрэя Тадэвуша Банавентуры Касцюшкі ў гістарычнай перспектыве**

*Бензярук А. Р.*
Калі нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка: спрэчка, якая цягнецца 200 гадоў 10

*Kostecki W.*
*Religia i humanizm społeczny Tadeusza Kościuszki* 17

*Аніпяркоў В. В.*
Няўдалая спроба пераводу Тадэвуша Касцюшкі ў войска Вялікага Княства Літоўскага і яе адлюстраванне ў соймікавых інструкцыях за 1788 і 1790 гады 21

*Радзюк А. Р.*
Рэпрэсіўная палітыка царызму супраць удзельнікаў паўстання 1794 года 30

*Гладышчук А. А.*
Касцюшкаўскае паўстанне 1794 года вачыма Юльяна Урсын Нямцэвіча 48

*Мельнікаў І. В.*
Караль Мараўскі: забыты генерал гістарычнай Літвы 54

*Трафімчык А. В.*
Тадэвуш Касцюшка: беларускі фокус 57

**Тадэвуш Касцюшка ў гісторыі і мастацтве**

*Гарбачова В. В.*
Рэцэпцыя вобраза Тадэвуша Касцюшкі ў Беларусі ў XVIII – пачатку XXI ст. 68

*Ordon L.*
Polemiki wokół Tadeusza Kościuszki 79

*Skoczek T.*
Insurekcja Kościuszkowska w sztuce i w legendzie 87

*Крывуць В. І.*
Постаць Тадэвуша Касцюшкі ў афіцыйнай выхаваўчай палітыцы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд 99

*Несцярчук Л. М.*
Ушанаванне імя Тадэвуша Касцюшкі ў Беларусі 106

*Бахановіч Н. Л.*
Касцюшкаўскія часы як лейтматыў аповесці "Полацкая шляхта" Войслава Савіча-Заблоцкага 110

*Горбушина И. Л.*
Костюшко и музыка 120

*Костюкович М. Г.*
Эпоха Тадеуша Костюшки в кинематографическом воплощении 125

*Ефіменка С. А.*
Вобраз Тадэвуша Касцюшкі ў культурным кантэксце дзіцячай бібіліятэкі 131

*Сосна У. А.*
Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі ў выкладанні гісторыі Беларусі 134

*Трафімчык А. В.*
Тадэвуш Касцюшка ў памяці беларускага народа 146

**Шаноўныя ўдзельнікі форуму, паважаныя госці і калегі!**

Вітаю вас на Міжнароднай навуковай канферэнцыі *«Тадэвуш Касцюшка ў дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці»*, якая праводзіцца ў рамках абвешчанага кіраўніцтвам нашай дзяржавы Года навукі. Гэтай падзеі спрыяе і міжнародны кантэкст: 2017-ы ЮНЕСКА аб'явіла годам Касцюшкі.

Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры з радасцю сустракае калег, аднадумцаў, сяброў з розных куткоў Беларусі і з суседняй Польшчы. Вялікі дзякуй шаноўным супрацоўнікам Польскага інстытута ў Мінску, якія прынялі дзейсны ўдзел у арганізацыі канферэнцыі.

Сёння нас тут сабрала сусветнавядомае імя. Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка – ураджэнец Вялікага Княства Літоўскага, палітычны і ваенны дзеяч Рэчы Паспалітай і ЗША, кіраўнік паўстання 1794 г. Тадэвуш Касцюшка – адна з найбольш яркіх асобаў не толькі айчыннай, але і сусветнай гісторыі. Яго жыццё і дзейнасць цесна звязаны з эпохай канца XVIII ст., з глыбіннымі гістарычнымі працэсамі, што адбываліся ў той час у Рэчы Паспалітай, па ўсёй Еўропе і Амерыцы. Тадэвуш Касцюшка актыўна змагаўся за роўнасць людзей і дэмакратыю ва ўсім свеце. Ён зрабіў уклад у развіццё маральна-прававой думкі.

З улікам таго, што гэты дзеяч належыць гісторыі некалькіх краін – Польшчы, Літвы, Беларусі, ЗША, Францыі – ён шырока ўганараваны па ўсім свеце. Дастаткова сказаць, што імя славутасці носіць найвышэйшая кропка далёкай Аўстраліі.

Доўгі час з вядомых прычын у Беларусі Т. Касцюшку не вызнавалі ў якасці яскравай постаці айчыннай гісторыі. Але ўсё вяртаецца на кругі свае. За апошнія пару дзясяткаў гадоў імя героя значна пашырыла сваю прысутнасць у сацыяльным кантэксце, а значыць – і ў памяці народа. Чаго варта толькі аднаўленне родавай сядзібы Касцюшкаў?! Сёння гэта – адна з прыцягальнейшых турыстычных кропак у Беларусі.

Канечне, перыяд, калі жыў Касцюшка быў надзвычай складаным. Таму і яго дзейнасць нават з адлегласці часу не можа разглядацца спрошчана. Аднак тым самым ствараецца надзвычай багатая глеба для навуковых даследаванняў, разнастайных інтэрпрэтацый, а таксама дыскусій, бо толькі дзякуючы ім нараджаецца ісціна.

Штогод мы праводзім навуковыя мерапрыемствы featured рознага масштабу і профілю, і павінен сказаць, што канферэнцыі, круглыя сталы, семінары, прысвечаныя выбітным дзеячам культуры і навукі, заўсёды склікаюць не проста даследчыкаў пэўнай тэмы і праблемы, а людзей, шчыра і самааддана захопленых асобай, якая выклікала іх навуковы інтарэс, яе творчасцю і эпохай, з ёю звязанай.

На сённяшні форум, як сведчыць праграма, з'ехаліся спецыялісты самых розных кірункаў: гісторыкі, культуролагі, мастацтвазнаўцы, літаратуразнаўцы, краязнаўцы... Кожны глядзіць на Касцюшку і яго спадчыну са сваёй званіцы. Такая шматгранная прысутнасць героя, кажучы словамі з назвы канферэнцыі, у дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці.

Мерапрыемства, якое сёння сабрала ўсіх нас, будзе годнай данінай ушанавання імя Касцюшкі, яго велічы.

Няхай наша канферэнцыя прынясе вам, калегі, цікавую і плённую дыскусію, новыя адкрыцці і дасягненні і пашырэнне навуковых сувязей. Шчасця і поспехаў вам!

***Аляксандр Іванавіч Лакотка****, дырэктар Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, акадэмік*

# ЖЫЦЦЁ, ДЗЕЙНАСЦЬ, ЭПОХА АНДРЭЯ ТАДЭВУША БАНАВЕНТУРЫ КАСЦЮШКІ Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПЕРСПЕКТЫВЕ

*Бензярук А. Р. (Жабінка)*

## КАЛІ НАРАДЗІЎСЯ ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА: СПРЭЧКА, ЯКАЯ ЦЯГНЕЦЦА 200 ГАДОЎ

### ПЕРШЫ РАДОК БІЯГРАФІІ

2017 год, абвешчаны годам памяці Тадэвуша Касцюшкі, паспрыяў цікавасці да ягонай асобы, найперш у краінах, дзе Герой Двух Кантынентаў і Найчысцейшы Сын Свабоды, як звалі Касцюшку ўжо сучаснікі, лічыцца нацыянальным героем. Адначасова даследчыкі звяртаюцца да момантаў Касцюшкавай біяграфіі, што здаўна выклікаюць спрэчкі не толькі ў навуковых, але й у грамадскіх колах. Адна з такіх тэм, што і сёння застаецца дыскусійнай, тычыцца часу нараджэння героя. Калі дакладна вядомы час скону Тадэвуша Касцюшкі, які памёр у Швейцарыі 15 кастрычніка 1817 г., дык час ягонага нараджэння дасюль застаецца невядомым, хоць большасць мяркуюць, быццам будучы генерал прыйшоў на свет 4 лютага 1746 г. Але ж наколькі справядліва лічыць згаданую дату, што нярэдка ставіцца на першы радок біяграфіі Касцюшкі, гістарычна і дакументальна абгрунтаванай?

Шырока вядомая праца Тадэвуша Корзана “Касцюшка, біяграфія складзеная паводле дакументаў”, выдадзеная ўпершыню ў 1894 г., у сучаснасці нярэдка выступае ў ролі нейкай “святой каровы”, абсалютна аўтарытэтнай і бездакорнай. Аднак не трэба думаць, што ўсе высновы вучонага былі прынятыя цалкам і назаўжды навуковым светам. Нягледзячы на архаічнасць працы Корзана і значную колькасць выяўленых на яе старонках памылак і недакладнасцей [19; 20], нават сёння манаграфія застаецца адной з найбольш вядомых біяграфій Тадэвуша Касцюшкі. Таму можна толькі ўявіць, які сапраўдны фурор яна выклікала ў час свайго з’ўлення. Аднак ужо тады чуліся галасы крытыкаў, якія зычылі аўтару працягваць росшукі дзеля ўдакладнення інфармацыі, якая спатрэбіцца пры перавыданні кнігі.

Папракаючы сваіх апанентаў у вылучэнні версій, не падмацаваных дакументальна, сам Тадэвуш Корзан патрапіў пад агонь аналагічнай крытыкі. Найбольш нараканняў выклікалі тыя фрагменты біяграфіі героя, якія даследчык не мог пацвердзіць дакументальна, у

прыватнасці – часы дзяцінства. Гіпотэзы і дапушчэнні Т. Корзана задавальнялі далёка не ўсіх. З аднаго боку, яго хвалілі за выкананую карпатлівую і вельмі патрэбную працу, з другога – заўважалася: *"Тое, што ў такой велізарнай працы, з такой колькасцю матэрыялаў можна знайсці недахопы і памылкі – гэта разумее кожны, гэтага, дарэчы, і сам Аўтар не адмаўляе"*. Да такіх памылак адносіліся, між іншым, высновы даследчыка *"пра месца, год і дзень нараджэння Тадэвуша Касцюшкі, якія шаноўны Аўтар, з-за адсутнасці іншых крыніц, узяў з вядомай і небясспрэчнай метрыкі хрышчэння* (складзенай толькі ў 1834 г., альбо праз 17 гадоў пасля смерці Касцюшкі. – *А. Б.*)*"* [21, s. 269-270].

## ПРЫНЯТАЯ ДАТА

У 1996 г. у свеце шырока святкаваліся 250-я ўгодкі Касцюшкавых народзінаў. Да юбілею ў Варшаве выйшаў чарговы нумар альманаха "Незалежнасць і памяць", які адкрываўся змястоўным артыкулам Леанарда Ратайчыка "Каляндар жыцця і дзейнасці Тадэвуша Касцюшкі". У артыкуле падрабязна расказваецца пра ўсе значныя моманты жыцця генерала. Зразумела, першая дата "Календара" датычылася нараджэння героя. І тут даследчык робіцца вельмі асцярожным, калі занатоўвае: *"4 лютага 1746 г. –* ***прынятая*** (выдзелена намі. – *А. Б.*) *дата нараджэння Тадэвуша Касцюшкі"*. Іншы вядомы Касцюшкаў біёграф Хенрык Масціцкі выказваўся яшчэ больш катэгарычна, называючы дату 4 лютага *"выдуманай"* [23, s. 9], паколькі яна *"нарадзілася"* толькі ў 1894 г. і з лёгкай рукі Корзана зрабілася традыцыйнаю. За аснову была ўзята метрычная выпіска пад № 478 з Косаўскай касцёльнай кнігі. Згаданая ў ёй дата – 12 лютага 1746 г. – часам памылкова прымалася за дзень нараджэння, хоць са зместу безумоўна вынікала, што ў гэты дзень адбыўся менавіта акт хрышчэння.

Рыхтуючы біяграфію генерала, Корзан паклапаціўся пра высвятленне даты нараджэння свайго героя. Для гэтага ўзяў за аснову метрыку і выказаў меркаванне, што дзіцяці далі імя ў гонар святога Андрэя, у дзень якога той быццам нарадзіўся. Найбліжэйшы дзень святога з такім імем у каталіцкіх святках прыпадаў на 4 лютага і быў днём ушанавання фезулянскага епіскапа Андрэя Карсіні. Таму гісторык зрабіў выснову, што Тадэвуш Касцюшка з'яўлення на свет менавіта ў гэты дзень. Цяпер патрабавалася вызначыць год нараджэння. Корзан звярнуў увагу на рэестр Варшаўскага кадэцкага корпуса ад 18 снежня 1765 г., дзе век маладога Касцюшкі вызначаны

18-цю гадамі. На думку даследчыка, *"гэта дастатковы доказ"*, каб лічыць годам нараджэння 1746-ы. Так "у кабінетнай цішы" нарадзілася дата 4 лютага 1746 г., якая на даўгі час замацавалася як традыцыйная і дасюль перацякае з выдання ў выданне, згадваецца ў шматлікіх публікацыях у прэсе і "сусветнай павуціне".

## ПАДЛІКІ КОРЗАНА

Аднак ці былі хібы ў гэтай версіі? На некаторыя несупадзенні звярталі ўвагу яшчэ сучаснікі Тадэвуша Корзана. Калі даследчык прывёў у абарону сваёй версіі згаданы рэестр, ён міжволі сам сабе запярэчыў, паколькі выкарыстаная ім крыніца перасоўвала дату нараджэння Тадэвуша Касцюшкі на 1747 г. Калі герой нарадзіўся 4 лютага 1746 г., то 18 снежня 1765 г. – у дзень ягонага з'яўлення ў сценах Кадэцкага корпуса – яму *было ўжо не 18 гадоў, а амаль 20! А дакладней – 19 гадоў 10 месяцаў і 14 дзён.*

Гіпотэзу Корзана спрабаваў падмацаваць У.А. Дзванкоўскі, які заўважыў: у актах Кадэцкага корпуса ёсць не адзін, а два рэестры. З іх першы, складзены напрыканцы 1765 г., акрэсліваў узрост юнага кадэта ў 18 гадоў, а другі (ад 5 мая 1768 г.) – у 23 гады. Згаджаючыся з прапанаванай Т. Корзанам датай нараджэння, У.А. Дзванкоўскі, разам з тым, сцвярджаў, што час з'яўлення на свет Касцюшкі з аднолькавай доляю верагоднасці *мог прыпадаць і на 1746, і на 1745, і, нават, на 1744 гг.,* пры гэтым нагадваў, што раней *"неаднойчы дзяцей хрысцілі праз год, два, а часам і праз сем пасля нараджэння"* [18, s. 23].

З гэтай нагоды не лішне згадаць: у самой сям'і Людвіка і Тэклі Касцюшкаў быў выпадак, калі дзіця, народжанае ў адным годзе, ахрышчана было ўжо ў наступным. Маецца на ўвазе Юзаф, старэйшы брат Тадэвуша Касцюшкі. Ксёндз Дамінік Кавецкі пахрысціў Юзафа ў 1744 г., прычым у метрыцы недвухсэнсоўна пазначалася: *"infans pertinet ad annum 1743"* ("дзіця народжанае ў 1743 г.").

## ЛІСТОК З ГРАБА ЯК "АРГУМЕНТ"

1 красавіка 1894 г. у Кракаўскім нацянальным музеі была арганізавана вялікая "Касцюшкаўская выстава". Сярод яе шматлікіх экспанатаў вылучым адзін, некалі перададзены з Навагрудка Людвікам Бернатовічам да збору Акадэміі мастацтваў. У каталогу выставы гэтая "рэліквія" была пазначана пад № 55 як *"лісток з грабавага дрэва, пасаджанага ў садзе Мерачоўшчынскай сядзібы ў дзень нараджэння Тадэвуша Касцюшкі ягоным бацькам"* [21, s. 252, 270].

Калі прыняць на веру, што Людвік Касцюшка-Сяхновіцкі на самой справе ў дзень з'яўлення на свет свайго малодшага сына пасадзіў у Мерачоўшчыне згаданае дрэва, то гэтае дапушчэнне павінна было абвергнуць версію Т. Корзана. *Цяжка ўявіць, што бацька зрабіў гэта 4 лютага 1746 г.* Але, можа, кліматычныя ўмовы на тэрыторыі Беларусі ў той час былі больш спрыяльнымі і мяккімі, чым сёння, і дазвалялі займацца пасадкаю дрэў нават у лютым? Гэтаму супярэчаць навуковыя назіранні за станам клімату, якія праводзяцца ўжо не адно стагоддзе. Вучоныя геафізікі і біёлагі сцвярджаюць: *"Жорсткія зімы ў XVIII ст. не рэдкасць. Увогуле на долю Расіі і Заходняй Еўропы іх прыходзіцца каля 40"*. Прычым, асабліва марозныя і доўгія зімы назіраліся менавіта паміж 1740 і 1746 гадамі [3, с. 196, 199, 360-361]. Безумоўна, "лісток з дрэва Касцюшкі" быў звычайнай містыфікацыяй.

Акрамя таго, у версіі Т. Корзана было яшчэ адно слабое звяно. Паколькі ў каталіцкіх і праваслаўных святцах агулам набіраецца ажно *24 даты*, прысвечаныя розным святым, якія насілі імя Андрэй [2, с. 737]. Кожны з іх, калі існі следам за разважаннямі Т. Корзана, тэарэтычна можа быць "сапраўдным" днём нараджэння Тадэвуша Касцюшкі.

**ВЕРСІЯ ЯЗЭПА ЮХО**

Таму не дзіўна, што ў 1990 г. у сваёй першай беларускамоўнай біяграфіі Т. Касцюшкі Я.А Юхо зазначыў: *"Дакладная дата яго нараджэння невядома, выказана меркаванне, што ён нарадзіўся 4 лютага 1746 года, аднак больш праўдападобным* (?) *трэба лічыць, што нарадзіўся ён 30 лістапада 1745 года... Ёсць падстава меркаваць, што спачатку яго хрысцілі ў праваслаўнай* (?) *царкве і назвалі Андрэем у гонар Андрэя Першазванага, свята якога прыпадае на 30 лістапада"*. (У другім выданні кнігі Я.А. Юхо часткова паправіўся, замяніўшы згадку пра "праваслаўную" царкву на ўніяцкую). Сваю версію вучоны паўтарыў ў даведніку "Мысліцелі і асветнікі Беларусі" і ў артыкуле "Наш нацыянальны герой", што быў надрукаваны ў зборніку з вельмі выразнай назваю "Сыны і пасынкі Беларусі" [16, с. 7; 9, с. 226; 11, с. 95].

Як бачым, *спрачаючыся з Т. Корзанам, Я.А. Юхо пайшоў аналагічным шляхам:* выбраў з шырока спісу "Андрэевых" дзён найбольш на ягоны густ прывабны ("праўдападобны") і зрабіў яго днём нараджэння Т. Касцюшкі.

Здаецца, гісторыя паўтараецца, і дата 30 лістапада 1745 г., дзякуючы аўтарытэту вядомага навукоўца, робіцца традыцыйнай ў

беларускай гістарыяраграфіі, знаходзіць сваіх прыхільнікаў. Прыкладам, адзін з іх – Міхал Талочка выказаўся аднасэнсоўна: *"На думку некаторых даследчыкаў, а таксама і аўтара гэтых радкоў, Тадэвуш Касцюшка нарадзіўся 30 лістапада 1745 года. Распаўсюджанае меркаванне пра іншую дату зыходзіць з таго, што захавалася метрыка, паводле якой Касцюшку хрысцілі 12 лютага 1746 года ў Косаўскім касцёле. Значыцца, сцвярджаюць паслядоўнікі польскага гісторыка Т. Корзана, які першым вылучыў гэтую тэорыю, нарадзіўся Касцюшка 4 лютага"* [5, с. 11; 14, с. 402; 12].

Але такі шлях непазбежна выкліча з'яўлення новых версій. Бо калі абапірацца толькі на спіс "Андрэевых" дзён, любы даследчык можа прапаноўваць сваю арыгінальную версію.

**КАСЦЮШКА-ІМЯНІННІК**

Значна больш аргументаў можна прывесці на карысць іншага дня – 28 кастрычніка 1745 г. Вядома, што самым распаўсюджаным сярод імёнаў Касцюшкі, пад якім ён вядомы ўсяму свету, з'яўляецца імя Тадэвуш. Прычым, ён і сам лічыў гэтае імя галоўным: ім карыстаўся ў прыватным ліставанні і падпісваючы афіцыйныя дзяржаўныя паперы. І ў афіцыйным справаводстве Берасцейскага ваяводства яго называлі імем Тадэвуш, якое спалучалі з родавым прозвішчам Касцюшка-Сяхновіцкі [24, с. 190, 206; 1, с. 191].

Т. Касцюшка ніколі не браў шлюбу і не меў афіцыйных уласных дзяцей. Але двойчы ў жыцці ён згаджаўся на ролю хроснага бацькі.

У 1800 г. у Парыжы генерал ахрысціў дачку швейцарскага пасла ў Францыі Франца Пятра Ёзафа Цэлтнера. Дзяўчынцы надалі імя Тадэі-Эміліі. Першае з гэтых імён было у гонар Касцюшкі. А яшчэ праз некалькі гадоў амерыканскі пасол у Парыжы Джон Армстронг запрасіў Т. Касцюшку быць хросным бацькам свайго сына. Хлопчык таксама атрымаў імя свайго знакамітага "другога бацькі" і стаў Тадзіусам Касцюшкам Армстронгам [24, с. 335; 22, с. 26].

Дадамо, што *ў каталіцкіх святцах дзень святога Тадэвуша адзначаецца толькі аднойчы* – і гэта адбываецца 28 кастрычніка. Менавіта гэты дзень Т. Касцюшка не аднойчы святкаваў як уласныя імяніны. Упершыню яны ладзіліся ў 1792 г. У той час генерал выйшаў у адстаўку з войска, бо быў нязгодны з палітыкай караля Станіслава Аўгуста, які пайшоў на хаўрус з імперыятрыцай Кацярынай II. Касцюшка пакінуў Варшаву і 28 кастрычніка прыбыў у Сянявы – уласнасць князёў Чартарыйскіх. Там гнанаму генералу і былі наладжаны ўрачыстыя імяніны. На Касцюшкаву галаву быў

ускладзены вянок, сплецены з галінак дубу, пасаджанага ў XVII ст. каралём Янам Сабескім пасля перамогі над туркамі пад Венаю. Пры гэтым у гонар імянінніка прагучаў верш *"Генералу Касцюшку ў дзень ягоных імянін у Сяняве"*.

Надалей такія мерапрыемствы сталіся традыцыйнымі і праводзіліся амаль штогод. Яны называліся "банкетамі братэрства" і заўсёды прымяркоўваліся да чарговых гадавін славутага военачальніка. Сюды запрошваліся слынныя прадстаўнікі эміграцыі, прыхільнікі рэспубліканскіх і дэмакратычных ідэй. Прыкладам, банкет, арганізаваны 28 кастрычніка 1801 г., наведалі генералы Лафайет, Макдоналд, Масена, Маро, Удзіно – кожнае з гэтых імёнаў складала вайсковую славу рэвалюцыйнай і напалеонаўскай Францыі [24, с. 161-`163, 338].

Сам Тадэвуш Касцюшка спачатку катэгарычна адмаўляўся ад такой ініцыятывы, аднак сябры пераканалі свайго былога кіраўніка. Яны лічылі, што імпрэзы 28 кастрычніка атрымоўваюць шырокі водгук і спрыяюць збіранню паспалітай эміграцыі вакол справы незалежнасці няшчаснай падзеленай Радзімы. Святкаванне 28 кастрычніка 1804 г. (на чале аргкамітэта чарговай Касцюшкавай гадавіны паўстаў генерал Ян Хенрык Дамброўскі) было наладжана з вялікім размахам, праходзіла ў рэстарацыі, дзе за бяседным сталом прамаўляліся шматлікія тосты ды здравіцы ў гонар галоўнага віноўніка ўрачыстасці [23, с. 40].

Гэтая традыцыя не перарывалася да самай смерці Героя Двух Кантынентаў. У Раперсвільскім музеі доўгі час захоўваўся пад шклом засушаны букецік кветак, падараваны Касцюшку дамамі Салюра у дзень імянін генерала. Падарунак суправаджаў сентыментальны надпіс: *"Мужнасць ды сціплая дабрачыннасць – ёсць кветкі ягонага жыцця. А гэтыя нашыя кветкі – толькі сэрцаў ласкавых дзеткі"* [21, с. 255].

## НЕКАЛЬКІ ТАДЭВУШАЎ

Калі перагледзець радаводы вядомых беларускіх магнацкіх і шляхецкіх сямей, можна зрабіць некалькі цікавых назіранняў. Па-першае, да пачатку XVIII ст. у спісах імёнаў, якія звычайна давалі сваім атожылкам бацькі, зусім не сустракаецца імя Тадэвуш. Яго нават нельга назваць *непапулярным*. Яго проста *няма*!

Затое ў першай палове XVIII ст. карціна мяняецца: імя яшчэ застаецца рэдкім, але ўжо як у сем'ях магнацкіх (Агінскіх, Радзівілаў, Хадкевічаў), так і ў сем'ях сярэдняй ды дробнай шляхты

(Александровічаў, Белазораў, Корсакаў, Нарбутаў, Рэйтанаў) з'яўляюцца дзеці, нарачоныя Тадэвушамі. Несумненнай папулярнасці гэтага імені на памежжы XVIII і XIX стст. паспрыяла дзейнасць Тадэвуша Касцюшкі. Цяпер ужо многія радзіны ахвотна пачалі называць сваіх сыноў *модным патрыятычным* імем.

На гэтым апошнім сцвярджэнні патрэбна затрымацца.

Не выклікае ніякага сумнення, што паплечнік Касцюшкі – знакаміты кампазітар Міхал Клеафас Агінскі свайго старэйшага сына назваў у 1798 г. Тадэвушам Антоніем, прыгадваючы баявога сябра. Яшчэ раней іншы ўдзельнік Касцюшкаўскага паўстання Бенядзікт Булгарын таксама даў імя сыну ў гонар Касцюшкі. Пазней той стаў вядомым расійскім літаратарам Фадзеем Булгарыным, але ў лістах, якія дасылаў беларускім знаёмым і родзічам, абавязкова падпісваўся менавіта як Тадэвуш [4, с. 161-162, 451, 456].

Імя прыжылося і ў самой сям'і Касцюшкаў-Сяхновіцкіх. Першым, хто ім карыстаўся, стаў бацька героя. Аднак, заўважым, адзіны дакумент, у якім Людвік Касцюшка-Сяхновіцкі названы Людвікам Тадэвушам – гэта тая самая *небездакорная* метрыка ягонага малодшага сына. Ва ўсіх іншых вядомых актах 1720–1750-х гг. старэйшы Касцюшка выступае толькі пад адным імем. Затое пазней імя Тадэвуш у сям'і стала нярэдкім: гэтак звалі пляменніка Т. Касцюшкі Тадэвуша Эстку (1770–1812), а таксама сына і ўнука Станіслава Касцюшкі, якія жылі ў XIX ст. [24, с. 27; 10, с. 132].

Была яшчэ адна надзвычай знакамітая – літаратурная – асоба, названая ў гонар Касцюшкі, – герой паэмы Адама Міцкевіча "Пан Тадэвуш" (1834). Пры знаёмстве з яе галоўным персанажам чытач даведваецца: *"Паніч быў імем цёзка слаўнаму Касцюшку: / Улетку ў тым жа самым годзе нарадзіўся, / Калі ішла вайна"* [8, с. 12]. Пад згаданай вайною мелася на ўвазе расійска-польская кампанія 1792 г., дзе Тадэвуш Касцюшка вызначыўся як самаахвярны патрыёт і здольны военачальнік. Менавіта з гэтага часу імя Касцюшкі набыло такую знакамітасць, што нават незаможныя шляхціцы пачалі сваім сынам даваць імя праслаўленага ў свеце генерала.

Існуе і яшчэ адно сведчанне на карысць 28 кастрычніка. У 1833 г. парыжскае выдавецтва выпусціла "Універсальную біяграфію" з артыкулам пра Касцюшку, які пачынаўся словамі: *"Касцюшка Тадэвуш нарадзіўся ў Літве ў шляхецкай сям'і 28 кастрычніка 1746* (sic!) *года..."* [17, с. 1588].

Нельга абмінуць увагаю і яшчэ адзін цікавы момант. Як вядома, сам гісторык Тадэвуш Корзан, які гэтак шмат паспрыяў стварэнню "маналітнай" Касцюшкавай традыцыі, нарадзіўся менавіта ў дзень святога Тадэвуша – 28 кастрычніка 1839 г. Дзіўна, што даследчык, які атрымаў сваё імя, паколькі з'явіўся ў дзень, прысвечаны святому Тадэвушу, нават не разглядаў такую самую магчымасць і для Т. Касцюшкі, усю сваю ўвагу звярнуўшы толькі на адно з трох імёнаў свайго героя – Андрэй.

**ІНТЭРПРЭТАЦЫІ НАШАЙ ВЕРСІІ**

Вылучаная намі ўпершыню яшчэ ў 1996 г. версія наконт даты 28 кастрычніка 1745 г. не прайшла незаўважанаю і патрапіла на старонкі інтэрнэта і нават увасобілася ў літаратурных творах.

Упершыню гэта адбылося яшчэ ў 2003 г., калі ў часопісе "Полымя" была надрукавана першая беларускамоўная аповесць, прысвечаная Тадэвушу Касцюшку, "Срэбны арол у чырвоным полі" (аўтар Ягор Конеў). На працягу ўсяго твора згадваецца пра нараджэнне героя менавіта 28 кастрычніка 1745 г. Аўтар нават укладвае ў вусны пана Тадэвуша тыраду, у якой паспрабаваў цудоўным чынам "аб'яднаць і прымірыць" усе існуючыя версіі:

*"– У 1745-м, 4 лютага, у дзень Святога Андрэя, біскупа фезулянскага, бацюхна даведаўся, што маці цяжарная. Ён папрасіў у нябёсаў сына і даў зарок назваць яго Андрэем. А ўлетку маці захварэла. 14 ліпеня, у дзень Святога Банавентуры, бацька маліўся, каб яна ачуняла, абяцаў даць сыну і другое імя. З Боскай ласкі матуля папpавілася і нарадзіла мяне 28 кастрычніка, у дзень Святога Тадэвуша"* [6, с. 23-24].

Факты і высновы, запазычаныя з нашых публікацый, часам перадаюцца вельмі своеасаблівым чынам. Найбольш паказальны прыклад – артыкул Іллі Куркова "Калыска героя": *"Сёння ў беларускай гістарыяграфіі найбольш распаўсюджаная, і нават прынятая афіцыйна, версія пра тое, што Тадэвуш Касцюшка нарадзіўся 4 лютага 1746 года. Гэта самы блізкі да дня яго хросту дзень святога Андрэя (якіх у календары вялікае мноства). Дзве іншыя гіпотэзы менш папулярныя. Прыхільнікі першай прапаноўваюць звярнуць увагу на адзіны ў каталіцкіх святцах дзень святога Тадэвуша, які прыпадае на 28 кастрычніка. "Разбежка" ў датах іх не бянтэжыць, поколькі ў тыя часы звычайнай была практыка, калі хрышчэнне праходзіла праз месяцы пасля нараджэння. Падобным чынам разважаюць прыхільнікі трэцяй тэорыі, называючы дату 13*

*ліпеня 1745 года. У гэты дзень і праваслаўныя, і каталікі святкавалі дзень святога Андрэя. Акрамя таго, менавіта 13 ліпеня праваслаўная царква адзначала дзень святога Фадзея (Тадэвуша). 14 ліпеня – каталіцкі дзень святога Банавентуры. Калі ўлічыць трайное імя героя, уражальнае супадзенне"* [7, с. 89-90].

## ВЫСНОВЫ

Пачатак XXI ст. адзначаецца ў Беларусі вялікай цікавасцю да сваёй няпростай і гераічнай гісторыі. З глыбінь мінулага вяртаюцца шматлікія асобы, якія некалі складалі славу гэтай зямлі, але потым былі незаслужана забытыя. Сярод лепшых сыноў краіны свае належнае месца пакрысе займае і асоба генерала Тадэвуша Касцюшкі. Асабліва шмат на шляху вяртання славы героя робіцца апошнім часам на ягонай гістарычнай радзіме – Берасцейшчыне, дзе па волі лёсу знаходзяцца і Сяхновічы, і Мерачоўшчына, паяднаныя спрэчкаю пра месца й час прыходу ў свет аднаго з найбольш таленавітых людзей свайго веку. Аднак, ці магчыма прыпыніць і прымірыць даўнюю зваду?

Для гэтага ўсім спрачальнікам патрэбна ўсвядоміць, што сёння *не існуе ўвогуле ні воднага дакумента, які называе дату нараджэння Тадэвуша Касцюшкі.* Таму найбольш аўтарытэтныя біёграфы генерала сыходзяцца ў адным: *дакладны дзень з'яўленне героя на свет невядомы* [24, с. 8].

Усе пералічаныя намі версіі, пачынаючы ад "корзанаўскай" і да найноўшых, вельмі прыблізныя. Яны, безумоўна, цікавыя, аднак застаюцца ўсё ж толькі дапушчэннямі. Зразумела, уласна мы схільны лічыць *найбольш праўдападобнаю* дату 28 кастрычніка 1745 г. Хоць, відавочна, і сам Тадэвуш Касцюшка не ведаў дакладны дзень свайго нараджэння, але пры жыцці схіляўся менавіта да дня святога Тадэвуша, які святкаваў неаднойчы ў шырокім коле сваякоў, сяброў і прыхільнікаў.

Літаратура:

1. *Акты, издаваемые Виленскою комиссиею* для разбора древних актов. – Вильна, 1867. – Т. 2.

2. *Бірыла М.В.* Алфавітны імяннік святых праваслаўнай і каталіцкай царквы, дзень памяці якіх звычайна лічыцца днём імянін асоб, што носяць гэтыя імёны // Родны край: Адрыўны каляндар на 1993 год. – Мінск., 1992.

3. *Борисенков Е.П., Пасецкий В.М.* Тысячелетняя летопись необычайных явлений природы. – М., 1988.

4. *Булгарын Ф.* Выбранае / Фадзей Булгарын; Уклад., прадм., камент. А. Фядуты. – Мінск, 2003.

5. *Казлоў Л.Р.* Картаграфія Беларусі пад час паўстання Тадэвуша Касцюшкі. – Мінск, 2004.

6. *Конеў Я.* Срэбны арол у чырвоным полі // Полымя. – 2003. – №. 10.

7. *Курков И.Н.* Брестчина: легенды, события, люди. – Мн., 2005.

8. *Міцкевіч А.* Пан Тадэвуш / Пер., камент. Я. Семяжона. – Мінск, 1985.

9. *Мысліцелі і асветнікі Беларусі:* Энцыкл. даведнік. – Мінск, 1995.

10. *Нарбут А.Н.* Генеалогия Белоруссии. – М., 1996. – Ч. 4.

11. *Сыны і пасынкі Беларусі* / Укл. С.В. Барыс. – Мінск, 1996.

12. *Талочка М.* Пан Тадэвуш // Літаратура і мастацтва. – 2002. – 29 ліст. – С. 4.

13. *Устин Ю.* Лабиринты свободы. – Минск, 2014.

14. *Федорук А.Т.* Старинные усадьбы Берестейшчины. – Мінск, 2004.

15. *Юхо Я., Емяльянчык У.* "Нарадзіўся я ліцьвінам..." – Мінск, 1994.

16. *Юхо Я.А.* За вольнасць нашу і вашу: Тадэвуш Касцюшка. – Мінск, 1990.

17. *Biographie universelle ou dictionnaire historique* en six volumes. – Paris, 1833. – V. 3

18. *Dzwonkowski W.A.* Młode lata Kościuszki // Biblioteka Warszawska. – 1911. – T. 4.

19. *K[orzon T].* Kościuszko. Biografia z dokumentów wysnuta [Wyd. 1]. – Kraków, Warszawa, 1894.

20. *Korzon T.* Kościuszko. Biografia z dokumentów wysnuta. Dopełnienia przy wydaniu drugiem. – Kraków, Warszawa, [1906].

21. *„Kościuszko. 1893-1896"* / Wydanie nowe uzupełnione pod red. T.B. Ostrębskiego. – Kraków, 1994.

22. *Kozłowski W.M.* Spadki po Kościuszce i jego testamenty. – Poznań, b.r.

23. *Ratajczyk L.* Kalendarium życia i działalności Tadeusza Kościuszki // Niepodległość i pamęć. – Warszawa, 1996.

24. *Szyndler B.* Tadeusz Kościuszko. 1746–1817. – Warszawa, 1991.

*Kostecki Włodzimierz (Sobolew)*

# RELIGIA I HUMANIZM SPOŁECZNY TADEUSZA KOŚCIUSZKI

Thomas Jefferson, amerykański mąż stanu, prezydent i autor Deklaracji Niepodległości, tak pisał do Tadeusza Kościuszki: „Twoje zasady i dążenia są takie, że trzeba je czcić, szanować i kochać. Wierne jednemu celowi: wolności i uszczęśliwieniu człowieka".

Dzisiaj, w 200 lat od śmierci naszego bohatera, mamy wszyscy świadomość, że Tadeusz Kościuszko jest wśród znanych i popularnych postaci historycznych XVIII wieku wybitną indywidualnością. Świadczy o tym nie tylko historia Polski, ale i dzieje powszechne. Świadczy o tym także, i to wymownie, ogromna ilość prac naukowych poświęconych jego działalności. Świadczy o tym wreszcie i legenda, która zrodziła się jeszcze za jego życia, a literatura i sztuka, nie tylko rodzima, wzniosły mu pomnik po śmierci.

Życie i czyny Tadeusza Kościuszki potwierdzają jego głębokie zaangażowanie się w realizację demokratycznych ideałów wieku Oświecenia. Troska o lud, jego kształcenie i podnoszenie świadomości obywatelskiej – to problemy, które miały wpływ na przesłanie humanistyczne Kościuszki. Generalny cel, to jest walka o dobro i szczęście człowieka, realizował w Polsce i w Ameryce, we Francji i w Szwajcarii, gdziekolwiek się znalazł, w każdej szerokości geograficznej.

Zasadne będzie chyba stwierdzenie, iż do postaci Kościuszki, do jego myśli, do jego aktywnego działania powinno się sięgać nie tylko z okazji jego wielkich rocznic. W tym roku mija 200 lat od jego śmierci, a jego myśli, jego poczynania nie tracą na aktualności.

Podnosząc z tej racji modne dziś słowo „Europejczyk" powiedzieć trzeba, iż to właśnie przywódca powstania 1794 r. jako Polak, jako obywatel, poza Polską, Stanami Zjednoczonymi, Francją i Szwajcarią ma chyba szczególne prawo do tego tytułu, tytułu „Europejczyka".

Analizując umysłowość naszego bohatera i umysłowość epoki ówczesnej, możemy wysnuć wniosek, że są one paralelne i wzajemnie się współtworzące. Istotne fakty jego życia są faktami świata i odwrotnie. Chronologicznie jego światopogląd i osobowość warunkowane są przede wszystkim przez: tradycje rodzinne, idee szkolnictwa pijarów, atmosferę Szkoły Rycerskiej, idee epoki Encyklopedystów, udział w rewolucji amerykańskiej i wpływ rewolucji francuskiej.

Omawiając tradycje rodzinne Kościuszki warto przytoczyć mały fragment jego pism: „Zasady przyzwoitości wpojone mi w młodym wieku, tak silnie kierują moim postępowaniem, że poczynania które zmuszają

mnie do działania wbrew mojemu przekonaniu, czynią mnie nieszczęśliwym".

Z domu rodzinnego wyniósł Kościuszko zasadę życzliwości i sprawiedliwości. I nie tylko. Jak pisał w 1894 r. prof. Tadeusz Korzon, najwybitniejszy dotąd kościuszkolog: „Ze wszystkich znanych mi pism Kościuszki wnioskować mogę, że czcił Boga, nazywając Go zwykle Istnością Najwyższą Przedwieczną, Opatrznością zawsze nam dobroczynną, lecz praktyk religijnych kościoła może nie wykonywał".

Z domu rodzinnego wyniósł także pojęcie sprawiedliwości społecznej, ale i zaczyn miłości ojczyzny, nowoczesnego już pojęcia patriotyzmu.

Podczas ponad 4-letniego pobytu w kolegium pijarskim w Lubieszowie rozwijał swoją osobowość w duchu obywatelskim, wprowadzonym przez reformy księdza Stanisława Konarskiego. Wyniesione ze szkoły pijarskiej ideały bohaterów, oświeceniowa filozofia pijarska kształtowały w Kościuszce kult wolności, wyzwalały krytykę instytucji kościelnych i duchowieństwa, ale także nowoczesne rozumienie narodu.

Z 4-letniej edukacji w Szkole Rycerskiej, z panującej tam atmosfery patriotyzmu i nowoczesności, wyniósł Kościuszko umiłowanie porządku i wolności, zdecydowaną niechęć do przesądów, przychylność i wyrozumiałość dla wszystkich, bez różnicy, ludzi.

Dalsze studia odbywał we Francji, żyjącej wówczas w wielkiej epoce Encyklopedystów. Duży wpływ wywarły na nim poglądy liberalizmu gospodarczego, głoszące ekonomiczne i polityczne wyzwolenie chłopa. Dlatego w Paryżu, równolegle ze sztukami pięknymi i inżynierią, studiował więc filozofię i problematykę społeczną francuskich fizjokratów. Zdobyta wiedza rodziła w nim wolę całkowitego wyzwolenia duchowego, rodziła reakcję przeciwko dawnej władzy.

Paryż to znaczący etap w formowaniu i radykalizowaniu się umysłowości młodego Kościuszki. Najbardziej z francuskich myślicieli cenił J. J. Rousseau, a z jego dziełami nie rozstawał się do końca życia.

Jadąc za ocean Kościuszko był świadomy, że tam właśnie urzeczywistniano ideały wolności i równości, w Europie dopiero postulowane. W Ameryce przyszły Naczelnik Polaków umocnił w sobie zasady tolerancji i sprawiedliwości społecznej. Umocniła się jeszcze jego wiara w oświeceniową wielkość rozumu, w siłę społeczeństwa, które zrzuciło z siebie królewską tyranię i rozpoczęło samodzielne życie.

Można powiedzieć zasadnie, iż owe doświadczenia rewolucji amerykańskiej legły twórczo u podstaw ideowych założeń polskiego roku 1794.

Można stwierdzić bardzo ogólnie, iż Rewolucja Francuska utrwaliła już tylko lub też pomogła zweryfikować republikańskie i demokratyczne przekonania Kościuszki.

Kościuszko, potępiając politykę wojen religijnych w Europie, podkreśla wyraźnie, że „przeciw Polsce wojny religii podnieść nie można". Wyznając ideę równouprawnienia wyznań bez nacjonalizmu poucza: „Wytykajmy nasze błędy, ale umiejmy szanować i oddać sprawiedliwość, gdy na nią zasługujemy". Podkreślamy, iż hasło równouprawnienia wyznań jedno z naczelnych haseł wieku – nie było dla naszego bohatera jedynie zawołaniem retorycznym, lecz także praktyczno-politycznym.

W rozporządzeniach Kościuszki wszystkie religie traktowane były jednakowo, miały zagwarantowaną „opiekę rządową, prawną i obywatelską". Polityce wyznaniowej przywódca Insurekcji sporo uwagi poświęcił podczas rozmowy z biskupem unickim Porfiriuszem Ważyńskim: „Wzywam Ciebie, biskupie – mówił Kościuszko – abyś na miłość ludu, cel nasz tłumaczył tak, aby każdy człowiek pojął, że wojna teraźniejsza zaczęta jest o dobro, o interes, o szczęśliwość każdego, że chcemy, aby nikt nikogo ciemiężyć nie mógł. Biskupie, Twój charakter daje Ci przystęp do serca ludu, ucz go nienawidzić tyranów".

W czasie Insurekcji 1794 r. był zwolennikiem aktywizacji duchowieństwa w dziedzinie propagandy powstańczej, ale także przejęcia części zasobów kościoła z przeznaczeniem na cele powstania.

Również w trakcie Insurekcji brał w obronę mniej liczne wyznania. Tak to na jego polecenie zostaje przywrócona hierarchia i administracja kościoła grecko-orientalnego ludności nieunickiej, a majątek cerkiewny nie podlegał sekwestrowi. Na uwagę w tym względzie zasługuje odezwa (15 V 1794) Kościuszki „Do obywateli brzeskich i kobryńskich", wskazująca zasadę, na której winien być oparty stosunek z miejscowym społeczeństwem. Komisja Porządkowa tamtego regionu, powołała do swego grona osiem osób wyznania prawosławnego i fakt ten spowodował wielkie zadowolenie Kościuszki, że pisał we wspomnianej odezwie: „Wybór od Was uczyniony okazuje się jak z duchem obywatelstwa zdrową politykę łączyć umiecie... Zapoznajcie wszystkich grecko-orientalnych imieniem moim, że wszelkie swobody, którymi wolność dozwala cieszyć się ludziom, będą mieć wspólnie z nami".

Tradycyjna polska tolerancja w oświeceniowej armii insurekcyjnej znajdowała pełne zastosowanie. W wojsku przywrócono, usuniętych w 1793 r., kapelanów wojskowych i spośród niższego duchowieństwa zakonnego powołano kapelanów czasowych (obozowych); niezależnie od

działalności duszpasterskiej mieli oni uświadamiać patriotycznie chłopów-żołnierzy. Kościuszko w „Przepisie dla kapelanów obozowych" z 30 VIII 1794 r. zalecał traktować powstańców jako obywateli i obrońców ojczyzny. „We wszystkich naukach – podkreślał w końcowym akapicie „Przepisu..." - niech będą żołnierze oświeceni, że w oczach Boga i świata, w duchu religii i obywatelstwa, najznakomitszą jest zasługą bić się za ojczyznę, bronić jej i życie nieść dla jej dobra".

Idea tolerancji i równouprawnienia kultów religijnych stanowiła podstawę wydanej 7 X 1794 pod Połańcem odezwy „Do duchowieństwa polskiego, grecko-orientalnego, nieunickiego tak zakonnego, jak i świeckiego". W odezwie tej pisał m.in.: „Tak jest kapłani! Jesteście z całym ludem niewolnikami moskiewskimi, z nami będziecie kapłanami szanowanymi, wasz obrządek, własność wasza w tej samej u nas są cenie, w jakiej naszych własnych kapłanów. Nie trwóżcie się, aby różnice opinii i obrządku przeszkadzała nam kochać was jak braci i współrodaków i owszem, główną sobie przypisujemy powinność, dać wam czuć różnicę panowania twardego i niesprawiedliwego, pod którym jesteśmy, z panowaniem prawa wolności do których was wzywamy. Bóg upokorzy zuchwalstwo tych, którzy dla swojej dumy i ambicji zapominają o języku i nędzy, o niewoli ludu nieszczęśliwego".

Kościuszko głosił wszem i wobec, że „nie masz takiej wiary, która by człowiekowi być wolnym zabraniała". Jego troska o warstwy biedniejsze obejmowała ogół mieszkańców kraju, bez względu na stan i wyznanie. Kościuszko walczył więc w imię wielkich ogólnoludzkich ideałów swobody i równości, które kazały mu uważać za braci wszystkich ludzi, a więc równie dobrze innowierców polskich, jak moskiewskich żołnierzy. Naczelnik pozostawił więc wszystkim religiom swobodę wyznania swoich kultów pod jednym wszakże warunkiem „aby tylko posłuszne były prawom ustanowionym przez Naród".

Literatura:

1. Korzon T. Tadeusz Kościuszko – biografia z dokumentów wysnuta, Kraków: Nakł. Muzeum Narodowego w Rapperswylu, 1894.
2. Pisma T. Kościuszki / opr. H. Mościcki. Warszawa, 1947.
3. Pawlikowski J. Czy Polacy mogą się wybić na niepodległość / wyd. II. Warszawa, reedycja: Warszawa MCMLXVII, 1831.

*Аніпяркоў В. В. (Мінск)*

# НЯЎДАЛАЯ СПРОБА ПЕРАВОДУ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ Ў ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА І ЯЕ АДЛЮСТРАВАННЕ Ў СОЙМІКАВЫХ ІНСТРУКЦЫЯХ ЗА 1788 і 1790 ГАДЫ[1]

У 1784 г. генерал амерыканскіх войск Тадэвуш Касцюшка вярнуўся на Радзіму. Адукацыя[2], вядомасць і выбітны досвед, атрыманыя Касцюшкам на вайне за незалежнасць Злучаных Штатаў Амерыкі, не дапамаглі яму ўладкавацца ў мясцовае войска, колькасць якога ў тыя часы было моцна абмежавана: да 14 тысяч – у Польскай Кароне і 4,8 тысяч – у Вялікім Княстве Літоўскім [1, s. 207].

Вайсковай кар'еры Касцюшкі дадаткова заміналі яго даўнія сувязі з Пулавамі (акурат у тыя часы Адам Казімір Чартарыскі абвастрыў адносіны са Станіславам Аўгустам з-за т. зв. аферы Дагрумовай) [2, s. 37–66]. Таксама сказваўся недахоп сродкаў: нешматлікія афіцэрскія – у тым ліку генеральскія – рангі ў войску маглі афіцыйна выкупацца ў іх даўніх уладальнікаў, аднак Касцюшку на гэта банальна не ставала грошай. У выніку, не знайшоўшы прымянення сваім вайсковым талентам, ён асеў у родных Сяхновічах, часова ператварыўшыся ў звычайнага земляўласніка.

Перспектывы ўзнаўлення вайсковай кар'еры для Т. Касцюшкі адкрыліся напярэдадні і пасля пачатку дзейнасці ў Варшаве Чатырохгадовага (1788–1792) сойма. 22 кастрычніка 1788 г. на сойме была прынятая пастанова аб агульным павелічэнні войск Кароны і Вялікага Княства да 100 тысяч чалавек, а 8 кастрычніка 1789 г. паслы зацвердзілі прапанаваны Вайсковай камісіяй Абодвух Народаў новы штат вайскоўцаў, які прадугледжваў у тым ліку з'яўленне дадатковых генеральскіх вакансій [3, s. 52, 112–132]. Сярод іншых, іх маглі атрымаць тыя мясцовыя ўраджэнцы, якія дагэтуль служылі ў войсках іншых краін, з магчымасцю захавання за імі здабытых за мяжой рангаў [3, s. 159].

Нягледзячы на тое, што дзейнасць сойма ў цэлым мела нечаканы і малапрагназуемы характар, пра маючае на ім адбыцца павелічэнне

[1] Падрыхтоўка артыкула ажыццёўлена ў рамках праекта БРФФД № Г17ЛИТГ-001 ад 22 мая 2017 г. «Парламентарызм ў Вялікім Княстве Літоўскім у XVIII стагоддзі: інстытуты, парламентарыі, парламенцкая практыка».

[2] У 1765–1768 гг. Касцюшка па пратэкцыі «Фаміліі» вучыўся у Рыцарскай (кадэцкай) школе ў Варшаве, а ў 1768–1774 гг. працягваў адукацыю ў Францыі.

колькасці вайскоўцаў у краіне было вядома загадзя – ужо перад яго пачаткам (з прычыны выказанага Кацярынай II намера выкарыстаць войскі Рэчы Паспалітай, як саюзныя, у вайне з Турцыяй). З улікам гэтага становіцца больш зразумелым уключэнне у змест інструкцыі пас-лам Брэсцкага ваяводства, абраным на мясцовым сойміку ў жніўні 1788 г., пункта пра абавязак ва ўмовах патрэбы павелічэння войска садзейнічаць прыняццю на службу ў ім "сяхновіцкага" абываценя Т. Касцюшкі: «W. jm. p. Tadeusz Siechnowicki Kościuszko, obywatel województwa naszego kosztem Jego Królewskiej Mości i Rzeczypospolitej edukowany, w wojsku amerykańskim zdatnością i odwagą w służbie żołnierskiej zaszczycony w randzie generała, gdy do kraju powróciwszy, w zakącie domowym zostaje, w czasie teraźniejszej potrzeby aukcyi wojska ażeby był, jako już in arte militari peritus, Jego Królewskiej Mości panu naszemu miłościwemu i stanom Rzeczypospolitej przez j. oo. i j. ww. posłów naszych zarekomendowanym, usilnie żądamy» (пункт 9-ы інструкцыі) [4, арк. 1047; 5, p. 292].

Спасылаючыся на моц атрыманай інструкцыі, брэсцкі пасол (і маршалак канфедэрацыі Вялікага Княства Літоўскага на сойме) Казімір Нестар Сапега, прамаўляючы на сесіі 5 снежня 1788 г., рэкамендаваў да прыняцця ў войска Міхала Забэлу і Т. Касцюшку, адзначаючы атрыманы за мяжой досвед і вайсковую смеласць апошняга ("ma on wielkie osobiste swoje przymioty, i kiedy się nauczył krew lać za cudzą Ojczyznę, zapewne jej oszczędzać nie będzie za własną") [6, sesja 30]. На іншых сесіях сойма кандыдатуру Касцюшкі – сярод іншага, як аднаго з выхаванцаў варшаўскай Рыцарскай школы, што здабылі вядомасць у Свеце – згадвалі ў сваіх прамовах іншыя паслы і сенатары: літоўскі ротмістр Станіслаў Кубліцкі (інфлянскі пасол), каронны рэгент Францішак Шыманоўскі (сахачэўскі пасол), Тадэвуш Матушэвіч (брэсцкі пасол), сакратар вялікі літоўскі Фрыдрых Машыньскі (брацлаўскі пасол) [6, sesja 28]; генерал падольскіх зямель Адам К. Чартарыскі (люблінскі пасол) [6, sesja 29]; стражнік польны каронны Юзаф Войцех Межаеўскі (падольскі пасол) [6, sesja 30]; ленчыцкі кашталян Тадэвуш Ліпскі [sesja 162]; паўторна – С. Кубліцкі, К. Н. Сапега; Севярын Патоцкі (брацлаўскі пасол) [6, sesja 163]; Аляксандр Зяліньскі (нурскі пасол) [6, sesja 164]. Звяртае на сябе ўвагу тое, што асноўная большасць іх прадстаўляла на сойме не Вялікае Княства Літоўскае, а Польскую Карону. Яшчэ адным і, відаць, не менш дзейсным фактарам рэалізацыі службовых інтарэсаў Т. Касцюшкі была дапамога з боку княгіні Людвікі Любамірскай, з роду

Сасноўскіх[3]. Яе лісты да Станіслава Аўгуста і Т. Касцюшкі – з адлюстраваннем захадаў у інтарэсах апошняга – часткова апублікаваў і падрабязна прааналізаваў польскі гісторык Т. Корзан [7, s. 199–203, 610–613].

3-га кастрычніка 1789 г. была прынятая соймавая пастанова "Urządzienie względem generała lieutnanta, generałów majorów, i inszych szarż w wojsku oboyga narodów", паводле якой Т. Касцюшка – у агульным спісе з 5 кандыдатаў, прапанаваных соймам і ўхваленых каралём – атрымліваў вайсковы ранг генерал-маёра [3 , s. 111–112], з зацверджанай на сойме праз некалькі дзён штогадовай "пенсіяй" у 12 тыс. зл. [3, s. 112].

Неспадзяванай навіной для Касцюшкі было тое, што намінацыя гэта прывяла яго ў войска Польскай Кароны, а не Вялікага Княства Літоўскага. Сваё імкненне служыць менавіта ў Княстве, Т. Касцюшка засведчыў у ноце, якую скіраваў да Вайсковай камісіі Абодвух Народаў, але Камісія на пасяджэнні 13 лістапада 1789 г. яго просьбу адхіліла [7, s. 204]. "Былы брыгадзір амерыканскіх войск" быў накіраваны ва Улацлавак над Віслай, недалёка ад новай (пасля 1772 г.) мяжы з Прусіяй – у якасці кіраўніка адной з двух брыгад Вялікапольскай дывізіі кароннага войска [8, s. 432].

Накіраванне Касцюшкі ў Вялікую Польшчу стала прадметам абмеркавання на далейшых пасяджэннях сойма. Так, на сесіі 12 лютага 1790 г. інфлянцкі пасол Юліян Нямцэвіч, скардзячыся, што войска ВКЛ засталося зусім без генерал-маёраў, адзін з якіх – Тадэвуш Стэткевіч знаходзіцца ў Варшаве на пасадзе сябра Вайсковай камісіі, другі – Станіслаў Павал Ябланоўскі накіраваны надзвычайным пасломy у Берлін, а трэці – Т. Касцюшка, замест таго каб служыць у ВКЛ, адпраўлены ва Улацлавак, настойваў на вяртанні апошняга ў Княства ("kiedy uważam, że w dywizyjach nie znajdują się generał majorowie, a szczególnej nie pojmuję przyczyny, dla czego ordynansem Komisyi [wojskowej] generał major jm. p. Kościuszko do Korony jest przeniesiony i w Inowrocławku[4] znajduje się. Dla tego upraszać mi zostaje, aby tenże generał major powrót do Litwy miał ordynowany") [9, l. 708 ob., 725 ob.].

---

[3] Мінулае Л. Любамірскай было адзначана ўзаемным каханнем і спробай шлюбу з Касцюшкам, сарванай з-за пазіцыі яе бацькі Юзафа Сасноўскага, смаленскага ваяводы і літоўскага польнага гетмана.

[4] Верагодна, у сваей прамове Ю. Нямцэвіч пераблытаў г. Інаўроцлаў, які з 1772 г. быў у складзе Прусіі, з геаграфічна блізкім да яго г. Улацлаўкам.

2 сакавіка 1790 г. брэсцкі пасол Т. Матушэвіч – спасылаючыся на моц сваёй інструкцыі – выказаў згоднае з пазіцыяй маршалка К. Н. Сапегі патрабаванне пераводу Т. Касцюшкі ў Вялікае Княства Літоўскае, аргументуючы яго таксама адсутнасцю ў мясцовым войску на сваіх месцах генерал-маёраў ("kiedy z dywizyi jm. p. generała lieutnanta Judyckiego, żaden z generał majorow nie znajduje się, bo ks. Jabłonowski w Berlinie, jm. p. Stetkiewicz, przytomny w Warszawie, na funkcyi komisarskiej być musi) [10, l. 46].

У адказ лукоўскі кашталян Яцэнты Язерскі, аддаючы належнае выключным талентам Касцюшкі ("j. p. generał major Kościuszko jest zacny kawaler, grogie posiadający talenta, bo wojażował po tych świata krainach, gdzie żadnego z nas noga nie była, kochamy go powszechnie wszyscy"), адзначыў, што ён адначасова любімы і звязаны з усімі правінцыямі ("prawdziwie stał się oblubieniem wszystkich Prowincyi") і калі накіраваны Вайсковай камісіяй Абодвух Народаў у найбольш патрэбнае месца ("na potrzebnejszym miejscu lokowany") – не справа сойма замяняць гэтае прызначэнне іншым. Дыскусію прыпыніў Станіслаў Аўгуст, просячы Язерскага саступіць агульнаму меркаванню ўсёй правінцыйнай сесіі Вялікага Княства Літоўскага ("spodziewam się, że sam jeden j.p. kasztelan lukowski nie zechce być przeciwny żądaniu całej prowincyi litewskiej") [10, l. 46 ob.]. Была, аднак, гэта не кропка, а толькі чарговае шматкроп'е ў вырашэнні службовага лёсу Касцюшкі, якое ў святле далейшых падзей не прынесла яму чаканага выніку.

Непрыхаванае жаданне вярнуцца ў Княства, вырвацца з Улацлаўка ("miejsca tak nie przyjemnego, kosztownego i nic jeszcze niemającego") адлюстроўвае ліст Касцюшкі за 7 лютага 1790 г., скіраваны ў Навагрудскае ваяводства да сям'і Несялоўскіх (поўны тэкст на мове арыгіналу гл. ніжэй па спасылцы[5]). Жыхароў заходніх абшараў Рэчы

---

[5] T. Kościuszko do (?) Niesiołowskiego, Wrocławek 7 II 1790: "Jaśnie wielmożny mości dobrodzieju!

Zaklinam na wszystko co jest w życiu najmilszego, to jest żoneczkę i dziatki (z tem wszystkim Anusia [сястра Касцюшкі Ганна Эстка – В.А.] ma podobieństwo do cyganki), abyś chciał j. w. pan dobrodziej wyrwać mnie z miejsca tak nie przyjemnego, kosztownego i nic jeszcze niemającego. Bóg widzi, słowa nie mam do kogo przemówić, i dobrze, bo y wołami nigdy nie gadałem. Co za Gaskony! Ale dam pokój opisywać krajowych, powiem tylko, że kraj piękny i tenby być powinien poczciwym i gospodarnym Litwinom przeznaczonym, a nie im gnuśnym i niedbałym. Chciejcie mnie powrócić z Litwy, chyba się wyrzekacie mnie i mnie nie zdolnym widzicie do służenia wam? Ktoż jestem, ażali nie Litwin, spółrodak wasz, od was wybrany? Komuż mam wdzięczność okazywać jeżeli nie wam, kogo mam bronić, jeżeli nie was i siebie samego? Jeżeli was to nie zmiękczy do wniesienia o mnie na Sejmie, abym powrócił, ja sam chyba Bóg widzi co złego sobie zrobię,

Паспалітай (і сваіх новых саслужбоўцаў на чале з кіраўніком дывізіі Каралем Мальчэўскім) Касцюшка з'едліва параўноўвае ў лісце з нямымі "валамі" і "гасконцамі", што было сінонімам самахвальства і ганарлівасці; адзначае ў дачыненні да вялікапольскіх зямель, што было б лепш, каб такі прыгожы і ўрадлівы край быў заселены не мясцовымі нядбальцамі, а гаспадарлівымі ліцвінамі ("tenby być powinien poczciwym i gospodarnym Litwinom przeznaczonym, a nie im gnuśnym i niedbałym"); сваю службу ў каронным войску ён лічыць злой іроніяй ("złość mnie bierze, z Litwy abym w Koronie służył, gdy wy nie macie trzech jenerałów"); падкрэслівае сваё ліцвінскае паходжанне ("ktoż jestem, ażali nie Litwin, spółrodak wasz, od was wybrany?") і папракае адрасата і іншых суайчыннікаў (у звыш эмацыйнай форме: "Jeżeli was to nie zmiękczy [...], ja sam chyba Bóg widzi co złego sobie zrobię") у нежаданні ставіць на сойме пытанне пра яго перавод у Княства [11, s. 162–163].

Дадзены ліст неаднаразова прыводзіўся рознымі біёграфамі Касцюшкі (у тым ліку ў перакладзе на беларускую [12, с. 21] і літоўскую [13, p. 283] мовы), тым не менш, ён пакідае шэраг не да канца высветленых пытанняў.

Паколькі ў лісце не пазначанае імя атрымальніка, толькі прозвішча, у частцы публікацый адзначаецца, што яго верагодным адрасатам быў 18-гадовы Ксаверый Несялоўскі, будучы генерал-маёр ў часы паўстання 1794 г., а на той момант – кіраўнік VI палку пяхоты войск Вялікага Княства Літоўскага [14]. Значна радзей згадваецца, што атрымальнікам ліста – непасрэдным або ўскосным – мог (і павінен быў) быць бацька Ксаверыя, 61-гадовы Юзэф Несялоўскі, навагрудскі ваявода, а ў часы Чатырохгадовага сойма – таксама сябра Вайсковай камісіі Абодвух Народаў [13] і, што зусім рэдка адзначаецца [13, p. 283], старшыня яе пасяджэнняў у сярэдзіне лістапада 1789 г., г. зн. у момант, калі Камісія прымала адмоўнае рашэнне па ноце Касцюшкі [16, l. 215]. Другі важны момант, які застаўся без належнага тлумачэння – час напісання ліста. Т. Касцюшка скіраваў яго 7 лютага 1790 г. – за два дні да таго, як у Наваградку адбыўся чарговы соймік [17, арк.

---

bo złość mnie bierze, z Litwy abym w Koronie służył, gdy wy nie macie trzech jenerałów. Kiedy was nisać na sznurku będzie przemoc, wtenczas chyba ockniecie się i o siebie dbać będziecie. Nareszcie proszę na przyjaźń, którą chciałeś zaszczycić mnie j.w. pan dobrodziej, abyś był moim wybawicielem, który zawsze być pragnę prawdziwym i nieodmienne, a z powinnem uszanowaniemj. w. imci pana dobrodzieja najniższym sługą. T. Kościuszko [тэкст паводле: 11, s. 162 –163].

86–89]. З улікам гэтага, а таксама слоў ліста пра нежаданне Ю. Несялоўскага ўздымаць на сойме пытанне пераводу Касцюшкі ў літоўскае войска ("jeżeli was to nie zmiękczy do wniesienia o mnie na sejmie"), цалкам магчыма, што негатыўныя эмоцыі, выяўленыя ў час напісання ліста, у Касцюшкі маглі ўзнікнуць не толькі з прычыны складаных адносін з саслужбоўцамі, але і ў сувязі з няўдалай спробай дамагчыся згадкі пра сваю сітуацыю ў рэзалюцыі навагрудскага сойміка[6], кіраванага ў значнай ступені мясцовым ваяводам.

Пра тое, што Касцюшка і яго добразычліўцы рабілі актыўныя захады ў гэтым кірунку сведчаць інструкцыі двух іншых соймікаў Вялікага Княства Літоўскага – гродзенскага і брэсцкага.

У інструкцыі першага з іх, прынятай ў Гродне 10 лютага 1790 г., падкрэслівалася выяўленае ў канкрэтнай форме ("ochota szczególna") жаданне Касцюшкі служыць Айчыне менавіта ў "войску літоўскім" і на гэтай падставе давалася даручэнне мясцовым паслам Казіміру Волмеру і Аляксандру Міхалу Эйсымонту дамагацца на сойме пераводу яго як абывацеля "літоўскай правінцыі" з Кароны ў войска Вялікае Княства Літоўскага:

"Zdolność jm. p. Tadeusza Kościuszki obywatela prowincyi litewskiej, dawnej w służbie wojsk amerykańskich będącego, gdy zjednała względy najjaśniejszych stanów Rzeczypospolitej dopiero sejmujących, iż został plasowanym w wojsku koronnym, a ochota służenia onegoż ojczyźnie kiedy s[z]czególna jest w wojsku litewskim, przeto j. ww. posłowie pzy poleceniu względom Jego Królewskiej Mości i najjaśniejszych stanów sejmujących starania dołożyć zechcą, aby tenże jm. p. Kościuszko z wojska koronnego do litewskiego z rangą wedle zdolności przyzwoitą przeniesiony został, bez powiększenia liczby w etacie determinowanej" (пункт 9-ы інструкцыі) [18, арк. 819; 5, р. 124].

Тэкст інструкцыі паслам Брэсцкага ваяводства (К. Н. Сапега, Т. Матушэвіч, Зянон Выслух, Станіслаў Урсын Нямцэвіч) прынятай 20

---

[6] Сведчанні пра соймік Наваградскага ваяводства, які распачаў сваю працу 9 лютага 1790 г., захаваліся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску [17, арк. 86-89 адв.] у выглядзе дадатковых наказаў (пунктаў інструкцыі) мясцовым паслам Міхалу Бярновічу і Стэфану Верашчаку ("Suplement do instrukcyi [...] przeświętego województwa nowogrodzkiego na sejmik graniczny gospodarski w roku teraźniejszym 1790 na dniu 9-m miesiąca lutego zgromadzonych j. ww. ichm. pp Michałowi Bernowiczowi sędziemu ziemskiemu województwa naszego i Steffanowi Wereszczakowi staroście sitkowskiemu, posłom naszym [...], dana dnia 9-go miesiąca lutego 1790 roku"). Дадзены дакумент адсутнічае ў выдадзеным у 2015 г. зборніку соймікавых інструкцый ВКЛ за 1788-1790 гг. [5].

лістапада 1790 г. у Брэсце, патрабаваў таго ж самага, дадаткова акцэнтуючы ўвагу на ліцвінскіх каранях продкаў Касцюшкі і наяўнасці ў яго на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага спадчыннай зямельнай маёмасці: “Gdy w. jm. p. Tadeusz Kościuszko z poprzedników swoich będąc obywatelem litewskim i mając po swoich antecesorach ziemską dziedziczną osiadłość, za rekomengacyją najjaśniejszego pana i skonfederowanych Rzeczypospolitej stanów otrzymał rangę generał majorstwa nad wojskiem prowincyi koronnych, przeto iżby tenże w. Kościuszko w tej samej randzie był przeniesiony do wojska litewskiego, j. oo. i j. ww. posłowie nasi instabunt” (пункт 36-ы інструкцыі) [19, арк. 1791; 5, p. 305].

Такім чынам, гісторыя з уладкаваннем Т. Касцюшкі на вайсковую службу ў Рэчы Паспалітай знайшла прамое адлюстраванне ў тэкстах трох з вядомых нам інструкцый мясцовых соймікаў Вялікага Княства Літоўскага. Пры гэтым, калі першая з іх – Брэсцкага ваяводства (1788) – атрымала шырокую вядомасць з прычыны сваёй публікацыі у “Актах Виленской археографической комиссии” за 1867 г. [20, с. 189–194], то дзве астатнія – брэсцкая і гродзенская з 1790 г. – да нядаўняга часу ў Беларусі і Польшчы знаходзіліся фактычна па-за навуковым ужыткам. Іх тэксты ўпершыню былі апублікаваны ў 2015 г. літоўскімі даследчыкамі Р. Юргайцісам, А. Станкевічам і А. Вербіскенэ [5]; змест брэсцкай інструкцыі 1790 г. адносна Т. Касцюшкі прыведзены літоўскім гісторыкам А. Шапокам у даследаванні, апублікаваным пасмяротна ў 2008 г. [13, p. 283–284]; змест гродзенскай інструкцыі 1790 г., наколькі нам вядома, біёграфамі Касцюшкі дагэтуль не згадваўся.

Змест інструкцый не толькі раскрывае пэўныя старонкі ў біяграфіі Т. Касцюшкі, але таксама ставіць новыя пытанні. Застаецца загадкай – адбіткам чаго ў першую чаргу стала накіраванне Касцюшкі ў кароннае войска – даўняй канкурэнцыі за ўплыў у войску паміж каралём і лідарамі магнацкай апазіцыі, або нежаданнем мясцовых магнацкіх эліт Вялікага Княства Літоўскага даваць генеральскі ранг простаму шляхціцу? Другое пытанне датычыць механізмаў і канкрэтных фактараў (у тым ліку – персанальных) атрымання Касцюшкам патрэбных рэзалюцый на сойміках. З аднаго боку, падтрымка яго службовых інтарэсаў на брэсцкім сойміку можа быць растлумачанай мясцовым паходжаннем, а таксама – што не менш істотна – даўнімі сувязямі з Чартарыскімі, уплывы якіх разам з бліжэйшымі палітычнымі саюзнікамі – акрамя Берасцейшчыны – распаўсюджваліся, перад усім, на ўкраінскія ваяводствы Польскай Кароны [21; 22] (згадаем, што ад-

туль паходзіла таксама большасць паслоў, якія ў 1788–1789 гг. выступалі за прыняцце Касцюшкі на вайсковую службу і менавіта туды – у брацлаўска-кіеўскую дывізію пад кіраўніцтвам кн. Юзафа Панятоўскага – быў пераведзены служыць Касцюшка ў жніўні 1790 г. [8, s. 432]). З іншага боку, застаецца не высветленым, чаму інтарэсы Касцюшкі былі дадаткова адлюстраваны ў рэзалюцыі менавіта гродзенскага сойміка і, адпаведна, ці мелі месца – і дзе – іншыя спробы Касцюшкі і яго заступнікаў атрымаць падтрымку ў рэгіёнах Вялікага Княства Літоўскага.

Літаратура і крыніцы:

1. Zarys dziejów wojskowości polskiej do roku 1864 / redaktor naukowy Janusz Sikorski. – w 2 t. – Warszawa, 1966. – T. 2: 1648–1864. – 668 s.

2. Danilczyk, A. W kręgu afery Dogrumowej : sejm 1786 roku / A. Danilczyk. – Warszawa : Neriton, – 2010. – 214 s.

3. Volumina legum: leges, statua, constitutiones et privilegia Regni Poloniae, Magni Ducatus Lithuaniae omniumque provinciarum annexarum : w 10 t. – Kraków, 1889. – T. 9: ab anno 1782 ad annum 1792. – 503 s.

4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 1741. – Воп. 1. – Спр. 46.

5. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės seimelių instukcijos (1788-1790) / parengė R. Jurgaitis, A. Stankevič, A. Verbickienė, – Vilnius: Mykolo Romerio universitetas, – 2015. – 436 p.

6. Diariusze Sejmu Wielkiego / Wielkopolska Biblioteka Cyfrowa [Elektronic resourse] – 2005. – Mode of access: http://www.wbc.poznan.pl/dlibra/publication?id=20152&from=&dirids=1&tab=1&lp=1&QI=EBF578B85A36A2C692768AFCD974FB23-13. – Date of access: 30.09.2017.

7. Korzon, T. Kościuszko biografia z dokumentów wysnuta. Poprzedzona rzutem oka na dzieje Muzeum Narodowego w Rapperswylu i Katalogiem zbiorów kościuszkowskich, w temże muzeum przechowywanych / T. Korzon – Kraków: Nakładem Muzeum Narodowego w Rapperswylu. – 1894. – 691 (VIII) s.

8. Herbst, S. Kościuszko Andrzej Tadeusz Bonawentura / S. Herbst // Polski Słownik Biograficzny. – Wroclaw etc., 1968 – 1969.– T. XIV. – S. 430–440.

9. Archiwum Główny Akt Dawnych w Warszawie – Archiwum Sejmu Czteroletniego – Sygn. 5.

10.Archiwum Główny Akt Dawnych w Warszawie – Archiwum Sejmu Czteroletniego – Sygn. 6.

11.Listy Kościuszki do jenerała Mokronowskiego i innych osób pisane / zebrał i wstępem opatrzył Ł. Siemieński. – Lwów: nakładem Księgarni Gubrynowicza i Schmidta. – 1877. – 234 s.

12. Юхо, Я., Емельянчык, У. "Нарадзіўся я ліцвінам...": Тадэвуш Касцюшка / Я. Юхо, У. Емельянчык, – Мінск: Навука і тэхніка, – 1994. – 68 с.

13. Šapoka, A. Raštai / A. Šapoka. – T. 2: Lietuva Reformų seimo metu. Iki 1791 m. gegužės 3 d. konstitucijos / Vilniaus pedagoginis universitetas ; įvadą, tekstus ir komentarus parengė Robertas Jurgaitis, Ramunė Šmigelskytė-Stukienė. – Vilnius : Vilniaus pedagoginio universiteto leidykla, – 2008. – 557 p.

14. Żytkowicz, L. Niesiołowski Franciszek Ksawery h. Korzbok / L. Żytkowicz // Polski Słownik Biograficzny. – Wroclaw etc., 1978.– T. XXIII/1. – S. 57–59.

15. Żytkowicz, L. Niesiołowski Józef h. Korzbok / L. Żytkowicz // Polski Słownik Biograficzny. – Wroclaw etc., 1978.– T. XXIII/1. – S. 53–55.

16. Archiwum Główny Akt Dawnych w Warszawie – Archiwum Sejmu Czteroletniego – Sygn. 18.

17.НГАБ. – Фонд 1730. – Воп. 1. – Спр. 56.

18.НГАБ. – Фонд 1711. – Воп. 1. – Спр. 71.

19.НГАБ. – Фонд 1705. – Воп. 1. – Спр. 71.

20. Акты Виленской археографической комиссии: Том II. Акты Брестского земского суда XVI—XVIII вв. – Вильна: Тип. Губернского Правления, – 1867. – 366 с.

21.Michalski, J. Sejmiki poselskie 1788 roku / J. Michalski // Przegłąd historyczny. – Tom LI: 1960. – S. 52–73 (z. 1), 331–368 (z. 2), 465–482 (z. 3).

22. Jusupović, M. Działalność Adama Kazimierza Czartoryskiego na początku Sejmu Czteroletniego / M. Jusupović // Kwartalnik Historyczny. – 2009. – № 3.– S. 43–72.

*Радзюк А. Р. (Гродна)*

# РЭПРЭСІЎНАЯ ПАЛІТЫКА ЦАРЫЗМУ СУПРАЦЬ УДЗЕЛЬНІКАЎ ПАЎСТАННЯ 1794 ГОДА.

Рэпрэсіі займалі вельмі важнае месца ў палітыцы царызму стасоўна насельніцтва беларускай зямлі. Іх роля не была аднолькавай у розныя перыяды знаходжання ў складзе Расійскай імперыі. Асабліва выразна элементы гэтай палітыкі выяўляліся падчас задушэння нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Менавіта паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі стала тым палігонам, на якім былі апрабаваныя асноўныя мерапрыемствы карнага характару, якія пасля актыўна прымяняліся царскімі ўладамі на працягу ўсяго XIX і пачатку XX ст.

Галоўнымі адметнасцямі рэпрэсіўнай палітыкі царызму на тэрыторыі Беларуска-Літоўскага рэгіёну падчас яго знаходжання ў складзе Расійскай імперыі была дзейнасць адмысловых следчых і судовых камісій для разбору ступені віны палітычных злачынцаў і іх пакарання. У якасці асноўных мер уздзеяння карнага характару практыкаваліся ссылкі і канфіскацыі маёмасці. Упершыню комплекснае выкарыстанне ўсіх гэтых элементаў адбылося падчас і пасля задушэння паўстання 1794 г.

У выніку баявых дзеянняў 1794 г., а таксама даносаў, у рукі царскіх вайсковых уладаў трапілі некаторыя актыўныя дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху. З мэтай здабыцця падрабязных звестак пра падрыхтоўку і ход інсурэкцыі, выяўленне новых датычных да тых падзей асоб, а таксама вызначэнне ступені іх віны, згодна з указам Кацярыны II, была створана адмысловая следчая камісія ў Смаленску. Першая партыя будучых падследных была дастаўлена ў гэты горад з Мінска 20 красавіка 1794 г., за некалькі дзён да фармальнага заснавання гэтага органа. У далейшым Смаленск быў ператвораны царскімі ўладамі ў нешта нашталт фільтрацыйнага цэнтра, куды накіроўвалася для вырашэння будучага лёсу большасць схопленых імі інсургентаў: "а паколькі галоўныя з іх (бунтароў), былі ўзяты ў палон генерал-маёрам князем Паўлам Цыцыянавым пры Любані, высланы ў Смаленск, то і іншых я туды ж пад вартай даставіць загадаў... каб яны там, разам са сваімі вераломнымі начальнікамі, у злачынстве, што імі было здзейснена, асуджаны былі па закону...", – даносіў Мікалай Рапнін імператрыцы 31 студзеня 1794 г.[7]

[7] Сборник императорского Русского исторического общества. СПб., 1875. Т.16. – С. 89.

Комплекс судова-следчых мерапрыемстваў, якi быў задзейнiчаны Смаленскай камiсiяй, уключаў у сябе шэраг працэдур, што стануць абавязковымi для усiх падобных органаў у першай палове XIX ст.: працяглыя тэрмiны папярэдняга заняволення, вусныя i пiсьмовыя допыты, вочныя стаўкi, падзел на катэгорыi ў залежнасцi ад ступенi вiны, змякчальная канфiрмацыя i г. д. Цi не адзiнай адметнасцю, якая вылучае дадзены канкрэтны выпадак з шэрагу iншых, з'яўляецца суб'ектыўны фактар. Многiя ўдзельнiкi таго працэсу, а таксама пазнейшыя гiсторыкi адзначаюць досыць гуманныя адносiны следчых i ў першую чаргу старшынi камiсii – смаленскага генерал-губернатара (намеснiка) Рыгор Осiпава[8].

Праз поўны цыкл камiсii прайшло каля 90 чалавек. Сярод iх былi не толькi вайскоўцы, але цывiльныя i духоўныя асобы. Большасць з iх былi падданымi iмперыi (жыхарамi тых тэрыторый, што адышлi да Расii па вынiках другога падзелу), але частка падсудных паходзiла з тэрыторыi Рэчы Паспалiтай. Тым не менш падобныя прававыя акалiчнасцi не замiналi судова-следчаму працэсу. На завяршальным этапе сваёй работы азначаны следчы орган, апрацаваўшы ўсе дадзеныя, што былi сабраныя iм за час яго дзейнасцi, склаў абвiнаваўчыя акты. Апошнiя былi накiраваныя ў адмысловую сенацкую камiсiю на чале з генерал-пракурорам Аляксандрам Самойлавым, якая ў дадзеным выпадку адыграла ролю суда[9].

Як лiчыць польскi даследчык Генрык Масьцiцкi, Смаленск быў абраны ў якасцi месца работы камiсii не выпадкова. Гэта рабiлася дзеля таго, каб не даць магчымасцi сваякам i блiзкiм сустракацца з падследнымi. Але нягледзячы на такiя меры перасцярогi, актыўнасць апошнiх, якiя дзеля гэтых мэт выкарыстоўвалi розныя каналы i спосабы для аказання цiску, у некаторых выпадках аказала пэўны ўплыў на канчатковыя вердыкты. Акрамя таго, нельга зноў жа не адзначыць тую пазiцыю, якую па гэтым пытаннi заняў адзiн з найбольш уплывовых саноўнiкаў у гэтым рэгiёне – Мiкалай Рапнiн. "Магу запэўнiць вас, яснавяльможны князь, што заступнiцтва ваша за гэтых людзей шмат у чым палегчыла жэрабя iх..."[10], – iнфармаваў таго статс-

[8] Mościcki H. Dzieje porozbiorowe Litwy i Rusi. Wilno, 1910. – S. 295; Janik M. Dzieje polaków na Syberii. Kraków, 1928. – S. 77; Pamiętniki Jana Duklana Ochockiego, T. 2. Wilno, 1851. – S. 421.

[9] Дьяков В. Костюшко и его соратники после сражения при Мацейовице (1794-1798) // Славяноведение, 1993. – С. 74.

[10] Сборник императорского Русского исторического общества... Т.16. – С. 238.

сакратар Дмітрый Трашчынскі. Улічваючы ўсе вышэй пералічаныя абставіны, канчатковы прысуд, які быў канфірмаваны Кацярынай II па выніках азнаямлення з "экстрактамі" (выпіскамі) са следчых спраў, аказаўся больш мяккім, чым гэта прадугледжвалася прапановамі камісіі.

Не ўсе фігуранты, чые справы разглядала Смаленская камісія былі пакараныя. Згодна з сакрэтным указам імператрыцы ад 20 чэрвеня 1795 г., ад адказнасці было вызвалена 25 асоб. Іх прывялі да прысягі і адпусцілі на парукі (хаця першапачаткова планавалася падвергнуць выгнанню з краю). Астатнія падсудныя былі падзеленыя на дзве групы. У першую з іх увайшлі асобы, якія фармальна з'яўляліся расійскімі падданымі. Яны склалі шэсць першых катэгорый віны. Тут налічвалася 39 асоб, з якіх чатыры ўрэшце атрымалі памілаванне. Другая падобная група складалася з тых, хто да пачатку паўстання заставаўся грамадзянінам Рэчы Паспалітай і, адпаведна, не складаў прысягі на вернасць расійскаму прастолу. Яны былі аднесены да 7-10-й катэгорый віны. У якасці пакарання ім усім была вызначана ссылка, цяжкасць якой рэгулявалася аддаленасцю месца яе адбыцця. Так, найбольш вінных было загадана разаслаць у самыя аддаленыя гарады Сібіры, у выніку чаго некаторыя паўстанцы з гэтай групы апынуліся нават на Камчатцы. Для іншых пакаранне абмяжоўвалася ўнутранымі губернямі імперыі. Асобна ва ўказе агаворваўся лёс шляхціца Восіпа Тэраевіча, які акрамя палітычных злачынстваў абвінавачваўся ў крымінальных (забойстве расійскага салдата). У яго выпадку ў якасці меры ўздзеяння была абрана катарга[11].

Камісія ў Смаленску займалася разглядам спраў толькі самых актыўных прадстаўнікоў шляхетных прозвішчаў, што падтрымалі паўстанне. Тысячы іншых асоб, якія змагаліся пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі, апынуліся ў розных кутках імперыі без суда і следства. У першую чаргу гэта былі вайскоўцы і апалчэнцы, якія трапілі ў палон. Тыя з іх, хто быў схоплены на тэрыторыі Беларусі і Літвы (землі падпарадкаваныя Цімафею Туталміну і Мікалаю Рапніну), спачатку накіроўваліся ў фільтрацыйныя пункты ў Смаленск, Пскоў, Рыгу. У іх ліку былі асобы ў асноўным ніжэйшага стану, якія не мелі афіцэрскіх чыноў. У сваю чаргу паўстанцы захопленыя войскамі пад камандаваннем А. Суворава, канцэнтраваліся ў іншых мясцовасцях, у ведамстве графа Пятра Румянцава-Задунайскага. Тым не менш іх усіх далей чакаў аднолькавы лёс. Праз адмысловыя ўказы Кацярыны II,

[11] ПСЗРИ (издание 1-е), Т. 23, № 17345.

пераважная іх частка была размеркавана ў воінскія часткі, якія неслі каравульную службу ў бязлюдных мясцінах ці невялікіх населеных пунктах расійскай глыбінкі[12]. Як адзначае расійскі даследчык Галіна Макарава, большасць ваеннапалонных, што былі пазней інтэрнаваны ўглыб Расіі, паходзіла з тэрыторыі колішняга ВКЛ. Па яе ж падліках, іх колькасць перавышала 5 тысяч чалавек[13].

Аб умовах, у якіх апынуліся ваеннапалонныя пасля вырашэння іх лёсу, можна меркаваць на прыкладзе тых з іх, хто быў высланы ў г. Рочэнсальм (зараз Котка). У ліпені і верасні 1794 г. дзве партыі трапіўшых у палон паўстанцаў з Рыгі ў колькасці 227 і 179 чалавек адпаведна па моры былі дастаўлены на фінскае ўзбярэжжа. Тут яны былі размешчаны ў казармах пад наглядам варты і выкарыстаныя "ў крэпасных работах" для стварэння новай расійскай марской базы на Балтыцы[14]. Частка з іх там і памерла, некаторым удалося ўцячы.

Канчатковую кропку ў вырашэнні лёсу сасланых паўстанцаў 1794 г. паставіў лістападаўскі ўказ 1796 г. Паўла I аб іх амністыі. Пасля яго выхаду распачаўся актыўны працэс вяртання ссыльных і інтэрнаваных па гэтай справе асоб. У сувязі з аддаленасцю месца адбыцця пакарання для некаторых з іх ён зацягнуўся на некалькі гадоў.

Вельмі істотнае месца ў комплексе мер па барацьбе з паўстаннем займалі мерапрыемствы па пазбаўленні ўдзельнікаў паўстання зямельнай і іншай маёмасці. Пры гэтым дадзеная мера выкарыстоўвалася як для ўстрымання маёмаснага класа ад удзелу ва ўзброеным руху, так і для пакарання за ўдзел у ім. Некаторыя польскія гісторыкі даваеннага перыяду сур'ёзна разглядалі верагоднасць таго, што паўстанне 1794 г., калі і не было цалкам справакавана расійскімі ўладамі, то з іх боку свядома не былі прыняты адпаведныя прэвентыўныя захады. На думку Юзафа Качкоўскага, Леана Жытковіча і інш. даследчыкаў, зроблена гэта было толькі дзеля таго,

---

[12] Дьяков В. Костюшко и его соратники после сражения при Мацейовице (1794-1798) // Славяноведение, 1993. – С. 71.

[13] Макарова Г. Новые материалы о пребывании участников движения Т. Костюшко в России // Славяноведение, 1994, № 4. – С. 47.

[14] Козюренок К. Пленные костюшковские повстанцы в Роченсальме, 1794-1796 гг. [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу: http://www.reenactor.ru/ARH/PDF/Kozyrenok_10.pdf.

каб мець магчымасць канфіскаваць маёнткі ўдзельнікаў паўстання "post factum"[15].

Падрыхтоўка да паўстання на землях Польшчы, заходняй Беларусі, Літвы і Украіны праводзілася патрыятычнымі коламі на працягу восені 1793 – вясны 1794 г. Нягледзячы на глыбокую канспірацыю, да расійскіх улад даходзіла пэўная інфармацыя аб існаванні патрыятычных спісаў. Тым не менш пачатак паўстання ў Кракаве, захоп паўстанцамі Варшавы, а пасля і Вільні, былі для Санкт-Пецярбурга пэўнай нечаканасцю і выклікалі калі не паніку, то вялікую заклапочанасць у прыдворных колах. Асноўная стаўка падчас задушэння вызваленчага руху была зроблена на армію.

Кацярына II даволі аператыўна адрэагавала на выбух паўстання ў Літве. Ужо праз некалькі дзён пасля захопу паўстанцамі Вільні, а дакладней, 19 і 22 красавіка 1794 г., ёй былі выдадзены імянныя ўказы на імя Ц. Туталміна і М. Рапніна. Гэтыя дакументы маюць форму інструкцый, у якіх падрабязна выкладзены асноўныя захады па задушэнні нацыянальна-вызваленчага руху ў межах Літоўскіх правінцый і па недапушчэнні далейшага распаўсюджвання паўстання на суседнія тэрыторыі. Указ, адрасаваны М. Рапніну, паводле зместу больш нагадвае ваенную дыспазіцыю, у якой вызначаны асноўныя крокі падпарадкаваных яму войск. Генерал-губернатар мінскі, ізяслаўскі і брацлаўскі Цімафей Туталмін не дыспанаваў значнымі вайсковымі сіламі, і таму галоўная задача яго дзеянняў была вызначана наступным чынам: "…адшукваць усе сродкі і выкарыстоўваць усе спосабы, з аднаго боку, у змяншэнні колькасці праціўнікаў... і, нарэшце, у паступленні па ўсёй строгасці з закаснелымі злачынцамі і ў пакаранні іх узорным чынам… а з іншага, падбадзёрваць і падтрымліваць добранадзейных… узнагароджваць шчодра і прывязваць іх да ўлады і да кіравання расійскага ўласнай іх выгодаю"[16].

Нягледзячы на розныя падыходы, абраныя Кацярынай II для дасягнення мэты, абодва згаданыя дакументы маюць шэраг агульных палажэнняў. У гэтых указах прадпісвалася выкарыстоўваць секвестрацыю зямельных валоданняў удзельнікаў паўстання. Зыходзячы з таго, што тэрыторыі, на якіх павінны былі дзейнічаць расійскія саноўнікі, мелі розны статус, існавалі і розныя падыходы ў

[15] Kaczkowski J. Konfiskaty na ziemiach polskich pod zaborem rosyjskim po powstaniach roku 1831 i 1863. Warszawa, 1918. – S. 245; Żytkowicz L. Rządy Repnina na Litwie w latach 1794-1797. Wilno, 1938. – S. 187.

[16] Восстание и война 1794 года в Литовской провинции. Минск, 2001. – С. 36.

вызначэнні падстаў для ўзяцця маёнткаў у казённы нагляд. Так, у прадпісанні да Ц. Туталміна загадвалася неадкладна накладваць секвестр на маёмасць тых, хто "...выкрыецца яўна, альбо ў змове даказаны будзе..."[17]. Яшчэ большае поле дзейнасці ў адносінах да зямельных валоданняў жыхароў Літоўскіх правінцый адкрываліся перад М. Рапніным. Вось што было зазначана ў адрасаваным да яго ўказе: "Ва ўсім наваколлі... маёнткі памешчыкаў павінны ўзяты быць у секвестр..."[18]. Праўда, далей у тэксце рабілася агаворка, што такая мера не павінна датычыцца асоб, якія ў паўстанні ўдзелу зусім не прымалі і заставаліся на месцы свайго сталага жыхарства. Падобны крытэрый падчас ажыццяўлення секвестрацыі маёмасці выкарыстоўваўся як у адносінах да тых, што знаходзіліся на месцы сталага жыхарства, так і тых, што выехалі за мяжу. У адпаведнасці з распараджэннем Кацярыны II ад 18 мая 1794 г. уладамі была апісана і ўзята ў казённы нагляд маёмасць тых асоб з Полацкай і Магілёўскай губерняў, аб якіх было вядома, што яны знаходзіліся ў гэты час у Польшчы[19].

Прыкладна ў гэты ж час падзеі ў Польшчы і Літве сталі прадметам пільнай увагі і з боку Савета пры "Найвышэйшым двары". На пасяджэнні гэтага органа, спецыяльна прысвечаным распрацоўцы мер па задушэнні паўстання, было вырашана нерухомыя маёнткі, што знаходзіліся ў далучаных абласцях, Станіслава Панятоўскага, а таксама іншых асоб, якія з'яўляліся ўдзельнікамі паўстання, "секвестраваць і трымаць у казённым кіраванні да адпаведнага разгляду"[20]. Звяртае на сябе ўвагу той факт, што ў першых распараджэннях царскіх улад адносна секвестру прыватных маёнткаў няма ніводнага слова аб тых, хто парушыў прысягу вернасці. Між іншым пасля падаўлення паўстання менавіта гэты крытэрый стане галоўным для вызначэння асоб, чыя маёмасць прызначалася для канчатковай канфіскацыі.

Няведанне рэальнай абстаноўкі на далучаных землях, а таксама боязь перад тым, што паўстанне ахопіць ніжэйшыя класы і распаўсюдзіцца на новыя землі, прывяло да ўключэння ў некаторыя дакументы шэрагу дэкларацый прапагандысцкага характару. Абяцанні гэтыя датычыліся раздачы на тэрыторыі другога падзелу секвестраваных маёнткаў асобам, якія словам і справай дакажуць сваю адданасць

---

[17] Тамсама.
[18] Тамсама. – С. 40.
[19] Российский государственный исторический архив (РГИА). Ф. 1400, оп. 1, д. 92. л. 4.
[20] РГИА. Ф. 1146, оп. 1, д. 16. л. 117.

новай уладзе[21]. У адносінах да Літоўскіх правінцый, пэўна, з-за нявызначанасці іх будучага лёсу, падобных дэкларацый не рабілася, але і там рускія войскі павінны былі ўсялякімі сродкамі падтрымліваць тых, хто не далучыўся да ўзброенай барацьбы. З мэтай прыцягнення большай колькасці землеўласнікаў на свой бок царызм у адрозненне ад 1772 г. не пайшоў на канфіскацыю старасцінскіх, дзяржаўных эканомій і іншых падобных зямельных маёнткаў, якія на той час знаходзіліся ў карыстанні (арэнда, пажыццёвае альбо пяцідзесяцігадовае валоданне) розных прыватных асоб. Між іншым планы перадачы ў казну гэтага тыпу земляў выношваліся ў вышэйшых колах яшчэ да пачатку паўстання[22]. Указам ад 19 красавіка 1794 г. падобныя валоданні загадана было пакінуць ранейшым іх гаспадарам "як неад'емную іх уласнасць" да таго часу, пакуль яны захаваюць вернасць імперыі[23]. Не выклікае сумненняў, што на такі крок улады пайшлі толькі дзеля захавання палітычнай лаяльнасці ўладароў маёнткаў.

Адсутнасць на тэрыторыі другога і трэцяга падзелаў склаўшайся расійскай адміністрацыйнай сістэмы прывяло да таго, што секвестр маёнткаў ажыццяўляўся пры дапамозе вайсковай сілы. Аб гэтым сведчаць інструкцыі Кацярыны II, адрасаваныя галоўнакамандуючаму расійскімі войскамі Мікалаю Рапніну: "Ва ўсім наваколлі войскамі, якімі вы камандуеце, маёнткі памешчыкаў павінны быць узяты ў секвестр..."[24]. У казённае кіраванне прадпісвалася браць не толькі зямельныя валоданні, але і іншую маёмасць паўстанцаў, у тым ліку мануфактуры з прыналежнымі да іх угоддзямі. Таксама ў секвестр бралася маёмасць паўстанцаў, якая знаходзілася ў гарадах – дамы, млыны і іншыя пабудовы. Прыклады канфіскацыі рухомай маёмасці (у першую чаргу капіталаў) ў 1794 г. не сустракаюцца. У адносінах да ўласнасці, што паступала ў казну, М. Рапнін быў надзелены самымі шырокімі паўнамоцтвамі. Як сведчыць кацярынаўскі рэскрыпт ад 30 лістапада 1794 г., галоўнакамандуючаму дазвалялася рабіць з ёй "усё тое, што казне карысным будзе"[25].

---

[21] Восстание и война 1794 года в Литовской... – С. 36.

[22] Жукович П. Сословный состав населения Западной России в царствование Екатерины II // Журнал Министерства народного просвещения, 1915, № 2. – С. 145.

[23] Рубинштейн С. Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии за 240 лет, с 1652 по 1892 г. Вильна, 1894. – С. 156.

[24] Восстание и война 1794 года в Литовской... – С. 40.

[25] LVIA. F. 1219, ap. 1, b. 133, l. 47.

Імкнучыся адабраць ва ўладароў, якія падтрымалі паўстанне, іх маёнткі як мага хутчэй, расійскае камандаванне было вымушана ахвяраваць на гэта пэўныя армейскія адзінкі, у якіх на тэатры баявых дзеянняў адчувалася нястача. "Без увядзення вайсковых каманд" – канстатаваў у лісце да М. Рапніна мінскі, ізяслаўскі, брацлаўскі губернатар Ц. Туталмін – "і секвестр маёнткаў будзе толькі марным абвяшчэннем"[26]. Фактычна ж прыняцце ў казённы нагляд таго ці іншага маёнтка пры дапамозе армейскіх частак вяло да яго цалкавітага спусташэння. Ужо 20 красавіка 1794 г. Савет пры "Найвышэйшым двары" прыняў пастанову, згодна з якой па меры прасоўвання расійскіх войск углыб краю належала маёнткі паўстанцаў браць у секвестр, а даходы з іх ужываць на пакрыццё ваенных выдаткаў. Як гэты ўказ выконваўся на практыцы, становіцца відавочна з інструкцыі М. Рапніна генералу Ота Дэрфельдэну. Між іншым апошняму прадпісвалася узяць маёнткі навагрудскага ваяводы Юзафа Несялоўскага і аднаго з Тызенгаўзаў у сваё кіраванне, "збожжа... выкарыстаць на правізію (корпуса), грошы, якія будуць... скарыстаць на пакупку правіянту і фуражу, быдла і авечак выкарыстаць для харчавання салдат колькі пану заўгодна будзе; сена забраць на фураж палкоў, а коней адаслаць на продаж у Нясвіж..."[27]. У дадзеным выпадку звяртае на сябе ўвагу той факт, што падобным чынам ваеннае камандаванне ў роўнай ступені распараджалася не толькі маёмасцю тых, хто раней склаў прысягу вернасці (як Тызенгаўз), але і тых, хто гэтага не зрабіў (як Ю. Несялоўскі). Такім чынам, у ходзе баявых дзеянняў на тэрыторыі другога і будучага трэцяга падзелаў асноўным крытэрыем прымянення секвестру да маёмасці той ці іншай асобы быў не факт парушэння прысягі, а яго асабісты ўдзел у паўстанні. Толькі пасля канчатковага задушэння нацыянальна-вызваленчай барацьбы палітыка царызму ў дачыненні да ўдзельнікаў паўстання і іх маёмасці пачынае змяняцца. Пры вызначэнні ступені пакарання пачынае стасавацца падзел на тых, хто ў акрэслены тэрмін склаў прысягу на вернасць імператрыцы, і тых, хто гэтага не зрабіў.

Вялікая роля надавалася ўладамі і праблеме даходаў, якія паступалі з секвестраваных маёнткаў. Праўда, распараджэнні па гэтым прадмеце часта мелі супярэчлівы характар. Непаслядоўнасць палітыкі ў вырашэнні дадзенага пытання прасочваецца ўжо на прыкладзе

[26] Энгель А. Архив виленского генерал-губернаторства: В 2 т. – Вильно, 1870–1872. – С. 174.
[27] Żytkowicz L. Rządy Repnina... – S. 349.

імператарскага ўказа ад 22 красавіка 1794 г. Як і ў папярэднім выпадку, калі рашэнне прымалася Саветам пры "Найвышэйшым двары", імператрыца дазваляла грошы з маёнткаў, якія знаходзіліся пад забаронай, выкарыстоўваць на пакрыццё неабходных для арміі паставак[28]. Аб тым, што менавіта так і паступалі з даходамі з секвестраваных валоданняў, сведчыць данясенне князя Барыса Галіцына, адрасаванае М. Рапніну: "Маёнткі, якія належаць такім памешчыкам, што ў мяцежным войску знаходзяцца і да цяперашняй польскай сістэмы прыхільнасць маюць, загадаў я…секвестраваць і даходы з іх збіраць, якімі выдаткі на закупку правіянту і фуражу грошы часткова заменены быць могуць"[29]. Разам з тым у згаданым ужо ўказе Кацярыны II, а таксама іншых, больш пазнейшых яе распараджэннях секвестраваныя даходы загадвалася накіроўваць непасрэдна ў казну. Грошы, накіраваныя ў казённыя палаты, захоўваліся там да часу вырашэння лёсу самога маёнтка. Пасля прыняцця адпаведнага рашэння, яны разам з зямельным валоданнем альбо вярталіся старому гаспадару, альбо адыходзілі да новага ўладара[30].

Налажэннем секвестру на зямельныя валоданні ўдзельнікаў паўстання займаліся часткі пад камандаваннем князя Паўла Цыцыянава, князя Барыса Галіцына, Багдана Фёдаравіча Кнорынга. Так, апошнім падчас ваеннай кампаніі 1794 г. быў узяты ў казённы нагляд маёнтак актыўнага прыхільніка паўстання падкаморыя Ф. Каменскага ў Лідскім павеце, а ў Вільні ён непасрэдна кіраваў аддачай у арэнду секвестраванай нерухомай маёмасці падскарбія Міхала Клеафаса Агінскага[31]. Пасля ўзяцця таго ці іншага маёнтка ў секвестр, ваенныя чыны на працягу пэўнага часу ажыццяўлялі не толькі нагляд за ім, але і непасрэднае кіраванне. Толькі ў 1795 г. губернскае начальства ў якасці адміністратараў такіх маёнткаў на тэрыторыі другога падзелу пачало выкарыстоўваць памешчыкаў "з нацыянальных", звяртаючы пры гэтым у першую чаргу ўвагу на тых, "каторыя вылучаюцца ў адданасці манаршаму прастолу і шчырасцю"[32].

Для барацьбы з паўстанцамі і іх прыхільнікамі ваенным камандаваннем была арганізавана актыўная прапагандысцкая кампанія. Адным з яе элементаў было выданне спецыяльных адозваў на польскай

[28] Восстание и война 1794 года в Литовской… – С. 40.
[29] LVIA. F. 378, ap. 1, b. 15, l. 39.
[30] LVIA. F. 378, ap. 1, b. 17, l. 34; F. 375, ap. 2, b. 76, l. 3.
[31] LVIA. F. 378, ap. 1, b. 29, l. 4; F. 1219, ap. 1, b. 38, l. 80.
[32] Нацыянальны гістарычны архіў (НГАБ). Ф. 333, воп. 1, спр. 9[а], арк. 75.

мове да мясцовага насельніцтва. У гэтых афіцыйных зваротах побач з пагрозай прымянення вайсковай сілы супраць тых, хто выкажа непаслушэнства расійскім уладам, прысутнічала пагроза секвестравання маёмасці. Напрыклад, М. Рапнін падчас свайго ўступлення ў Літву папярэджваў мясцовых жыхароў аб неабходнасці выконваць прадпісаныя пастаўкі на карысць расійскай арміі, у адваротным выпадку пагражаў "апісаннем маёмасці і адабраннем усяго". Генералмаёр Багдан Кнорынг пасля атрымання паведамлення аб паўстанцах, што хаваліся па лясах, загадаў па ўсёй акрузе распаўсюдзіць улёткі, у якіх быў вызначаны тэрмін вяртання інсургентаў на месца жыхарства. У адносінах да тых, хто не прыняў гэты ультыматум, загадвалася выкарыстаць вайсковую сілу і канфіскацыю. Князь П. Цыцыянаў пасля задушэння паўстання ў сваім пісьмовым звароце да жыхароў Гародні нагадваў, што любое супраціўленне ці спроба арганізацыі змовы з боку кожнага жыхара прывядзе да секвестру ўсёй яго маёмасці[33]. Усе гэтыя факты дазваляюць зрабіць выснову, што ў адрозненне ад 1772 г., калі секвестр ужываўся толькі ў дачыненні да маёнткаў, якія намінальна лічыліся нічыйнымі з-за таго, што іх уладары не склалі прысягі новаму гаспадару, у 1794 г. улады пачалі выкарыстоўваць секвестр непасрэдна як меру рэпрэсіўную і прэвентыўную.

У сувязі з актыўнымі дзеяннямі па секвестрацыі маёмасці ўдзельнікаў паўстання да казны павінны былі перайсці толькі ў межах Літоўскай губерні звыш 175 тысяч душ. Па Мінскай губерні секвестр закрануў 16% усіх сялян[34]. Не засталася па-за ўвагай уладаў маёмасць паўстанцаў, якая знаходзілася на тэрыторыі першага падзелу. Імянным указам Кацярыны ад 12 мая 1794 г. у Полацкай і Магілёўскай губернях на маёнткі некаторых асоб, якія абвінавачваліся ва ўдзеле ў паўстанні (Аляксандра Пацэя, Францішка Сапегі і інш.), было загадана накласці секвестр. Падобнаму абмежаванню ў сваіх маёмасных правах былі падвергнуты ўсе землеўладальнікі, што на той час знаходзіліся ў Польшчы. Даходы з гэтых зямельных уладанняў накіроўваліся ў мясцовыя казённыя палаты. У выніку такіх дзеянняў пад нагляд казны толькі ў Полацкай губерні, на

[33] Сборник императорского Русского... Т.16. – С. 9; Станкевич А. Очерк возникновения русских поселений на Литве. Вильна, 1909. – С. 194; LVIA. F. 378, ap. 1, b. 16, l. 17.

[34] Анішчанка Я. Інкарпарацыя Беларусі ў Расійскую імперыю за Кацярынаю II // Спадчына, 1996, № 3. – С. 65; Анішчанка Я. Інкарпарацыя: Літоўская правінцыя ў падзелах Рэчы Паспалітай. Мінск, 2003. – С. 293.

тэрыторыі якой у 1794 г. не было ваенных дзеянняў, перайшло больш за 30 тысяч сялянскіх душ[35].

Далейшы лёс секвестраваных маёнткаў вырашаўся на самым вышэйшым узроўні. Як сведчыць Ц. Туталмін імператрыца шмат дзён правяла за разглядам папер, якія датычыліся секвестраваных маёнткаў. Сустрэчы з вышэйшымі пецярбургскімі саноўнікамі дазволілі яму зрабіць выснову аб тым, што спадчынныя маёнткі у адпаведнасці з існуючым расійскім заканадаўствам хутчэй за ўсё будуць вернуты іх ранейшым гаспадарам[36]. Да падобнага рашэння напачатку схілялася і сама імператрыца. 19 красавіка 1795 г. адбылося пасяджэнне Савета пры "Найвышэйшым двары" ў Санкт-Пецярбурзе, на якім "чытаны былі ведамасці аб маёнтках у губернях Мінскай, Ізяслаўскай і Брацлаўскай... што належаць пад рознымі назвамі палякам, якія ўдзельнічалі ў польскім бунце...". Прыняццю рашэння па гэтым пытанні на пасяджэнні папярэднічаў старанны аналіз заканадаўства, якое існавала па гэтым прадмеце як у імперыі, так і ў Рэчы Паспалітай. У выніку падобнага абмеркавання, большасць членаў Савета выступіла за правядзенне канчатковай канфіскацыі толькі набытых маёнткаў у асоб, якія актыўна ўдзельнічалі ў паўстанні альбо з'ехалі за мяжу. Прымаючы такое рашэнне, Савет кіраваўся тым, што згодна з адпаведнымі артыкуламі "Дарчай граматы расійскаму дваранству" 1785 г., нормы якой распаўсюджваліся і на новадалучаныя губерні, забаранялася адбіраць у казну ў шляхетнага саслоўя спадчынныя маёнткі. Таму і першапачатковы варыянт пастановы па гэтым пытанні выглядаў наступным чынам: "...Азначаныя спадчынныя маёнткі павінны быць аддадзены спадчыннікам іх, калі яны самі ў віне ўдзелу не прымалі..."[37]

Аднак замацаванню гэтага рашэння ў якасці канчатковай пастановы перашкодзіла ўмяшальніцтва Аляксандра Безбародкі, обергафмайстра і адной з найбольш уплывовых асоб у дзяржаўным апараце, і, напэўна, прага членаў Савета да магчымых зямельных наданняў. Ступень асабістай зацікаўленасці дзяржаўных дзеячаў у гэтым пытанні выкрываюць прызнанні самога А. Безбародкі: "Адзіны мой зараз клопат, каб атрымаць вёскі… і з гэтае прычыны пераношу я свой стан…"[38] Тыя ж лісты А. Безбародкі выдаюць вялікую

[35] РГИА. Ф. 1400, оп. 1, д. 92, л. 1-2.
[36] Сборник императорского Русского... Т.16. – С. 156.
[37] РГИА. Ф. 1146, оп. 1, д. 17, л. 88.
[38] Архив князя Воронцова. Кн. 13. Москва, 1879. – С. 344.

заангажаванасць іншых пецярбургскіх саноўнікаў у справе секвестраваных маёнткаў. Таму не дзіва, што асобна пададзеная думка А. Безбародкі з прапановай пазбавіць памешчыкаў, што прынялі ўдзел у паўстанні, магчымасці карыстацца правамі расійскага дваранства як асоб, якія не заслугоўваюць гэтага, прымяніць да іх нормы статута ВКЛ, якія прадугледжвалі канфіскацыю і набытых, і спадчынных маёнткаў, знайшла падтрымку большасці ў Савеце.

Указ ад 3 мая 1795 г. на імя генерал-губернатара Ц. Туталміна расставіў ўсе кропкі над "і" ў праве маёмасці ўдзельнікаў паўстання. Сярод іншага, гэтым указам прадпісвалася ўзяць у казну маёмасць тых асоб, якія, прыняўшы расійскае падданства, удзельнічалі ў паўстанні. Пазбаўляліся права валодання маёнткамі і тыя, хто не паспеў вярнуцца ў край да 1 студзеня 1795 г. Такім асобам, што праўда, дазвалялася прадаць сваю маёмасць у межах Расійскай імперыі. Тэрмін жа на правядзенне падобных аперацый абмяжоўваўся 1 годам і 6 месяцамі. У выпадку, калі асоба не паспявала здзейсніць продаж, яе маёмасць прадпісвалася браць ва ўласнасць казны[39]. Як сведчаць адпаведныя ведамасці, такія маёнткі на тэрыторыі другога падзелу складалі пераважную большасць у агульнай масе секвестраваных. Аднак канчаткова да казны трапілі адзінкі. Куды больш было зямельных валоданняў, гаспадары якіх пад пагрозай канфіскацыі былі вымушаны тэрмінова прадаваць сваю зямельную ўласнасць[40].

Рашэнне Савета пры "Найвышэйшым двары" ад 19 красавіка было даволі спрэчным як з прававога, так і з маральнага пункту гледжання. Несправядлівым яго лічыў М. Рапнін, які словам і справай выступаў увогуле супраць канфіскацый. Аўтарытэт гэтага саноўніка быў настолькі вялікім, што яго калега Ц. Туталмін, якому былі падараваны зямельныя ўладанні на падпарадкаваных яму тэрыторыях, быў вымушаны ў ліслівым тоне тлумачыцца перад літоўскім генерал-губернатарам. Ён пісаў, што ў справе секвестру маёнткаў удзельнічаў не болей, чым таго вымагалі абавязкі пасады, якую ён займаў.

Факт раздачы канфіскаваных прыватных маёнткаў быў неадназначна ўспрыняты элітай расійскага грамадства. Так, напрыклад, барон Іван Ферзен катэгарычна адмовіўся прымаць канфіскаваныя ў Тадэвуша Чацкага маёнткі, папрасіўшы замяніць іх на дзяржаўныя землі. Тыя, хто ўсё ж такі атрымалі былыя прыватнаўласніцкія маёнткі,

[39] Архив Государственного Совета. Т. 1, ч. 1: Совет в царствование Екатерины II. Отделение историческое. СПб., 1869. – С. 45-46.

[40] РГИА. Ф. 1374, оп. 2, д. 969, л. 68, 70.

адчувалі пэўную няёмкасць перад іх ранейшымі гаспадарамі. Былі выпадкі, калі такія асобы (як, напрыклад, графіня Аляксандра Браніцкая і Ц. Туталмін) выступалі ў ролі абаронцаў правоў людзей, чыю маёмасць яны атрымалі ў падарунак[41]. Той жа М. Рапнін прадэманстраваў надзвычайную актыўнасць у справе вяртання маёнткаў князя Адама Казіміра Чартарыйскага. За сваіх былых суайчыннікаў заступіліся Ян і Міхал Касакоўскія, якія сустракаліся ў Санкт-Пецярбургу з прадстаўнікамі ўладнай партыі Платона Зубава[42]. Дзеля адстойвання сваіх маёмасных правоў у расійскую сталіцу пасняшаліся некаторыя ўладары прызначанай да канфіскацыі маёмасці. Частцы з іх удалося рознымі шляхамі даказаць сваю неналежнасць да паўстання ці неабгрунтаванасць накладання секвестру на іх маёмасць. С. Забеле маёмасць вярнулі "па яго састарэласці", М. Радзівілу – таму, што ён выявіў "непахісную да прастола яе імператарскай вялікасці адданасць" і г. д.[43] У справе адстойвання маёмасных інтарэсаў найбольш уплывовых магнатаў былі задзейнічаны міжнародныя каналы, уплыў некаторых еўрапейскіх двароў[44].

Захады вярхушкі шляхты і магнатэрыі па перагляду спраў аб канфіскацыі далі свой плён. З канца 1794 г. пачаўся працэс вяртання раней секвестраваных маёнткаў. Аднымі з першых атрымалі назад свае валоданні тыя, што былі пазбаўлены маёнткаў у адпаведнасці з указам ад 22 красавіка 1794 г. Як высветлілася, некаторыя асобы ў час паўстання знаходзіліся за мяжой і не мелі да яго непасрэднага дачынення. Падчас распачатага працэсу вяртання маёнткаў, улады сутыкнуліся з пэўнымі праблемамі. Найперш яны вынікалі з таго, што маёмасць некаторых, што атрымалі амністыю, была ўжо падараваная іншым асобам. У такіх выпадках губернскім уладам дзеля задавальнення інтарэсаў былых гаспадароў прадпісвалася знаходзіць зямельныя ўладанні, суразмерныя раней адабраным[45].

У некаторых выпадках вяртанне маёнткаў, якія паступілі ў казённае кіраванне, адбывалася ў два этапы. Пэўнай стадыяй на шляху да поўнага вяртання раней узятай у секвестр маёмасці стала апека. Такая мера была выкарыстана, па-першае, у адносінах да ўласнасці тых, хто

---

[41] Сборник императорского Русского… Т. 16. – С. 291, 348.
[42] Żytkowicz L. Rządy Repnina… – S. 337.
[43] Анішчанка Я. Інкарпарацыя Беларусі ў... – С. 62.
[44] Агінскі М.-К. Мемуары пра Польшчу і палякаў з 1795 да 1810 г. // ARCHE, 2015, № 9. – С. 145.
[45] LVIA. F. 1219, ap. 1, b. 124, l. 5.

ў час паўстання быў на першых ролях і не мог адразу разлічваць на ласку імператрыцы. Вядома, што ў апеку была ўзята маёмасць былога старшыні Найвышэйшай Літоўскай Рады Ю. Несялоўскага, галоўнакамандуючага паўстанцкімі войскамі ў Літве Ф. Сапегі, А. К. Чартарыйскага, ад'ютанта Якуба Ясінскага – А. Пацэя і некаторых іншых[46]. Прымяненне апекі азначала, што да прыняцця канчатковага рашэння азначаныя асобы не мелі права распараджацца і кіраваць сваімі маёнткамі. Аднак ад забароны ці секвестру апека адрознівалася тым, што нагляд за маёнткам пераходзіў не да дзяржавы, а да апекуноў – прыватных асоб, звычайна з ліку сваякоў, чые кандыдатуры спачатку павінны былі быць зацверджаны вышэйшым расійскім камандаваннем. Па-другое, частка грошай з зямель, якія знаходзіліся пад апекай, выдаткоўвалася на ўтрыманне ўладароў маёнткаў, рэшта – да часу захоўвалася.

Працэс канчатковай канфіскацыі ў значнай ступені ўскладняўся тым, што большасць секвестраваных маёнткаў была абцяжарана значнымі даўгамі. Некаторыя памешчыкі бралі грошы пад заклад сваіх маёнткаў у эміграцыі пасля паражэння паўстання, калі іх уладанні былі ўжо секвестраваны ці нават падараваны іншым асобам[47]. Частка даследчыкаў лічыць, што наяўнасць значных даўгавых абавязкаў з'явілася галоўнай перашкодай на шляху канчатковай канфіскацыі большасці маёнткаў[48]. Між тым распараджэнні расійскіх імператараў па гэтым прадмеце сведчаць аб іншым. У сваім прадпісанні да М. Рапніна ў снежні 1795 г. Кацярына II выказалася за тое, каб "…даўгі, што лічацца за маёнткамі, якія паступаюць у казну Нашу… такія даўгі, несумненна, павінны лічыцца сапраўднымі, і справядлівасць патрабуе, каб пазыкадаўцы, як бязвінныя… у атрыманні ім наступнага былі забяспечаны"[49]. Наступны расійскі імператар пайшоў у гэтым кірунку яшчэ далей. 27 чэрвеня 1797 г. ім была выдадзена пастанова аб прыняцці на казённы рахунак даўгоў, што былі зроблены "польскімі баярамі" падчас іх знаходжання ў эміграцыі, а менавіта, у Галандыі.

На працягу 1795–1796 гг. на тэрыторыі другога падзелу былым уладарам было вернута прыкладна $^2/_3$ секвестраваных маёнткаў і $^3/_4$

---

[46] Сборник императорского Русского… Т. 16. – С. 111, 143.
[47] LVIA. F. 378, ap. 1, b. 29, l. 1, 22-25.
[48] Анішчанка Я. Інкарпарацыя Беларусі ў... – С. 62.
[49] Сборник императорского Русского… Т. 16. – С. 106.

секвестраваных староствaў[50]. Канчаткова да казны ў межах Мінскай губерні перайшлі толькі 13 прыватнаўласніцкіх маёнткаў, якія раней належалі 10 гаспадарам, і ў якіх налічвалася каля 10 тысяч сялян мужчынскага полу[51] (табл. 1).

**Табліца 1**

***Колькасць прыватнаўласніцкіх маёнткаў, канфіскаваных пасля паўстання 1794 г.***

| *Імя гаспадара* | *Назва маёнтка* | *Павет* | *Колькасць душ* |
|---|---|---|---|
| Агінскі М.-К. | Ілья, Ракаў | Вілейскі | 4710 |
| Аскірка Я. | Барбараў | Мазырскі | 1396 |
| Аскірка Я. | Канатопь | Мазырскі | 179 |
| Аскірка Я. | Кажушкі | Рэчацкі | 379 |
| Гарадзенскі Т. | Вержня | Пастаўскі | 511 |
| Гараін Я. | Касцяневічы | Пастаўскі | 403 |
| Гелгуд І. | Казімір | Бабруйскі | 669 |
| Зянковіч І. | Верашчаты | Пастаўскі | 347 |
| Зянковіч К. | Валакаты | Пастаўскі | 1224 |
| Мірскі С. | Манковічы | Дзісненскі | 92 |
| Прыбор А. | Маладушы | Мазырскі | 60 |
| Тызенгаўз А. | Бобрык | Пінскі | 323 |

У выніку секвестрацыі ў Мінскай губерні ў дзяржаўную ўласнасць перайшлі 7 староствaў і эканомій з агульнай лічбай каля 7225 сялянскіх душ. Акрамя таго канфіскацыі было падвергнута Забалоцкае староства, якое знаходзілася на тэрыторыі першага падзелу і належала харунжаму Антону Тызенгаўзу[52] (табл. 2).

---

[50] Жукович П. Сословный состав населения … // Журнал Министерства народного просвещения, 1915, № 2. – С. 135, 150.

[51] НГАБ. Ф. 299, воп. 2, спр. 56, арк. 5-6; Ф. 333, воп. 1, спр. 160, арк. 238; РГИА. Ф. 1374, оп. 2, д. 969, л. 98-112; Жукович П. Сословный состав населения …// Журнал Министерства народного просвещения, 1915, № 2. – С. 139-140.

[52] НГАБ. Ф. 299, воп.. 2, спр. 56, арк. 6-7; РГИА. Ф. 1374, оп. 2, д. 969, л. 98-112; Жукович П. Сословный состав населения … // Журнал Министерства народного просвещения, 1915, № 2. – С. 145-146.

**Табліца 2**

***Колькасць староствах і экономій, канфіскаваных пасля паўстання 1794 г.***

| *Імя гаспадара* | *Назва староства* | *Павет* | *Колькасць душ* |
|---|---|---|---|
| Агінскі М.-К. | Пінскае | Пінскі | 3995 |
| Даўнароўская | Даманавіцкае | Мозырскі | 314 |
| Еленьскі Ц. | Якімавіцкае | Пастаўскі | 563 |
| Кіцкі А. | Халанішчэўскае | – | 231 |
| Коцел Т. | Маркоўскае | Вілейскі | 777 |
| Панцэржанскі | Азарыцкае | Мозырскі | 656 |
| Пац І. | Вілейскае | Вілейскі | 689 |

На тэрыторыі трэцяга падзелу памеры секвестру былі непараўнальна меншымі, чым на тэрыторыі другога падзелу. У межах Літоўскіх губерняў вядомы прозвішчы толькі 24 асоб, чыя маёмасць у час паўстання была падвергнута секвестру[53]. Пасля задушэння паўстання большая частка зямельных валоданняў была вернута былым гаспадарам. У дзяржаўным фондзе засталіся маёнткі толькі тых асоб, якія ў 1793 г. разам з жыхарамі другога падзелу склалі прысягу вернасці рускаму прастолу. У часы Паўла І усе падобныя секвестраваныя спадчынныя маёнткі былі вернуты ранейшым уладальнікам.

Асноўная маса канфіскаваных зямельных валоданняў была выкарыстана Кацярынай ІІ для адорвання асоб, набліжаных да прастола. Расійская імператрыца распачала раздаваць маёнткі на далучаных пасля другога падзелу землях ужо 2 верасня 1793 г., калі сейм у Гародні яшчэ канчаткова не зацвердзіў новы падзел Рэчы Паспалітай. Такая паспешлівасць, на думку рускага гісторыка Васіля Сямеўскага, пры хуткай змене палітычных абставін магла б паставіць урад у цяжкае становішча[54]. Няпэўнасць маёмасных правоў новых уладальнікаў пацвердзіла нацыянальна-вызваленчае паўстанне, якое на два гады адцягнула канчатковае вырашэнне гэтага пытання.

Згодна з традыцыяй, прэтэндэнты напярэдадні праяўлення чарговай "вышэйшай ласкі" самі падавалі імператрыцы пісьмовыя "заявы", дзе паведамлялі, якую колькасці душ яны хацелі б атрымаць. Далейшае размеркаванне будучых адорванняў не абыходзілася без інтрыг на самым вышэйшым узроўні, у якіх апошняе слова звычайна заставала-

---

[53] Żytkowicz L. Rządy Repnina... – S. 349-356.

[54] Семевский В. Раздача населенных имений в царствование Екатерины II-й // Отечественные записки. 1877, № 8. – С. 208.

ся за фаварытам Кацярыны II – графам Платонам Зубавым. Канчатковае падараванне адбывалася ў форме асабістага ўказа імператрыцы, у якім адзначалася каму і за якія заслугі надаецца тая ці іншая колькасць сялян, пры гэтым дакладнае месца валодання ўказвалася не заўсёды. У такім выпадку пошукамі і вызначэннем канкрэтнага месцазнаходжання маёнтка займалася мясцовае начальства. І на губернскім узроўні не абыходзілася без барацьбы за лепшы кавалак. Як правіла, прасіцелі не вельмі цырымоніліся. Так, А. Безбародка праз Рыгора Міларадавіча “па-сяброўску” прасіў выбраць яму “тысячы 3-4 душ, каб яны былі значныя, а не кепскія, не далёкія...” і г. д.[55]. Найбольш яскравым прыкладам тут можа служыць перапіска П. Румянцава-Задунайскага з М. Рапніным. Атрымаўшы з Брэсцкай эканоміі ў сваё валоданне Пружанскі ключ, П. Румянцаў усімі магчымымі сродкамі намагаўся далучыць да гэтых уладанняў частку Белавежскай пушчы, у якой існавалі дзіўныя для Расіі “дзікія каровы”. Урэшце-рэшт яго ўпартасць і настойлівасць узялі верх – і да яго асноўных валоданняў быў прыпісаны кавалак брэсцкага лясніцтва, дзе вадзіліся зубры.

Падчас ўступлення ў свае правы новыя ўладары падараванага маёнтка павінны былі выплачваць казне некаторую грашовую суму, велічыня якой залежала ад колькасці сялян. Напрыклад, у беларускіх і ўкраінскіх губернях да 1794 г. за адну душу ўносілася 15 капеек (у той час як у іншых рэгіёнах імперыі 25 капеек). Указам імператрыцы ад 23 чэрвеня 1794 г. расцэнкі на падараваных сялян не залежна ад месца іх знаходжання павышаліся да 50 капеек за душу[56].

Усяго ў часы Кацярыны II за кошт прыватнаўласніцкіх, старасцінскіх, манастырскіх і епіскапскіх земляў у Мінскай губерні былі адораны 42 асобы, агульная лічба раздадзеных сялян склала звыш 38 тысяч душ[57]. З іх каля 45% сялян паходзіла з канфіскаваных спадчынных ці старасцінскіх маёнткаў. Большасць з гэтых наданняў – каля 90 %, прыпадае на 18 жніўня 1795 г. У гэты дзень расійская імператрыца падпісала ўказы аб узнагароджанні зямельнай маёмасцю 70-ці асоб, якія атрымалі ў сваё валоданне ў “губернях ад Польшчы далучаных” каля 104 тысяч душ[58]. Буйныя зямельныя падараванні адбываліся і ў наступным годзе. Сярод маёмасці, якая канчаткова

[55] Сборник императорского Русского... Т. 29. – С. 249.
[56] НГАБ. Ф. 333, воп. 1, спр. 126, арк. 100.
[57] Жукович П. Сословный состав населения ... // Журнал Министерства народного просвещения, 1915, № 2. – С. 139-142, 145-146.
[58] Семевский В. Раздача населенных имений... – С. 208.

паступіла ў казну, падобнага лёсу пазбегла не шмат маёнткаў. Толькі невялікая частка канфіскаванай маёмасці была выкарыстана дзяржавай для уласных інтарэсаў. Так, у скарбовым валоданні ўлады пакінулі частку жылой забудовы Міхала Клеафаса Агінскага, якая знаходзілася ў Вільні і Слоніме, і якая была выкарыстана ўладамі пад губернскія ўстановы[59].

Падводзячы вынікі рэпрэсіўным захадам царызму падчас і пасля задушэння паўстання 1794 г., неабходна адзначыць, што ў гэты час была закладзена прававая падстава будучага стасавання канфіскацыі на далучаных тэрыторыях. Па-другое, у ходзе правядзення канфіскацый былі акрэслены галоўныя функцыі гэтай меры пакарання (прэвентыўная і рэпрэсіўная). Па-трэцяе, вызначаны асноўны склад злачынстваў, за якія ўжывалася канфіскацыя (дэ-юрэ – за непрынясенне ці парушэнне вернападданніцкай прысягі, дэ-факта – яшчэ і за ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху), а таксама рэгіён яе стасавання – заходнія губерні імперыі. Прымяненне канфіскацый у гэты перыяд прывяло да ўзнікнення на тэрыторыі Беларусі буйнога расійскага землеўладання, скарачэння лічбы дзяржаўных і росту колькасці прыватнаўласніцкіх сялян. Таксама неабходна адзначыць, што значнае месца ў сістэме рэпрэсіўных мер супраць удзельнікаў паўстання адводзілася ссылцы. У дадзеным канкрэктным эпізодзе назіраюцца юрыдычныя падставы будучага выкарыстання гэтай формы рэпрэсій супраць удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху: стварэнне адмысловай камісіі для разбору іх віны, размеркаванне па некалькіх катэгорыях, а таксама дыферынцыяваныя прававыя падыходы ў вырашэнні лёсу ваеннапалонных паўстанцаў і тых, чые справы разглядаліся судовымі органамі. Акрамя таго, нельга не адзначыць, што пасляпаўстанцкая ссылка 1794–1795 г. адыграла значную ролю ў фарміраванні сібірскага міфу.

---

[59] LVIA. F. 378, ap. 1, b. 29, l. 4.

*Гладышчук А.А. (Брэст)*

# КАСЦЮШКАЎСКАЕ ПАЎСТАННЕ 1794 ГОДА ВАЧЫМА ЮЛЬЯНА УРСЫН НЯМЦЭВІЧА

У артыкуле прыводзяцца вытрымкі ўпершыню перакладзеннага на беларускую мову, але не выдадзеннага, тэкста аб Касцюшкаўскім паўстанні 1794 года з двух выданняў "Pamiętniki czasów moich" Юльяна Урсын Нямцэвіча, забачыўшых свет адпаведна ў 1848 і 1957 гг. [1; 2]. У працы зроблена спроба аб'яднання тэкстаў гэтых двух выданняў, якія апавядаючы аб адных і тых жа падзеях, адрозніваюцца сваім зместам. Такім чынам беларускае гучанне вядомай падзеі, удзельнікам якой быў Ю. У. Нямцэвіч, набыло змястоўнае ўзбагачэнне.

Юльян Урсын Нямцэвіч нарадзіўся ў Скоках каля Берасця. Ён сам аб гэтым піша: "Нарадзіўся я 16 лютага 1758 года ў Скоках над ракою Лясною, у маёнтку на адлегласці вялікай мілі ад Брэста Літоўскага, ад Марцэля Урсын Нямцэвіча і Ядвігі з Сухадольскіх" [паводле: 3, с. 15].

Калі выбухнула паўстанне ў Польшчы, Ю. У. Нямцэвіч знаходзіўся ў міграцыі ў Італіі. Але пачуўшы пра пачатак паўстання заспяшаўся на радзіму. Яго сустрэча з Тадэвушам Касцюшкам адбылася ў лагеры паўстанцаў пад Рогавым: "Прабіраючыся да Казеніц мужыцкамі падводкамі, даведаўшыся, дзе знаходзіцца Касцюшка, забралі пошту і адправіліся да яго лагера, калі не памыляюся, пад Рогавым, размешчанага сярод цёмнага бору, там і знайшлі яго.

Прыняў мяне як сваяка (!) і сябра, а калі я яго запытаў, куды мне загадае падацца і які вызначыць абавязак:

– Застанешся пры мне, – сказаў ён, – і заменіш Ліноўскага, які вырываецца да Варшавы.

Аляксандр Ліноўскі, чалавек красамоўны, прыдатны, але з высока неабмежаванай фанабэрыяй, ад самага Кракава выконваў пры Касцюшку пасаду – як тады гаварылі – сакратара дзяржавы і даверанай асобы. Начальнік яго пасаду даверыў мне. Такім чынам, гэтыя знакамітыя абавязкі зваліліся цяпер на мяне і адтуль стала і неразлучна ад Касцюшкі трымаўся я яго верна аж да хвіліны, у якую і ён, і я, цяжка параненымі, дасталіся ў маскоўскія рукі пад Мацяёвіцамі, аж да высадкі потым на беразе Філадэльфіі; не разлучаўся я з ім аж да дня, у якім ён пакінуў Амерыку…" [1, s. 208; 2, s. 85]

І Касцюшкі, і Нямцэвічы адносіліся да берасцейскай шляхты, таму не дзіўна, што праз сумесныя шлюбы яны з'ўляліся сваякамі, хай і

далёкімі, але сваякамі, на што адназначна паказвае сам Ю.У. Нямцэвіч. Гэтая жыццёвая дробязь, а можа і зусім ня дробязь, адыграла важную ролю ў адносінах паміж Тадэвушам і Юльянам на працягу ўсяго паўстання. З гэтай нагоды цікава пазнаёміцца са сціплай характэрыстыкай, якую даў Ю.У. Нямцэвіч кіраўніку паўстання: "Акрамя заслуг і адвагі, Касцюшка паходзіў, што праўда, са шляхты даўняй, але не маёнтнай. Ні багаццем, ні прагаю прасунуцца, ні нават б'ючым у вочы талентам непадахвочваў ён іншых да няшчаснай злоснасці і зайздрасці. Выхаваны ў рыцарскай школе кадэтаў за кошт князя Адама Чартарыйскага, генерала зямель падольскіх, быў пасланы да Парыжа, каб удасканаліцца там у ваеннай навуцы і інжынерыі. Пасля павароту ў Варшаву, нешчаслівае яго каханне да панны Сасноўскай, дачкі гетмана польнага літоўскага, прымусіла яго пакінуць радзіму. Падаўся ён у Амерыку, дзе ўласна зачалася вайна за незалежнасць тых правінцый. На працягу ўсёй гэтай вайны служыў з вялікаю годнасцю, прымаў удзел у бітвах пад Саратогай, Трэнтонам, Вестпойнтам. Пасля падпісання міра вярнуўся ён на айчыну, дзе пасля павелічэння войска быў узведзены ў званне брыгаднага генерала" [1, s. 198].

Не пагружаючыся ў дэталі паўстання, заўважым, што Начальнік паўстання быў часта сур'ёзна заклапочаны тымі падзеямі, якія суправаджвалі само паўстанне. Гэта асабліва яскрава праявілася на рэвалюцыйных падзеях у самой Варшаве. Адсюль няпростыя, а хутчэй, непаразумелыя адносіны паміж ім і адным з лідараў паўстання Гуго Калантаем: "Яшчэ ў Фалентах, ужо пад Варшавай, дашло да Начальніка паведамленне аб вышэй узгадваемых у Варшаве падзеях. Але не скончылася на гэтым. Пад'южваючае асляплёнымі чыннікамі і ўсялякімі паклёпнікамі, што вышэй стаялі ў грамадскай думцы, народжаныя габрэямі, адзін з якіх прыняў імя Дэмбоўскі, а другі – Канопка, простанароддзе зачало збірацца натоўпам, абвінавачваючы (хто ж ужо гаварыў бы!) яшчэ нядаўна так любімага Калантая. Ёсць падазронасць, што схілілі да гэтага маскалі, а можа і сам двор, злякаўшыся таго, каб Калантай не натварыў у Варшаве трагічных сцэн Парыжа, таму тую буру і паднялі супраць Калантая.

Як жа! Характар Калантая мог непакоіць многіх. Быў гэта чалавек, які валодаў усімі вартасцямі, што вялі да значнасці і славы. Жадаючы ўлады, скоры да ўнагароджання тых, хто яму сябе слепа ахвяраваў, мсцівы, няўмеючы даравацъ крыўды, гатовы ўжыць усялякія спосабы, каб сцерці ў пыл тых, хто яму перашкаджаў. Словам… другі Кромвель альбо Рышэлье.

Шмат клопату з ім нацярпеўся Касцюшка... Ведаю гэта добра, таму што на працягу ўсёй рэвалюцыі неадступна быў з Касцюшкам і спалі ў адным намёце (!).

Успомніў я пра біскупа Скаршэўскага, прыгаворанага да смерці і аб моцных умяшаннях у гэтую справу. Дык вось, сам кароль прыязджаў па гэтай справе ў лагер Касцюшкі, пасля – таксама нунцый папскі Літта, які даказваў, што ўжо два біскупы пакараны ганебнаю смерцю, што не прыстала вернаму Богу, высакароднаму польскаму народу, пераймаць раз'юшаную лютасць французаў. Касцюшка, хутчэй збянтэжаны, адказаў некалькімі неразборлівымі словамі, але рэшту дня быў моцна занепакоеным. Быў гэта чалавек пры вялікай адвазе лагодны, зусім не хацеў крыві, ноччу доўга мучыўся з сабою, не могучы заплюшчыць вачэй. Нарэшце запытаў у мяне, што я думаю аб справе Скаршэўскага, хіба абавязкова яго трэба вешаць?

– Не бачу ў гэтым неабходнасці, – адказаў я, – для прыкладу здраднікам ужо навешана нямала, падобныя экзекуцыі штораз больш раз'юшваюць люд, чым больш будуць на гэта яны глядзець, тым нахабней будуць станавіцца, і на падазроных, а можа і нявінных гэта пачне рушыцца, а агіда кінутая сёння на Робесп'ера і Марата і на нас упадзе. Уберажэм нашу рэвалюцыю, колькі гэта магчыма, вольнай ад лютасці абвінавачванняў.

– Маеш рацыю, – адказаў Касцюшка, – але што з ім рабіць?

– Ці не магчыма яго зляжыць з біскупства і на ўсё жыццё закрыць у турму?

– Маеш рацыю, так і зробім.

Неяк назаўтра адмяніў ён прыгавор. Скаршэўскі быў адсвячоны ад біскупства і застаўся замкнутым у турме. Пасля гэтага паведамлення Калантай не змог усядзець ад злосці, ён быў асабліва злосны на Скаршэўскага, што ў часы Таргавіцы прыняў аднятую ў Калантая малую каронную пячатку. Такім чынам, напісаў ён да Касцюшкі суровы ліст, зняважлівы, папіраючы яго недахопам энергіі, павольнасцю да двара і гэтак далей. Касцюшка быў так закрануты тым лістом, што адпісаў, што ён складае ўладу Начальніка. Тут клопат узнік для Калантая, ведаючы, як быў Касцюшка каханым усім народам, папулярным у прастога люду, забаяўся, такім чынам, што аддаленне правадыра народа будзе прыпісана яму. Дык вось, паміраўся ён з Начальнікам, аднак, глыбока ў сэрцы захаваў антыпатыю” [1, s. 210-212].

Другі эпізод, у якім апавядае Ю.У. Нямцэвіч аб генерале Заёнчаку, стварае карціну недаверу паміж Т. Касцюшкам і яго бліжэйшым асяроддзем, што магло вельмі адмоўна паўплываць не толькі на адносіны, але і на вынікі паўстання: “У час свайго аддалення ў Літву аставіў Касцюшка замест сабе галоўным ваеначальнікам пад Варшаваю генерала Заёнчака.

Калі б я сабе загадаў гэтыя ўспаміны пісаць з найадкрытнейшай шчырасцю, ненаўмысна нікога не хацеў бы ні асудзіць і не прабраць, то не змог бы тут замаўчаць таго, што мне сказаў варты адважны палкоўнік Крапінскі:

– Калі я, – казаў ён, – у адсутнасці Касцюшкі быў на дзённым дзяжурстве ў намёце Заёнчака, пасля доўгіх лісліваcцей Заёнчак вымавіў:

– Што ты скажаш пра нашага Начальніка? Як бездапаможны ўсе яго распараджэнні, як шкодная маруднасць з каралём, яго сям'ёй і сталькімі здраднікамі: не ўтрымаемся мы, калі іх спярша ўсіх не прыбярэш.

Аслупянеўшы, Крапінскі маўчаў, Заёнчак, не знайшоўшы ў ім чалавека адпаведнага сваім думкам, далей гаварыць таксама перастаў. Не ўспамінаў бы можа той акалічнасці, калі бы пазней учынкі генерала Заёнчака былі таму сведчаннем. Ужо тая брутава нянавісць да караля, ужо тыя правілы вольнасці і роўнасці былі шчырымі, ураджонымі ім. Але калі пазней гэты рыцар служыў слепа Напалеону, не хацеў насіць польскі мундзір, калі яшчэ да падзення Напалеона сваё вызваленства аддаў таму, хто панаваў, калі ўслых выказаўся ў Радзе, што нічым яму ёсць айчына і Польша, што нічога ад іх ён не мае, а ўсё толькі ад Напалеона і Аляксандра, калі, сёння ўдзельна пануючы, ён нішто не пачытае за святое, бачу, што, як не ведаў ён шмат іншых правіл, яе толькі ўласны інтарэс: «Evviva chi comanda» (няхай жыве, хто апавядае). Так абыходзіліся Шчэсны, Ржэвуцкі, Бранецкі, Сухаржэўскі: у поцісках іх была айчына, ва ўчынках – здрада. Хай застанецца гэтае навукаю для нашчадкаў…” [1, s. 217-218; 2, s. 105-106].

Яшчэ адзін факт недаверу Начальніка да бліжэйшага акружэння выплывае з таемнай спешнай паездкі пад Берасце пасля атрымання паведамлення аб адступленні Серакоўскага з пад Крупчыц: “Зараз жа, калі генерал Князевіч выйшаў на ўзмацненне Серакоўскага, да якога маў далучыцца і Панінскі, Начальнік, які паведаміў мне тайна, што назаўтра са святлом пусцімся мы толькі двое конна да злучаных

сціплых атрадаў Серакоўскага, то перацярпелі мы вечар у Варшаве ў прэзідэнта Закрэўскага. Маршалак Патоцкі, Мастоўскі, Каханоўскі і яшчэ некалькі старых добрых прыяцеляў знаходзілася там. Ніхто аб нашым заўтрашнім раннім падарожжы не ведаў, толькі ў мяне не выходзіла гэта з галавы…

Назаўтра, 6 кастрычніка 1794 года, зараз жа на досвітку мы ўжо былі на конях, абодва, як заўсёды на працягу ўсёй той вайны, у шэрых куртках вырушылі з лагера каля Макатова, пакінуўшы камандаванне генералу Заёнчаку…

А чацвёртай гадзіне па поўдні спаткалі мы разведчыкаў з корпуса генерала Серакоўскага, афіцэр нам паведаміў, што генерал Серакоўскі, адступаючы з пад Крупчыц, быў ноччу атакаваны Суворавым на Тэрэспальскіх грэблях праз Буг каля Брэста, з апошніх сіл адбіваючыся, яго разгубленыя рэшткі войска той ноччу большай часткаю ўцяклі, але ў той паніцы страцілі свае гарматы…” [1, s. 218; 2, s. 108]

Імкліва набліжаўся трагічны час Мацяёвіц: “Дзясятага кастрычніка 1794 года, у пятніцу, на самым досвітку ад'ютант ад службы Кунеўскі даў нам знаць, што вораг у баявых строях падступае да нас. Сціплае наша войска да яго падыходу хутка падрыхтавалася. Праз хвіліну мы ўжо былі на конях. Начальнік, убачыўшы ў нашым тыле вёску, асцерагаючыся, што яе могуць захапіць маскалі, загадаў яе запаліць. Ніколі не забуду таго жудаснага выгляду ад ахапіўшага вёску полымя, якое ўзносілася чорнымі клубамі дыма, сялян, жанчын з дзецьмі на руках, жывёлін, хатніх птушак, што ўцякалі ва ўсе бакі, плачаў і енкаў, што запаўнялі паветра...

Сам жа хутка наблізіўся да эскадрона брэст-літоўскіх паўстанцаў, сабраў іх у атрад і, падбадзёрыўшы, хутка кінуўся наперад, як раптам стралецкая куля разрывае мне наскрозь правую руку вышэй локця. Выпадае зброя з рукі, кроў хвошча моцна па мне і каню майму. Бяру Бога ў сведкі, што ўбачыўшы маю кроў, не выхваляюся, а шчыра прызнаюся, што першым маім пачуццем была не боль ад раны, а якаясь ганарыстасць – так скажу – якісь салодкі гонар, што кроў мая пралілася за абарону любай маёй айчыны. Здавалася мне, што, аплаціўшы ёй такім чынам свой доўг, ужо будучыя засмучэнні я перанясу лягчэй. Але тая радасць, тая патрыятычная пыха, хутка ўступіла месца смутку, калі ўбачыў поўны наш пройгрыш…

Але яшчэ жахлівейшае чакала нас відовішча. Уласна, будучы занепакоеным, распытваў усіх, што сталася з Касцюшкам? Маскоўцы паведалі мне, што ён загінуў у баі. Але паміж чацвёртай і пятай

гадзінамі вечара заўважылі мы атрад жаўнераў, які набліжаўся да галоўнай кватэры, нясучы на насілках з лазы пакалечанага чалавека. Быў гэта наш храбры, але няшчасны Начальнік Касцюшка. Уся яго постаць была заліта крывёю... Касцюшка атрымаў глыбокае рассячэнне галавы і дзве раны ад дзіды вышэй бёдзер, ледзьве дыхаў. Відовішча гэтае сціснула маё сэрца, слёзы пацяклі з вачэй, доўгае маўчанне перарваў плач і енк. Кінуўся я на бледнае цела і ад той хвіліны аж да той, у якой стаў замкнёным асобна ў пецярбургскай твердзі, не пакідаў яго і ні на момант…

Глухая ноч пасля гэтага няшчаснага дня была найбалючай ва ўсім маім жыцці! Ляжаў на саломе збоку Касцюшкі і ў сто раз пакутваў больш маральна, чым фізічна. Стаяла варта перад дзвярмі і ўнутры памяшкання. Натоўп маскоўцаў напаўняў дом, ужо паволі пачалі разыходзіцца, ужо пагасілі святло, калі гоман, змешаны з вясёлым смехам і выкрыкваннем сальнасцей, саступіў месца енкам і выраканням параненых і канаючых…

Світанне, нарэшце, разагнала цені той страшнай ночы. Касцюшка прачнуўся, як чалавек, прыведзены да прытомнасці пасля глыбокага летаргічнага сну. Убачыўшы мяне параненага каля сябе, запытаў:

– Што гэта ўсё значыць? Дзе мы?

– На жаль! – адказаў я, – мы параненыя і з’яўляемся маскоўскімі палонымі, я з табою і не пакіну цябе ніколі.

– Эх! Як жа, – вымавіў ён слабым голасам са слязьмі на вачах, – у няшчасці маім я ёсць шчаслівы, калі маю такога вернага сябра…” [1, s.222-227; 2, s.111-116.]

Змест рукапісу “Касцюшкаўскае паўстанне 1794 года вачыма Юльяна Урсын Нямцэвіча” складаецца з наступных частак: “Эміграцыя”, “Паўстанне”, “У Літве”, “Ад’ютант Касцюшкі”, “Аблога Варшавы”, “Верасень”, “Мацяёвіцы”, “Палон” і “Эскарт”. Яго друкаванне было б адметным падарункам як для айчыннай гістарыяграфіі, так і для памяці аб Тадэвушу Касцюшку і яго вернага сакратара і ад’ютанта Юльяна Урсын Нямцэвіча.

Літаратура:

1. Niemcewicz, J.U. Pamiętniki czasów moich. Dzieło pośmiertne / J.U. Niemcewicz. – Paryż, 1848. – S. 197-254.

2. Niemcewicz, J.U. Pamiętniki czasów moich / J.U. Niemcewicz. – Tom II. – Warszawa, 1957. – S. 59-139.

3. Гладышчук, А.А. Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі / А.А. Гладышчук. – Мінск, 2009. – 288 с.

*Мельнікаў І. В. (Мінск)*

# КАРАЛЬ МАРАЎСКІ: ЗАБЫТЫ ГЕНЕРАЛ ГІСТАРЫЧНАЙ ЛІТВЫ

Нарадзіўся Караль Мараўскі ў 1767 годзе ў маёнтку Завушша ля Нясвіжа. Яго бацькамі былі граф Ігнацій Мараўскі (1744-1790) і княжна Тэафілія Канстанцыя Радзівіл (1738-1818). Дзедам будучага генерала быў дзевяты Нясвіжскі ардынат Міхал Казімір Радзівіл "Рыбанька", а бабуляй - знакамітая пісьменніца, аўтар п'ес для тэатру ў Нясвіжы, Францішка Уршуля Радзівіл. Дарэчы, Караль Радзівіл "Пане каханку" будучаму вайскоўцу прыходзіўся дзядзькай [1, с. 315].

Бацька Караля служыў у асабістым войску Радзівілаў. Там ён і пазнаёміўся з Тэафіліяй. Хутка, у Львове, маладыя людзі абвянчаліся. Радзівілам не вельмі спадабаўся выбар княжны, але перашкаджаць браку "некаранаваня каралі" не сталі. Больш таго, "Пане каханку" паспрыяў таму, што Ігнацій Мараўскі атрымаў генеральскі патэнт, а княжна Тэафілія - у пажыццёвае ўладанне маёнтак Завушша. Хутка ў маладых нарадзіўся першанец, якога назвалі Каралем - у гонар дзядзькі [3].

Як і бацька, малады Мараўскі вырашыў зрабіць вайсковую кар'еру і паступіў на службу ў 2-гі пяхотны полк вялікай літоўскай булавы. У 1789 годзе яму прысвоілі званне палкоўніка і прызначылі камандзірам палка. Праз тры гады, у траўні 1792 года, 32-тысячная армія Расійскай імперыі (чатыры карпусы) перайшла межы гістарычнай Літвы. Наступ вёўся па некалькіх напрамках: на Вільню, Мінск, Нясвіж і Горадню. 31 траўня была захоплена сталіца ВКЛ. 10 чэрвеня 1792 г. рускія разбілі літоўскія войскі пад Стоўбцамі. У пачатку ліпеня адбылася крывапралітная бітва пад Берасцем, дзе супраць царскіх атрадаў змагалася дывізія войскаў ВКЛ пад камандаваннем, мінскага кашталяна, генерала-лейтэнанта войск ВКЛ Шымона Забеллы (пахаваны ў вёсцы Ізюмава пад Бабруйскам – І.М.). Дарэчы, гэты чалавек адзін з першых на тэрыторыі гістарычнай Літвы прынёс прысягу на вернасць канстытуцыі Рэчы Паспалітай, прынятай 3 мая 1791 г. Падчас Берасцейскай бітвы асаблівую мужнасць праявіў малады афіцэр вялікалітоўскага войска Караль Мараўскі. За гераізм сваяк Радзівілаў быў узнагароджаны кавалерскім крыжом ордэна "Віртуці Мілітары" [4, с. 217].

Рэч Паспалітая прайграла Вайну 1792 года. З гэтым не маглі пагадзіцца патрыёты "дзяржавы дзвух народаў". Мараўскі ўдзельнічаў у падрыхтоўцы Паўстання 1794 года. Кіраўнік узброенага выступлення, генерал Тадэвуш Касцюшка прысвоіў князю Каралю званне генерал-маёра і прызначыў яго камандуючым паўстанцкімі

войскамі ў гістарычнай Літве. Аднак, па дарозе з вайсковага лагеру ў Басутаве, Караль Мараўскі быў захоплены рускімі жаўнерамі і сасланы ў Сібір. Ссылка, аднак, працягвалася не доўга, і ўжо праз два гады цар Павел І яго вызваліў. У 1796 годзе Мараўскі паступіў на службу ў Рускае імператарскае войска. Пры гэтым цар пакінуў яму званне генерала. Хутка беларускі шляхціц трапіў у світу цара Аляксандра I [5, с.126].

Пасля таго як Напалеон стварыў Герцагства Варшаўскае, генерал Мараўскі вырашыў пакінуць царскую службу і выехаў у радавы маёнтак у Завушша. Ён верыў, што французскі імператар дапаможа аднавіць незалежнасць Вялікага Княства Літоўскага. У гэты ж час князь Караль пачаў кантактаваць з кіраўніцтвам Герцагства Варшаўскага і па заданні "цэнтра" збіраў дадзеныя пра дыслакацыю рускіх войскаў на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў. Хутка руская ўлады выйшлі на след генерала-выведніка, і ўвесну 1812 года апошняму прыйшлося з'ехаць у Варшаву. Караль Мараўскі не атрымаў прызначэнне ў штабы польскіх палкоў Вялікай арміі Напалеона. Афіцэр дабіваўся ад свайго сваяка, Дамініка Радзівіла, уключэння яго ў склад падраздзяленняў, якія планавалася выкарыстаць на тэрыторыі Беларусі. Ён імкнуўся арганізаваць у раёне Нясвіжа антырасійскі партызанскі атрад. Адзінаццаты нясвіжскі ардынат пагадзіўся з тым, што Мараўскі быў выдатнай кандыдатурай для арганізацыі дыверсійнай дзейнасці ў тыле царскіх войскаў. Аднак, далей размоў справа не пайшла і ўсю рускую кампанію брыгадны генерал правёў у штабе Напалеона [1, с. 317].

Пасля вайны Караль Мараўскі вырашыў вярнуцца на Радзіму. Царскія ўлады яго не чапалі. У 1816 годзе ён стаў магістрам масонскай ложы "Шчаслівае вызваленне" у Нясвіжы. У яе таксама ўваходзілі маршалак Слуцкага павету Юзаф Верашчака, маршалак Мозырскага павету Філіп Абуховіч, суддзя Мінскага апеляцыйнага суду Адам Бохвіц, маршалак Мінскага павету Караль Чапскі і ншыя. Пазней генерал адышоў ад палітычных спраў і заняўся сельскай гаспадаркай у маёнтку Душкава. У сядзібе ён праводзіў даволі шмат часу, жыў спакойным жыццём і вёў гаспадарку. Дарэчы, у гэты час там захоўвалася частка сямейнага архіва Радзівілаў. У 1841 годзе Мараўскі памёр. Пасля смерці цела генерала перавезлі ў Душкава. Гісторыкі перакананы, што гэта была яго ўласная воля – быць пахаваным у месцы, якое ён так любіў і шанаваў. Яго пахавалі каля драўлянай каплічкі, якая знаходзілася на тэрыторыі сядзібы яшчэ з тых часоў, калі Караль купіў маёнтак [6, с. 75].

Непадалёк ад капліцы මараўскага размяшчаецца іншая пахавальня, выкананая ў падобным стылі. Яна не мае апазнавальнай таблічкі, аднак усярэдзіне яе ёсць невялікі алтар з крыжом. З гістарычнай хронікі вядома, што на алтары размяшчаўся прыгожы абраз Таемнай Вячэры, які з'яўляецца тварэннем невядомага аўтара. Ёсць здагадкі, што ў гэтай другой капліцы, якая быццам стварае цэласны ансамбль з пахавальняй Мараўскага, знаходзіцца апошняя жонка Караля Тэрэза ці другая жонка па імі Кацярына. Таксама там можа быць і дачка Мараўскага, але гэта ўсяго толькі здагадкі. Пра сям'ю генерала захавалася мала інфармацыі. Вядома, што ў яго была дачка Тэафілія, якую назвалі ў гонар бабулі. У 15 год дзяўчына ажанілася са сваім сваяком князем Дамінікам Радзівілам.

Пасля смерці Караля Мараўскага яго маёнтак набылі князі Булгакі. У 1920-1930-х гадах побач з вёскай знаходзілася стражніца польскага Корпуса аховы памежжа (КАП). У верасні 1939 года ў Душкава прыйшла савецкая ўлада. Старыя крыпты (ля крыпты Мараўскага ёсць яшчэ чатыры пахаванні) прыйшлі ў заняпад. Сёння магіла генерала войскаў Вялікага Княства Літоўскага Караля Мараўскага ўяўляе жудаснае відовішча. Мрамарная табліца з прозвішчам, датамі жыцця і смерці, разбіта. Тынк, якім была пакрыта крыпта, амаль цалкам асыпаўся. Няма даху. Шкада, бо гісторыя генерала войска ВКЛ Караля Мараўскага заслугоўвае нашай павагі. Гэты чалавек быў сапраўдным патрыётам сваёй Радзімы – гістарычнай Літвы.

Літаратура:

1. Мельнікаў, І. Заходнебеларуская Атлантыда 1921-1941 гг. Паміж Варшавай і Масквой / І. Мельнікаў. – Мінск : "Галіяфы", 2016. – 400 с.

2. Вялікае княства Літоўскае: энцыклапедыя : у 2 т. – Т 2. – Мінск: БелЭн, 2006.

3. Мельнікаў, І. Душкава. Апошні прытулак генерала / І. Мельнікаў // «Историческая правда» [Электронны рэсурс] – Рэжым доступа : http://www.istpravda.ru/bel/artifacts/15049/. Дата доступу : 16.07.2017.

4. Romanow, A. Morawski Karol (1767-1841) / A. Romanow // Polski Słownik Biograficzny. – tom XXI. – wyd. 1976.

5. Kosk H. P. Generalicja polska, T. 2. / Kosk H. P. – Pruszków : Oficyna Wydawnicza "Ajaks", 2001.

6. Akcesy do konfederacji warszawskiej rządu i obywatelki Wielkiego Księstwa Litewskiego, podał Euzebiusz Łopaciński // Ateneum Wileńskie, r. XI, Wilno 1936.

*Трафімчык А. В. (Мінск)*

# ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА: БЕЛАРУСКІ ФОКУС

Пытанне пра этнічна-палітычную карэляцыю Тадэвуша Касцюшкі з роднай краінай дасюль не вырашана. Хоць мінае два вякі па смерці "героя двух кантынентаў".

Дакладней, некаторыя бакі лічаць, што і пытання няма. Пераважае гледзішча, што ўраджэнец зямлі будучай Беларусі атаясамліваў сябе з польскай нацыяй і культурай. Мінімальнейшая прыналежнасць да беларушчыны катэгарычна адпрэчваецца. Адэптамі такога меркавання, натуральна, з'яўляюцца палякі. Але і многія іншыя транслююць аналагічныя думкі. Нават у Беларусі. Звычайна гэта прыхільнікі заходнерускай ідэі. Часам да іх далучаюцца і шчырыя прыхільнікі беларушчыны. Трэба прызнаць, што глеба для такой пазіцыі даволі трывалая.

Існуе і супрацьлеглы пункт погляду, паводле якога, спрошчана кажучы, Касцюшка прызнаецца беларусам. Аднак, па шчырасці, здавальняючых аргументаў у дадзеным выпадку сустракалася вобмаль. У большасці публікацый галоўным чынам назіраецца строгае атаясамленне Літвы і Беларусі, з якога і выводзіцца (у пэўнай меры сафістычна) беларуская ідэнтыфікацыя чалавека, які не раз публічна называў сябе ліцвінам, а сваю радзіму Літвою, пры гэтым арганічна сумяшчаючы азначаныя паняцці з польскасцю і Польшчай.

Прыемна выдзяляецца на такім фоне артыкул А. Тараса "Ці быў Касцюшка беларусам". У ім аўтар зыходзіць з трох прынятых падыходаў вызначэння нацыянальнасці чалавека – "закона глебы", "закона крыві", "закона мовы". Даказваецца па ўсіх параметрах беларускасць Касцюшкі [17]. Аднак тут не ўлічваецца яшчэ шэраг акалічнасцей, якія значна падмацавалі б крыху па-публіцыстычнаму спрошчаныя і месцамі павярхоўныя меркаванні А. Тараса і прывялі б – але з іншага доказнага боку – да тоеснай высновы.

Канечне, падчас жыцця Касцюшкі не было нацый у сучасным разуменні. Канечне, палітычна ён сябе адносіў да Польшчы. Канечне, этнічна лічыўся ліцвінам. Канечне, непасрэднай і відавочнай сувязі ўраджэнца Літвы, грамадзяніна Рэчы Паспалітай з беларушчынай у сучасным разуменні не было і не магло быць.

Што тады было? У чым заключаецца тая тонкая нітачка, не раўнуючы Арыядны, якою ўсё ж звязваецца раннемадэрная постаць

нашага зямляка з познемадэрным нацыянальным увасабленнем сваёй радзімы?

Сам Касцюшка, па меркаванні расійскага даследчыка гісторыі Беларусі М. Нікалаева, «лічыў патрэбнымі і неадкладнымі прымусовыя меры па паланізацыі беларускага сялянства» [11, с. 232]. Гэта мае абгрунтаванне ў выглядзе слоў самога славутага ліцвіна, які ў цытуемым выпадку казаў пра русінаў (май 1789 г.): «Трэба іх прывучыць да польскай мовы... З часам у іх увойдзе польскі дух» [паводле: 13, с. 72][60]. Таму наўрад ці Касцюшка пагадзіўся б з Ф. Багушэвічам, які ў сваім вершы «Да 100-годдзя <Касцюшкі>» змадэляваў мастацкі вобраз згодна з неабходнай кан'юнктурай, выкарыстаўшы выбітны «брэнд» у мэтах нацыянальнай ідэі.

Аднак таксама заўважана, што ліцвінскі патрыятызм не супярэчыў патрыятызму Рэчы Паспалітай і ў інтэнцыях Т. Касцюшкі стаяў паперадзе інтарэсаў супольнай "дзяржавы двух народаў". Больш таго, паводле А. Латышонка, «у асобе Касьцюшкі мы назіраем столькі праяваў беларускасьці, колькі іх магло быць у дадзеных гістарычных абставінах» [5, с. 393]. Атаясамленне ліцвінскасці і беларускасці знаходзіцца і ў работах сучаснага беларускага даследчыка Касцюшкавай дзейнасці Л. Несцерчука, які ў такім святле інтэрпрэтуе ўспаміны паплечніка па паўстанні М.К. Агінскага [10, с.138]. Тым не менш гэта яшчэ можна лічыць нацяжкай.

Як ні парадаксальна, але меркаванні М. Нікалаева ды І. Марзалюка, падмацаваныя такімі важкімі аргументамі, як словы самога Т. Касцюшкі, зусім не супярэчаць пазіцыям ні Ф. Багушэвіча, ні А. Латышонка. Неабходна ўлічваць час, кантэкстам якога былі абумоўлены тыя словы героя.

Паводле прынятай перыядызацыі, эпоха Новага часу падзяляецца на два прынцыпова адрозныя для нацыястанаўлення адрэзкі: раннемадэрны і мадэрны. Іх падзяляе часавая мяжа канца XVIII ст., якая, аднак, зачалася ў Францыі, прыходзячы да іншых народаў (палітычных, а не этнічных) пазней. Адным з важных паказчыкаў, індыкатараў для вызначэння той мяжы выступае мова. Менавіта пашырэнне сферы яе ўжывання азначала станаўленне на нацыянальнае крыло таго ці іншага этнасу. Як піша А. Ліс, "праз цікавасць да такой важнай духоўнай субстанцыі, як творчасць народа,

[60] Гэтыя словы любяць прыводзіць у якасці аргумента неазаходнерусісты: [8]. Гл. падрабязней пра нацыянальную ідэалогію Тадэвуша Касцюшкі: [1, с.160-198].

яго мова ў першай палове XIX стагоддзя ідзе адкрыццё цэлых народаў, перадусім славянскіх, з іх аўтэнтычнымі культурамі ў кожнай паасобку пры пэўных супольных рысах у іхнай этнічнай прыродзе" [6, с. 242].

Але нават на мадэрным адрэзку, калі пачыналі выкрышталізоўвацца нацыі, мова, як даводзіць Т. Снайдэр на прыкладзе паўстання 1863 г. і ўдзелу ў ім узначаленых палякамі валынскіх паўстанцаў, яшчэ не служыла лініяй падзелу паміж нацыямі, паўстанні насілі характар хутчэй палітычны, чым этнічны [15, с.164]. Тым не менш, на наш погляд, з кожным праяўленнем пэўнай мовы, якая да мадэрнага дыскурсу Новага часу не мела палітычнай рэпрэзентацыі (у нашым выпадку маецца на ўвазе літоўская, украінская і, безумоўна, беларуская мовы падчас існавання Рэчы Паспалітай і пасля яе падзелаў), можна казаць пра нацыятворчасць пэўнага этнаса, якому, аднак, магло быць яшчэ далёка не толькі да лагічнага выніку развіцця ў выглядзе нацыі, але і да ўсведамлення яго прадстаўнікамі сябе агульнай народнасцю як пераходнага этапу ад фармату палітычнага раннемадэрнага народа да нацыі ў сучасным разуменні, бо родная мова тут становіцца «душою народа» (Ф. Багушэвіч), а яе ўжыванне – сведчаннем той душы («мова народа ёсць яго дух, а дух народа ёсць яго мова, і цяжка ўявіць сабе што-небудзь больш тоеснае», В. фон Гумбальт, 1767–1835).

З гэтай нагоды дазволім сабе шырокае цытаванне выбітнай ўкраінскай даследчыцы Н. Якавенка: «Лише така держава, згідно з поглядами діячів Просвітництва, матиме гарантовану безпеку, торуватиме шлях поступові освіти, правопорядку, усуватиме архаїчні пережитки тощо. Варто нагадати, що власне в останній третині XVIII ст. німецька мова була оголошена обов'язковою в поліетнічній Австрії, а у Франції, охопленій полум'ям революції, збереження регіональних мовних відмінностей трактувалося як ознака контрреволюції, бо, як говорив у 1794 р. депутат Конвенту Бертран Барер де Вйозак [Barére de Vieuzac], мова вільного народу мусить бути одна й та сама для всіх. На схожі ідеї натрапляємо і в політичній думці Речі Посполитої. Наприклад, майбутній вождь повстанців Тадеуш Костюшко у 1789 р. писав, що розв'язання української проблеми неможливе без призвичаєння до польської мови, у тому числі – навіть завдяки впровадженню її у церковний обряд, бо тільки так з часом у них увійде польський дух. Мовна асиміляція українського простолюду сприймалася і як запорука його лояльності,

оскільки, як підкреслював один з найвидатніших діячів доби реформ Гуго Коллонтай, бунти спалахували завжди тільки там, де низи не вміли говорити по-польському» [19, с. 466-467].

Таму пры ўсім сваім ліцвінскім патрыятызме Касцюшка не мог выступаць за роўнасць роднай мовы з польскай, якая да таго часу выйшла далёка за межы Польшчы, запаланіўшы і на Беларусі фактычна ўсе сацыяльныя нішы, акрамя размоўнай і фальклорнай (гэта даказваецца і на прыкладзе мастацкіх твораў канца XVIII–пачатку XIX ст.). Касцюшка імкнуўся за прагрэсам, а заступніцтва рэгіянальнай мовы, да ўзроўню якой «лакалізавалі» ліцвінскія правячыя колы мову продкаў, рабіла б Касцюшку рэакцыянерам (з тагачаснага гледзішча) або чалавекам, які значна апераджаў свой час (калі глядзець з далечы XX і XXI стст.): фактычна толькі ў XX ст. стала канчаткова ясна, што «“новыя нацыі” Цэнтральнай і Усходняй Еўропы фармуюцца на этнічна-моўна-культурных падставах, а не на гістарычна палітычных» [1, с.193]. Гэта ўвяло ў аблуду нават Ф. Энгельса (1820–1895), які такія этнасы адносіў да разраду «негістарычных». А ён жа жыў прынцыпова пазней за Т. Касцюшку! У розных светапоглядных эпохах. Таму нараджэнне мастацкіх твораў пра Касцюшкаўскае паўстанне на беларускай мове азначае першыя сігналы ўзыходжання і мадэрнай беларускай нацыі, нягледзячы на ўсе існыя песімістычныя прагнозы (у тым ліку цытаванага А. Валіцкага) і дэструктыўныя акалічнасці. Дый Т. Касцюшка пры ўсім пры тым, што «выказваўся ў падтрымку добраахвотнай паланізацыі», па рэзюмуючых словах А. Валіцкага, «не прымаў нікчэмнага “нацыянальнага эгаізму”, верыў у міжнароднае братэрства народаў» [1, с. 198]. Пасля вывучэння праблемы доктар гістарычных навук А. Смалянчук прыходзіць да высновы, “што за “польскасцю” наогул і, у прыватнасці, за “польскасцю” паўстанцаў Т. Касцюшкі звычайна хаваўся не ўласна польскі, а рэчпаспалітаўскі патрыятызм”. Тым не менш, як дадаецца далей, “што датычыцца палітычных намаганняў ліцвінаў, то перабольшваць іх самастойнасць не трэба” [14, с. 49].

Згаданы верш Ф. Багушэвіча стаў апошнім у XIX ст. зваротам да нацыянальна-вызваленчых матываў з выкарыстаннем вобраза Касцюшкі як літаратурна-мастацкага канцэпта і кангеніяльнага сімвала. Падобных твораў, да таго ж на беларускай мове, гісторыя пакінула няшмат [гл. падрабязней: 18, с. 11-59]. Найбольш значныя – гэта фальклорны ліра-эпічны сказ, умоўна названы даследчыкамі

«Беларускай песняй пра Касцюшку», і верш невядомага аўтара «Песня беларускіх жаўнераў 1794 года».

Аднак іх дастаткова, каб гаварыць, па-першае, пра зараджэнне (ці, больш карэктна, прысутнасць) элементаў беларушчыны ў сувязі з паўстаннем, па-другое, успрыманне ў далейшым беларускай культурай, у тым ліку народнай, падзей збройнага чыну 1794 г. і самога яго лідара ў якасці феномена іманентнага. Рэшткі «касцюшкаўскага» дыскурсу, з аднаго боку, сведчаць пра яго існаванне, а з іншага – дазваляюць дапусціць, што нават беларуска-літаратурная містыфікацыя ў азначаным тэматычна-ідэйным рэчышчы (пачынаючы з «Песні беларускіх жаўнераў 1794 года») арганічна ўпісвалася б у тагачасны культурны кантэкст.

У той жа час ані кроплі беларушчыны не назіралася ў дзеях расійскай экспансіі канца XVIII ст. Імя А. Суворава таксама не стала аб'ектам народных сімпатый на абсягах ВКЛ.

Аўтар «Песні беларускіх жаўнераў 1794 года», скіраванай супраць знешняга агрэсара, выбарам беларускай мовы твора, з аднаго боку, імкнецца данесці ідэі нацыянальна-вызваленчай барацьбы. Робіць гэта на зразумелай большасці мове! Як даводзіць вядомы польскі даследчык нацыятворчых працэсаў ва Усходняй Еўропе Р. Радзік, на ўсходніх землях Рэчы Паспалітай (чытай – Беларусі) «моўнай паланізацыі не саступіла частка сярэдняй, а асабліва дробнай шляхты»; прычым, як можна зразумець, страта моўнай этнатоеснасці назіралася яшчэ большай у анямечаных тады Славеніі, Чэхіі, Маравіі [13, с. 67], а гэтыя рэгіёны рэанімавалі сваю нацыянальную самабытнасць ва ўмовах «вясны народаў» (сярэдзіна XIX ст.). З іншага боку, аўтар такой песні бачыць (магчыма, толькі паўсвядома прадугадвае) далейшае развіццё этнічных працэсаў у гэтым рэгіёне, якія вялі да ўсведамлення сваёй беларускасці, дыферэнцаванай ад асветніцкай пальшчызны, якая тым часам увачавідкі архаізавалася.

«Нацыя, на думку ідэолагаў эпохі Асветніцтва, павінна быць зуніфікавана згодна з нормай, прынятай ва ўсёй дзяржаве, пры поўнай інтэграцыі з ёю лакальных супольнасцяў, рэлігійных і моўных меншасцяў, груп, якія адрозніваюцца звычаямі – аднак не з пункту гледжання на нібыта вышэйшасць этнічна-культурнай сферы, якая яе ўтварае, а перадусім прымаючы пад увагу лепшае кіраванне такім грамадствам, большую магчымасць канцэнтравання на ажыццяўленні асветніцкіх лозунгаў»,– цытуем далей Р. Радзіка [13, с. 68-69]. Але ці ж не было на землях будучай Беларусі Асветніцтва? Было. Што ж

тады магло азначаць стварэнне аўтарскай (нароўні з народнымі) песні на беларускай мове? Такі мастацкі твор ішоў жа ў разрэз «канцэнтраванню на ажыццяўленні асветніцкіх лозунгаў»! Паводле нашага меркавання, гэта азначала найперш тое, што эпоха Асветніцтва завяршала сваё існаванне, саступаючы месцы новай – з лозунгамі «свабоды, роўнасці, братэрства» (у дадзеным кантэксце ў сувязі з падкрэсленымі словамі з цытаты польскага калегі акцэнтаваць увагу хацелася б менавіта на слове «роўнасць»).

А. Пяткевіч бачыць у «Песні…» пэўны момант знакавасці і паказальнасці для станаўлення нацыянальнай ідэі беларусаў у агульным кантэксце паўстання 1794 г., галоўнай мэтай якога, як даволі зладжана (на погляд названага даследчыка) сцвярджаюць гісторыкі, з'яўлялася адраджэнне Рэчы Паспалітай нібыта без якіх-кольвек сепаратысцкіх імкненняў. Сапраўды, выключэннямі глядзіцца пазіцыя, якую займае, да прыкладу, А. Грыцкевіч. Ён лічыць, што «ідэя незалежнасці Беларусі была галоўнай падчас паўстання 1794 г.» [2, с. 22]. «…Беларуская мова паўстанцкіх песень – вельмі важны паказчык таго, што нараджалася ў гэтым асяродку (шляхецкай інтэлегенцыі. – *А. Т.*) менавіта беларуская свядомасць. <…> [У "Песні…"] адлюстраваны, такім чынам, не дробныя, побытавага ўзроўню клопаты, а кардынальныя пытанні быцця беларускага народу. Ці ж не дзейнічае тут беларуская звышзадача аўтара? Пэўна, што так» [12, с.133-134].

Такім чынам, феномен «Песні беларускіх жаўнераў 1794 года» дае магчымасць зрабіць пэўныя высновы і выказаць некаторыя меркаванні. Нягледзячы на тое, што паўстанне 1794 г. было агульным на тэрыторыі Польшчы і ВКЛ, інсургенты выразна бачылі сваю этнічную аўтэнтычнасць і праяўлялі нацыянальную самаідэнтыфікацыю. Важна, што выдзялялася беларуская пасіянарная плынь, у якой бачыцца запачаткаванне сучаснага беларускага народа. Узровень той самаідэнтыфікацыі напэўна не быў высокім, аднак дастатковым, каб не ігнараваць яе высокапісьменнаму аўтару «Песні…»: яна не з'яўлялася літаратурна-музычным творам з разраду «die Kunst für die Kunst», а мела практычны характар, а значыць, была разлічана на зусім пэўную аўдыторыю. Паводле гэтага твора, мэты паўстання патрыятычныя: інсургенты выступаюць супраць захопнікаў іх радзімы, разам з тым пры агульнасці падзей на польскіх і беларускіх землях няма падладжвання пад агульны патрыятызм у святле польскай нацыянальнай ідэі таго часу. Кіраўнік паўстання ў

«Песні беларускіх жаўнераў 1794 года» – Тадэвуш Касцюшка – успрымаецца сваім, без намёку на адчужанасць ад беларускага этнасу.

У многім такія матывы закладаліся дзякуючы аўтару твора, ліцвінскае паходжанне якога несумненна (А. Мальдзіс мяркуе пра яго сувязь са Слонімшчынай [7, с. 38]). Разам з тым у яго свядомасці нараджалася этнічнае атаясамленне згодна з надыходзячай мадэрнай эпохай.

Таму вельмі падманлівай логікай з'яўляюцца меркаванні, тоесныя выказаным У. Казберуком, што «перамога паўстання Касцюшкі раз і назаўсёды пахавала б беларушчыну як такую, паставіла б крыж на ідэі нашага нацыянальнага адраджэння. Інакш кажучы, тыя пакуты народа – гэта была цана, якую заплаціла Беларусь за ўмовы для такога адраджэння, што аказалася нечаканым і непрадбачаным вынікам падзей канца XVIII ст.» [4, с. 180]. Мала таго, што аўтар цытаты, выдатны навуковец, выкарыстоўвае ў якасці доказу ўмоўны лад, дык яшчэ і акцэптуе варункі царскай палітыкі, у якіх эвалюцыянавала беларуская нацыянальная ідэя, імпліцытна параўноўваючы іх, як можна зразумець, не на карысць эвентуальнай сітуацыі пры захаванні Рэчы Паспалітай.

«Умоўналадным» мадэляваннем верыфікаваць або абвергнуць ні пазіцыі У. Казберука, ні адваротных поглядаў немагчыма (затое выяўляецца просталінейнасць мыслення прыхільнікаў такой пазіцыі). Але наяўнасць разгледжаных мастацкіх твораў па-беларуску, з беларускім зместам ці ідэйнымі канатацыямі працуе ў адваротны бок скептыцызму фармулёвак ва ўмоўным ладзе і бачання пераважна канструктыўнасці ў каланізацыйных працэсах на Беларусі ў XIX ст. Гэта па-першае. Па-другое, як вышэй гаварылася, змена эпох вяла да «дыверсіфікацыі» этнічных працэсаў у Еўропе, прычым у Расійскай Імперыі «малыя» народы былі пастаўлены ў найгоршыя ўмовы і развіваліся як нацыя больш марудна. Варта засяродзіць увагу, што той жа «вясны народаў» у Расіі – «турме народаў» (дарэчы ўспомніць У. Леніна) – не было. Тыповым прыкладам тут сталі менавіта палякі: частка іх – пад германскім панаваннем – перажыла яскравы нацыянальны ўздым напрыканцы 1840-х гг. з канструктыўнымі вынікамі і наступствамі для нацыянальнага развіцця, частка – пад расійскай уладай – не, хоць такімі спробамі былі два паўстанні (1830–31 і 1863–64 гг.), якія не прынеслі карысці і змяніліся перыядам рэакцыі. Па вялікім рахунку дасягненні ў сэнсе нацыянальнага развіцця многіх еўрапейскіх народаў сярэдзіны XIX ст. у Расіі (чытай: для беларусаў) сталі магчымыя толькі пасля рэвалюцыі 1905 г. Беручы

пад увагу сказанае, вылучаць «умоўналаднае» мадэляванне – гэта значыць прызнаваць, што на працягу XIX ст. у нацыятворчым развіцці еўрапейскіх народаў назіраецца хутчэй статыка, чым нейкія падзвіжкі, эвалюцыя, што не адпавядае рэчаіснасці.

Разам з тым назіралася прынцыповая трансфармацыя стаўлення і польскай палітычнай думкі да маладзейшых і меншых нацый, што праз паўвека пасля ліквідацыі Рэчы Паспалітай выкрышталізавался ў пазіцыю, ахарактарызаваную вядомым польскім дзеячам Б. Ліманоўскім: «Мы жадалі аднаўлення Рэчы Паспалітай у яе даўніх межах, але таксама забяспечыць правы ўсіх нацыянальнасцей, што ўваходзілі ў яе склад, і падтрымаць абуджанае пачуццё самабытнасці сярод літоўска-рускага народа» [паводле: 3, с. 85-86]. Ці могуць пахваліцца аналагічнымі выказваннямі (хаця б выказваннямі!) тагачасныя расійскія палітыкі? Ініцыятыва так званага нацыянальнага адраджэння запачаткавалася, ажыццяўлялася і прыходзіла на славянскія землі з заходняга боку, і першыя публікацыі даследаванняў народнай культуры, што ў выніку прывяло да вызначэння беларускага народа як нацыі і ўсведамлення ім сваёй этнатоеснасці, былі прадпрыняты ўсё ж (пра)польскімі грамадзянамі Расійскай імперыі [гл., напрыклад: 9, с. 10-44] (прычым з мэтай вызначэння нацыянальнай аўтэнтычнасці насельніцтва былога ВКЛ / будучай Беларусі). І гэта спачатку польскамоўныя літаратары (спярша з ухілам у ліцвінскі патрыятызм) сталі асвойваць беларускамоўную народную стыхію, якая неўзабаве выкрышталізавалася ў літаратурную мову. Даследчыкі, якія вывучалі культуру народа, што называлі часцей на раннемадэрны капыл ліцвінскім, канцэнтраваліся у Віленскім універсітэце. Дзякуючы ім і пачало адбывацца так званае беларускае культурнае накапленне (тэрмін А. Смаленчука) [14, с. 51-52]. Такім чынам, даследуючы ліцвінскую архаіку, яны працавалі на беларускую будучыню (яшчэ не бачачы яе, але ўсведамляючы аўтэнтычнасць і гістарычную суб'ектнасць народа).

Названая навучальная ўстанова, дарэчы, была закрыта расійскай уладай у 1832 г. Гэта, безумоўна, перарвала тэндэнцыю азначанага вывучэння. Яна была адноўлена неўзабаве – у сярэдзіне XIX ст. – ужо расійскімі даследчыкамі, але – з мэтай даказаць адзінародства трох усходнеславянскіх народаў (пар. з вышэйазначаным ідэйным арыенцірам польскамоўных "ліцвіністаў").

Перарванасць далася ў знакі, і нацыянальнае развіццё беларускага народа, які не меў тым часам «П'емонта» (у адрозненне ад украінскай

Галіцыі), было прытармажана. Гэтым вытлумачваецца меншая колькасць і ніжэйшая якасць дасягненняў беларусаў як народа (перадусім літаратурных) на працягу XIX ст. і адставанне іх па самасвядомасці ў XX ст. Аднак нават у рэчышчы канцэпцыі трыадзінства расійскага народа этнаграфічныя даследаванні Беларусі volens nolens працягнулі працэс беларускага культурнага накаплення і не змаглі перавесці рэйкі выспявання беларусаў на патрэбны імперыі пуць.

Тым не менш ажыццяўленне палітыкі заходнерусізму, паралельны працяг паланізацыі адлучылі яшчэ ў зародку мадэрную беларускую нацыю і культуру ад ліцвінскай глебы і канчаткова нівелявалі ўспрыманне Рэчы Паспалітай як поліэтнічнай дзяржавы ў тым ліку будучага беларускага народа. Гэта стала адным з чыннікаў маргіналізацыі вобраза Тадэвуша Касцюшкі ў кантэксце беларускай культуры, які напачатку быў у ёй даволі рэпрэзентатыўны.

Другім фактарам адстаранення пакуль яшчэ "тутэйшых" ад гістарычнай постаці славутага земляка стаў прыход у гісторыю народа новых герояў, якія выклікалі міфалагізацыю сваёй асобы, – перадусім Кастуся Каліноўскага, які да таго ж знаходзіўся ў адным хранатопе з генезісам беларусаў як нацыянальнай супольнасці. У сувязі з гэтым А. Латышонак падкрэслівае сапраўдную народнасць славы Тадэвуша Касцюшкі, што «не мае нічога супольнага са штучным культам асобы Каліноўскага, створаным беларускімі бальшавікамі ў 20-я гг.» [5, с. 394] Менавіта з таго часу ў беларускім дыскурсе адбываецца інтэнсіўнае мастацкае асэнсаванне фігуры апошняга. Нявыключана, што легендарызацыя вобраза Кастуся Каліноўскага[61] ў многім ускаласілася на пасіянарнай глебе, падрыхтаванай папярэднімі хваляваннямі на зямлі нядаўняга ВКЛ, у тым ліку і перадусім – інсурэкцыі на чале з Тадэвушам Касцюшкам.

Такім чынам, жыццё Т. Касцюшкі прыйшлося на пачатак трансфармацыі цывілізацыйных парадыгмаў. Сам ён ментальна заставаўся збольшага ў папярэдняй эпосе, але дзейсна стаяў пад лозунгамі наступнай. Гэта ўскладніла ўстанаўленне этнічнай ідэнтыфікацыі героя. Разам з тым і прадаставіла зусім не ілюзорны шанец беларусам, з якіх выйшаў такі славуты чалавек, атаясаміць яго з

---

[61] Пэўны, хоць і няпоўны, агляд паэтычных твораў беларускіх аўтараў са стварэннем вобраза К. Каліноўскага зроблены маладой даследчыцай В. Суднік [16]. Гэтага артыкула ўжо дастаткова для таго, каб убачыць, што параўнанне па колькасці твораў пра паўстанцкіх лідараў Т. Касцюшкі і К. Каліноўскага будзе на карысць апошняга.

народам, што пачынаў шлях да мадэрных нацый, як аказалася – даволі цярністы (найперш у параўнанні з суседнімі). Гэта па-першае. Да другога залічым прысутнасць у беларускім фальклорным і літаратурным дыскурсе фігуры Касцюшкі, прычым – як свайго героя. Г. зн. ён спачатку прымаўся беларусамі. Але адбылося ўскладненне ўмоў іх нацыянальнага станаўлення пры рэжыме царскай Расіі. Аўтэнтычнасці народаў паўночна-ўсходніх і маларасійскіх губерній не хацеў прызнаваць "старэйшы брат". Аднак яе сталі выяўляць паборнікі Рэчы Паспалітай, заклаўшы адпаведны трэнд, якому ў далейшым не далі рады заходнерусісты. Натуральна, антаганісты Расійскай імперыі, якім з'яўляўся і Касцюшка, у рамках вялікадзяржаўнай рэгламентацыі не маглі быць дапушчаны да залічэння ў пантэон хоць і адгалінавання, але ж нібыта адзінага рускага народа. Час паказаў, што і гэта задача не была выканана.

Літаратура:


1. Валіцкі, А. Нацыя, нацыяналізм, патрыятызм / уступ Анджэй Мэнцвэль; пер. з польск. мовы А. Ластоўскага; навук. рэд. Г. Сагановіч / А. Валіцкі. – Мінск : Медысонт, 2012. – 528 с.
2. Грыцкевіч, А. Ідэя незалежнасці Беларусі ў гістарычным аспекце / А. Грыцкевіч // Спадчына. – 1996. – № 5. – С. 16-30.
3. Запрудскі, І.М. Нарысы гісторыі беларускай літаратуры XIX стагоддзя / І.М. Запрудскі. – Мінск, 2003. – 138 с.
4. Казбярук, У.М. Нашы вытокі : пошукі гісторыка-літаратурнай праўды: эсэ, разважанні, палем. арт. / У.М. Казбярук. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 197 с.
5. Латышонак, А. Нацыянальнасьць – Беларус / А. Латышонак. – Беласток, 2009. – 558 с.
6. Ліс, А. Традыцыйная народная культура беларусаў ў станаўленне нацыянальнай ідэі / А. Ліс // Дзеяслоў, 2015. – № 5. – С. 240-264.
7. Мальдзіс, А. З літаратуразнаўчых вандраванняў: нарысы, эсэ, дзённікі / А. Мальдзіс. – Мінск : Маст. літ., 1987. – 215 с.
8. Марзалюк, І. Фальшывая гісторыя – маці фальшывай палітыкі / І. Марзалюк // ARCHE [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://arche.by/by/28/30/2927. – Дата доступу : 13.01.2012.
9. Мархель, У.І. Прадвесце : беларуска-польскае літаратурнае ўзаемадзеянне ў першай палавіне XIX ст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 112 с.

10. Несцярчук, Л. Развагі Міхала Клеафаса пра ліцвінаў і палякаў / Л. Несцярчук // Маладосць. – 2015. – №1. – С. 138-142.

11. Нікалаеў, М. Папялушкава выдавецтва «Беларусь». Яшчэ адзін крок да стварэння нацыянальнага пантэону / М. Нікалаеў // ARCHE-Пачатак. – 2006. – № 5. – С. 230-234.

12. Пяткевіч, А. Станаўленне беларускай нацыянальнай ідэі ў кантэксце культурнага руху XIX ст. / А. Пяткевіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2005. – Z. 23. – S. 132-136.

13. Радзік, Р. Вытокі сучаснай беларускасці; беларусы на фоне нацыятворчых працэсаў у Цэнтральна-Усходняй Еўропе XIX ст. / Р. Радзік / пер. з пол. мовы Н. Дзенісюк; навук. рэд. С. Рудовіч; С. Токць. – Мінск : Медысонт. – 376 с.

14. Смалянчук, А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А.Ф. Смалянчук. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.

15. Снайдэр, Т. Рэканструкцыя нацый : Польшча, Украіна, Літва і Беларусь, 1959–1999 гг. / Т. Снайдэр / пер. з англ. мовы М. Раманоўскага і В. Калацкай; навук. рэд. Г. Сагановіч. – Мінск : Медысонт, 2010. – 421 с.

16. Суднік, В.М. «Прадзецца нітачка твая…» (вобраз Кастуся Каліноўскага ў беларускай паэзіі) / В.М. Суднік // Беларусь на скрыжаванні стагоддзяў : ад класікі да сучаснасці: матэрыялы Міжнар. навук. канф., г. Мінск, 1-2 лістап. 2012 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка; рэдкал. В.Д. Старычонак, Т.У. Балуш, І.М. Гоўзіч і інш.; адк. рэд. В.Д. Старычонак. – Мінск : БДПУ. – С. 210-214.

17. Тарас, А.Я. Был ли Костюшко белорусом / А. Тарас // Запісы таварыства аматараў беларускай гісторыі імя Вацлава Ластоўскага. Выпуск 7 / Укладальнік і рэдактар А.Я. Тарас. – Рыга : выданне ІБГіК, 2017. – С. 85-89.

18. Трафімчык, А. В. «Наш Касцюшка слаўны!» : гістарычная постаць Тадэвуша Касцюшкі ў беларускай літаратуры / А.В. Трафімчык. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2017. – 192 с.

19. Яковенко, Н. Нарис історії України. З найдавніших часів до кінця XVIII ст. / Н. Яковенко. – Київ : Критика, 2006. – 584 с.

# ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА Ў ГІСТОРЫІ І МАСТАЦТВЕ

*Гарбачова В.В. (Мінск)*

## РЭЦЭПЦЫЯ ВОБРАЗА ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ Ў БЕЛАРУСІ Ў XVIII – ПАЧАТКУ XXI СТ.

Канструяванне вобраза Тадэвуша Касцюшкі ў беларускай традыцыі зведала пэўную трансфармацыю. На працягу XVIII – пачатку XXI ст. гэты працэс распачынаўся ад гераізацыі асобы – праз міфалагізацыю, амаль поўнае забыццё – да спробаў разнастайнай рэфлексіі. Названыя тэндэнцыі прасочваюцца ў інтэлектуальнай даследчыцкай практыцы, у межах дыдактыкі школ і ВНУ, мастацкай візуальнай і літаратурнай сфераў. У артыкуле не ставіцца мэта высвятлення нейкіх рэальных фактаў з жыцця і дзейнасці Касцюшкі, увага акцэнтуецца на пытаннях формаў успрымання яго вобраза ў кантэксце мінулага, падыходаў да інтэрпрэтацыі і мемарыялізацыі героя, месца яго асобы ў свядомасці беларусаў.

kolorowych miniaturach, w różnego rodzaju formach grafiki, na pocztówkach wreszcie, reprodukowanych do czasów nam współczesnych [il. 1][96]. „Kościuszko to postać dla każdego najsympatyczniejsza ze wszystkich bohaterów polskich – pisał Marian Gumowski. Pociąga on nas nie tylko tą wielką ideą, za która walczył, celami, do których dążył, ale także pięknością charakteru i szlachetnością serca, która mu jednała wszędzie gorących wielbicieli. Między szeregiem bohaterskich partyzantów konfederacji barskiej, a zwartą kolumną pięknych rycerzy, owianych legendowym urokiem epopei napoleońskiej, stoi Kościuszko, w niczym do jednych lub drugich niepodobny. Stoi on na przełomie dwóch epok, biorących się potężnie za bary i pragnących zwycięstwa za każdą cenę"[97].




Il. 1.




Il. 2.

M. Gumowski ustalił, że pierwszy portret Kościuszki powstał w roku 1790. Był to pastel przechowywany w Bibliotece Ossolińskich we Lwowie. Portret ten jest znany z litograficznej kopii wydanej przez Witolda Kurnatowskiego w Poznaniu (1845). Oto jego opis: „Pierwszy portret

[96] Jeden z znaczących przykładów: Johann Friedrich Schröter (1770-1836), *Kościuszko*, miedzioryt punktowany, datowany 1794, wymiary 10 x 6,5 cm, Biblioteka Narodowa G.275/Sz.6.
[97] M. Gumowski, *Portrety Kościuszki*, Lwów 1917, s. 3.

Kościuszki nie odbiegał od gustu swojej epoki. Na twarzy widzimy taki sam wyraz słodki i wdzięczny, jaki cechuje portrety Bacciarellego, Grassiego, Lampiego i innych. Takie samo staranie w ułożeniu włosów w loki i żabotów na szyi, nadto chęć nadania twarzy jak najprzyjemniejszego wyrazu i zatarcia owej nieregularności rysów i zadartego nosa, który zawsze był i jest powodem kłopotów artystów(...). Uniknął zręcznie portrecista, rysując twarz prawie wprost, podobnie jak później robi Grassi, z tych samych zapewnie powodów".[98]

Powodem, dla którego zajmujemy się tym nieznanym obecnie portretem jest teza wyrażona przez Gumowskiego, że od tego konterfektu zaczynają się mnożyć portrety Kościuszki, chociaż uzasadnienie tej niespotykanej aktywności twórczej, wyłącznie okolicznościami finansowym - wydaje się niezbyt trafne.

W 1790 roku przybył do Warszawy z Wiednia Józef Maria Grassi (1757-1838). Ten malarz austriacki, syn włoskiego złotnika, podpisywał się też imieniem Giuseppe wprowadzając biografom pewnego rodzaju zamieszanie. Skłócony ze środowiskiem wiedeńskiej Akademii Sztuk Pięknych przeniósł sie do Warszawy (1791-1794), stał się tu znanym i wziętym portrecistą. Zaliczany do twórców klasycystycznych znany jest, jako autor portretów polskiej i rosyjskiej arystokracji. Malował też ks. Józefa Poniatowskiego (1763-1913), bratanka króla, uczestnika wojny polski-rosyjskiej w roku 1792 oraz Insurekcji Kościuszkowskiej 1794. To słynne ujęcie żołnierza opierającego się na szabli [il. 2][99] . Malował też Tadeusza Kościuszkę (wiele różnych motywów), dając materiał do licznych kopii litograficznych i sztychów zamieszczanych w czasopismach [il. 3, 4, 5, 6][100].

---

[98] Op. cit. s. 9.

[99] J. Grassi (1757-1838), *Książę Józef Poniatowski (1763-1813)*, [miejsce powstania nieznane], datowane, 1870-1900, papier albuminowy, wymiary 9,4 x 6,2 cm: MN F-7401.

[100] [autor nieznany], *Portret Tadeusza Kościuszki* [kopia obrazu Józefa Grassiego (1757-1838), wg rysunku Tauberta], datowany po 1794, olej na płótnie, wymiary 31 x 23 cm; MN M.238; J. Grassi, *Tadeusz Kościuszko 1746-1817* [fotografia wg portretu w mundurze], miejsce powstania nieznane, datowanie: 1880-1900, papier albuminowy, wymiary 10 x 6,2; MN F-6666; J. Grassi, *Kościuszko* [fotografia wg portretu w sukmanie z orderem Orła Białego], miejsce powstania nieznane, datowanie: 1880-1900, papier albuminowy, wymiary 10 x 6,2; MN F-6667; J. Grassi, *Tadeusz Kościuszko* [portret w owalu], Kraków 1917, druk na kartonie, wymiary 14,3 x 8,9; MN P-2569.



Il. 3.



Il. 4.




Il. 5.




Il. 6.

Polski malarz, Franciszek Smuglewicz (1745-1807) wyszedł nieco ponad schemat proponowany przez Grassiego. Jego zaginiony obraz *Polska w kajdanach* stał się memento przypominającym upadek Ojczyzny w 1795 roku. Polonia w białej szacie siedziała w majestatycznej pozie, w kajdanach na rękach. Przed nią stał Kościuszko w zbroi z szablą w dłoni, z odkrytą głową i wysoko uniesionym czołem. Trzy postaci, uosabiające szlachcica, mieszczanina i chłopa, symbolizowały historyczną zgodę stanów funkcjonującą podczas Insurekcji. „Malowidło przedstawiało Polonię w bieli, niczym antyczną westalkę, u stóp której Naczelnik składał przysięgę, w asyście trzech stanów”.[101] Jego inny obraz *Kościuszko pod Maciejowicami* jest mniej znany.

*Przysięga Kościuszki na Rynku w Krakowie* (1797) Smuglewicza posiada liczne kopie [il. 7][102]. Oryginał znajduje się w Muzeum Narodowym w Poznaniu. Reprodukowany był on powszechnie na pocztówkach patriotycznych na przełomie XIX i XX wieku. Obraz staje się też inspiracją do wielu późniejszych reprodukcji, w tym kopii malarskich.




Il. 7.

[101] H. Widacka, *Alegoria upadku ojczyzny po trzecim rozbiorze*, http://www.wilanow-palac.pl/alegoria_upadku_ojczyzny_po_trzecim_rozbiorze.html [dostęp wszystkich materiałów elektronicznych 7 marca 2017].

[102] F. Smuglewicz, *Przysięga Kościuszki na Rynku Krakowskim* [pocztówka patriotyczna, reprodukcja obrazu olejnego], Salon Malarzy Polskich, Kraków 1906, karton barwny, wymiary 9 x 13,6 cm: MHPRL 7753.

Podobne w tytule i treści jest dzieło Michała Stachowicza (1768-1935)[103], owoczesnym zwyczajem posiadające również wiele autokopii i reprodukcji [il. 8][104]. W Muzeum Narodowym w Krakowie znajduje się obraz olejny (wymiary 120 x 179), jedna z licznych replik, namalowany na zamówienie rajców miasta Krakowa w 1821 roku.



Il. 8.

Przysięgę Kościuszki przedstawił też Wojciech Kossak (1857-1942) w obrazie olejnym (wymiary 147 x 195 cm) z 1911 roku znajdującym się w Muzeum Tadeusza Kościuszki w szwajcarskiej Solurze[105]. Bardzo popularna była i jest reprodukcja tego obrazu na pocztówkach [Il. 9]. Warto dodać, że twórca ten, znany przede wszystkim z pomysłu i ekspresowej realizacji zbiorowego dzieła pn. *Panorama Racławicka* (1893-1894), ma

---

[103] Z. Michalczyk, *Michał Stachowicz (1768-1825). Krakowski malarz między barokiem a romantyzmem*, T. 1, 2, Instytut Sztuki PAN, Warszawa 2011. Autor dowodzi, że Stachowicz był pierwszym twórcą sięgającym po temat przysięgi Kościuszki, zaś Smuglewicz był jego naśladowcą i artystycznym kontynuatorem. Zob. Idem, *Wczesna ikonografia Tadeusza Kościuszki i jej społeczny kontekst w Krakowie przełomu XVIII i XIX w.: Franciszek Smuglewicz a Michał Stachowicz*, [w:] *Socialinių tapatumų reprezentacijos Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės vizualinėje kultūroje*, Vilnius 2010, s. 517-531.

[104] M. Stachowicz (1768-1825), *Przysięga Kościuszki na Rynku Krakowskim* (1794-1800), gwasz na szkicu łówkowym, wymiary 47,2 x 67,9 cm; MNW Rys.Pol 709.

[105] W. Kossak, *Przysięga Kościuszki na Rynku krakowskim 24 marca 1794,* Salon Malarzy Polskich, Kraków 1917, pocztówka barwna, wymiary 9 x 14,1 cm; MN P-2108.

ponadto w swoim dorobku obraz olejny, o wymiarach 71 x 97 cm, *Jan Kiliński prowadzący jeńców rosyjskich po ulicach Warszawy* (1908) znajdujący się w Muzeum Śląska Opolskiego.[106] Obraz ten również był wielokrotnie reprodukowany na kartach pocztowych [Il. 10].




Il. 9.



Il. 10.

[106] Więcej zob. T. Skoczek, *Wprowadzenie,* [w:] *Wojciech Kossak*, seria „Skarby Kultury i Literatury Polskiej", Tom 19, Muzeum Niepodległości, Warszawa 2013. Tam też szersza literatura przedmiotu.

Kolejnym portrecistą Tadeusza Kościuszki był Kazimierz Wojniakowski (1771-1912) znany dziś przede wszystkim jako autor obrazu olejnego *Uchwalenie Konstytucji 3 Maja 1791* (powstały w 1806), znajdującego się w Muzeum Narodowym w Warszawie (wym. 123,5 x 127,9, sygn. MNW M 5211). Marian Gumowski podaje, że młody artysta malował naczelnika na tle szańców, wśród dymu armat. Wyliczył też, że różnych portretów Kościuszki namalował Wojniakowski kilkanaście, dając współczesnym i potomnym doskonały materiał ikonograficzny do kopiowania. „Zapewne z jego obrazu jest niemiecki sztych, przedstawiający naczelnika ubranego w czamarę, stojącego przy armacie na tle krajobrazu i inny, litografia kolorowa angielska, A. Girarda, ubranego w niebieską czapkę z kitą."[107]

**Kościuszko pokonany**

Bitwa pod Maciejowicami (10 października 1794) przyniosła klęskę wojskom polskim. „Naczelnik uchodził z pola bitwy wraz z grupą uciekających w kierunku Łaskarzewa, próbując ominąć jazdę rosyjską i w tym celu skręcając w bagniste łąki. Kozacy, zwabieni bogatymi szamerunkami polskich kawalerzystów, puścili się za nimi w pogoń. Przeskakując rów w pobliżu folwarku Krępa koń Kościuszki potknął się, zrzucając jeźdźca na murawę. Naczelnik, widząc nadjeżdżających Kozaków i nie chcąc wpaść żywym w ich ręce, włożył krucicę w usta i pociągnął za spust, lecz pistolet nie wypalił. W tym momencie dosięgły go spisy kozackie. Wrogowie, nie wiedząc, że mają do czynienia z Naczelnikiem, obrabowali go doszczętnie, a w trakcie tych czynności nadjeżdżający kornet charkowskiego pułku lekkokonnego Fiedor Łysenko ciął bezbronnego jeńca w głowę pałaszem. Kościuszko po tym ciosie stracił przytomność"[108].

Ta tragiczna chwila miała liczne odwzorowania w literaturze i w sztuce. Józef Ryszkiewicz (ojciec) pozostawił potomnym swoje wyobrażenie tamtej sytuacji w obrazie *Wzięcie do niewoli Tadeusza Kościuszki pod Maciejowicami* znanym, jak wiele innych dzieł dziewiętnastowiecznych, z reprodukcji na kartach pocztowych [Il. 11].

---

[107] M. Gumowski, op. cit, s. 14.

[108] A. Widacka, *Finis Poloniae. Kościuszko w niewoli*, http://wilanow-palac.pl/finis_poloniae_kosciuszko_w_niewoli.html.




Il. 11.

Także miejsce gdzie padł naczelnik działało na wyobraźnię potomnych. Ludwik Stasiak (1858-1924), malarz i pisarz, charyzmatyczny publicysta i wytrawny historyk sztuki, wydał dwie pocztówki w krakowskim Salonie Malarzy Polskich pod wspólnym tytułem *Pobojowisko Maciejowickie*: rysunek zatytułowany *Miejsce gdzie ranny Kościuszko dostał się do niewoli* oraz rysunek przedstawiający *Groby poległych* podczas nieszczęsnej bitwy, leśny i bagienny krajobraz z wizerunkiem Kościuszki wkomponowanym w obraz [Il. 12 i 13]. Ogłaszając głośny manifest w obronie naturalnych perełek kultury i sztuki, jakimi były kapliczki i krzyże przydrożne sam rysował te obiekty i wydawał w własnym Wydawnictwie Obrazów Treści Religijnej. Dwa omawiane motywy z maciejowickiej bitwy są znakomitą ilustracją teoretycznych treści. Przekształcając w roku 1899 swoją oficynę w Wydawnictwo Dzieł Sztuki Stella (w Bochni) pozostał wierny swojej dewizie rezygnacji z upowszechniania obcych, zwłaszcza niemieckich, motywów w sztuce. Hołdował tradycji, pisał o bogactwie polskiej sztuki średniowiecznej, propagował rodzimość, polskość. Wydawał tylko naszych artystów, zwalczając w publicystyce niemiecką i austriacką modę, w tym modernizm, secesję i inne nowe kierunki. Jego działalność niesłusznie zapomniana wymaga zbadania i upowszechnienia[109]. Podobnie jak temat Insurekcji Kościuszkowskiej w jego twórczości.

---

[109] J. Czernecki (wstęp i oprac.), *Ludwik Stasiak. Album*, Seria: „Współczesne Malarstwo Polskie", z. 7, Kraków 1913; B. Łopatkówna, *Ludwik Stasiak. Zarys monograficzny,* Prace naukowe WSP, Katowice 1965; J. Flasza (wstęp i red.), *Na granicy epok. Ludwik Stasiak*




Ił. 12.




Ił. 13.

Tadeusz Kościuszko ranny pod Maciejowicami, osadzony został w ciężkim więzieniu Twierdzy Pietropawłowskiej. Źle znosił rany i odosobnienie, nie był nawykły do trudów przesłuchań w warunkach więżiennych. Przeżył prawdopodobnie załamanie nerwowe, „melancholię" – jak określali współcześni.[110]

Wielu sądziło, że następuje już koniec Polski. Propaganda pruska zaczęła tworzyć czarną legendę, jakoby Tadeusz Kościuszko padając pod Maciejowicami krzyknął *Finis Poloniae.* Obalił ten mit dopiero Józef

*(1858-1924), Katalog wystawy w Muzeum Stanisława Fischera* w Bochni (27 marca- 19 czerwca 1994), Bochnia 1994; T. Linkner, *Literacki obraz misji św. Wojciecha z Gdańskiem w tle w powieściach Ludwika Stasiaka i Stefana Żeromskiego*, „Studia Europejskie", t. 2, Gdynia 1997, s. 267-285; J. Flasza, *Przydał kolorytu Krakowowi i Bochni*, rocznik „Małopolska", t. 10, Kraków 2008, s. 163-176.

[110] J. Pachoński, *Kościuszko w niewoli carskiej 1794-1796,* Wydawnictwo Głównego Komitetu Kościuszkowskiego, Kraków 1947, passim; Idem, *Kościuszko po insurekcji 1794-1817*, Wydawnictwo Lubelskie, Lublin 1986, passim.

Tretiak w 1921 roku[111]. Upadek wodza i wyobrażenie momentu wzięcia go do niewoli wpłynął jednak na wyobraźnię artystów. Powstało kilka dzieł o powyższym tytule: Dietricha Montena (1799-1843) - niemieckiego malarza i litografa - obraz olejny z 1831 roku, ilustrujący przekroczenie granicy Polski z Prusami przez rozbite wojska powstańcze, [Il. 14], rysunki Michała Stachowicza, Jana Piotra Norblina, Jana Krzysztofa Damela, staloryt Johanesa Zumpe (z ok. 1830), grawera francuskiego Victora Adama (1801-1967).

Wizerunek Tadeusza Kościuszki zmieniał się w czasie. Jako pokonany, ale nie zwyciężony, bohater walki o „wolność, niepodległość i całość"[112] stawał się symbolem dążeń i marzeń wielu Polaków pozbawionych własnej ojczyzny.



Il. 14.

[111] J. Tretiak, *Finis Poloniae. Historia Legendy Maciejowickiej i jej rozwiązanie*, Krakowska Spółka Wydawnicza, Kraków 1921. Pozycja dostępna również elektronicznie, zob. http://www.pbi.edu.pl/book_reader.php?p=51177&s=1.

[112] To dewiza Insurekcji Kościuszkowskiej obecna na sztandarach, w poezji, w drukach ulotnych.

*Крывуць В. І. (Баранавічы)*

# ПОСТАЦЬ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ Ў АФІЦЫЙНАЙ ВЫХАВАЎЧАЙ ПАЛІТЫЦЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў МІЖВАЕННЫ ПЕРЫЯД

У міжваенны перыяд кіруючыя колы польскай дзяржавы надавалі шмат увагі выхаванню маладога пакалення краіны, у тым ліку і на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Асабліва яскрава гэта прасочвалася пасля ўсталявання ў 1926 г. "санацыйнага" рэжыма. Славамір Чэрвінскі, міністр асветы ў 1929 – 1931 гг., заяўляў, што выхаваўчым ідэалам павінен стаць тып такога чалавека, які б адначасова быў бы байцом і працаўнікам. Адроджанай польскай дзяржаве патрабаваўся грамадзянін, які б "мужнай паўсядзённай працай, а пры неабходнасці і свяшчэнным запалам барацьбы даказваў свой актыўны, шчыры патрыятызм" [1, с. 208].

На дасягненне дадзенай мэты была арыентавана дзейнасць дзяржаўных інстытутаў і грамадскіх арганізацый, якія прымалі актыўны ўдзел у рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі – школы, арміі, шматлікіх праўрадавых маладзёжных саюзаў. У сваёй выхаваўчай працы яны так ці інакш звярталіся да выкарыстання пэўных гістарычных асоб у якасці выхаваўчых узораў, прыкладаў для наследавання. Зразумела, што важнае месца сярод гэтых выхаваўчых узораў займала постаць Тадэвуша Касцюшкі.

Калі казаць пра школу, то менавіта навучанне гісторыі лічылася адным з галоўных спосабаў рэалізацыі афіцыйнага выхаваўчага ідэалу. Пры гэтым неабходна падкрэсліць, што ў міжваенны перыяд методыка выкладання гісторыі абапіралася на прынцыпе групавання матэрыялу навучання вакол выдатных асоб. Біяграфічны фактар разглядаўся як аснова навучання. Адной з прычын выстаўлення на першых план вобразаў гістарычных герояў былі іх выхаваўчыя каштоўнасці [2, с. 162].

Акрамя ўсяго іншага, задачай навучання гісторыі ва ўсеагульнай школе было пазнаёміць дзяцей "з выбітнымі падзеямі і праявамі грамадскага жыцця і выбітнымі постацямі айчыннай гісторыі" [3, с. 34].

Да школьнай рэформы пачатку 1930-х гг. вывучэнне гісторыі пачыналася ў III класе (2 гадзіны ў тыдзень). Што тычыцца непасрэдна Т. Касцюшкі, то праграма па гісторыі для III класа прадугледжвала наступныя пункты: "Прысяга Касцюшкі ў Кракаве. Прызыў сялян да барацьбы. Бітва пад Рацлавіцамі. Касцюшка апранае

сялянскую світку. Бітва пад Мацяёвіцамі" [3, с. 36]. Такім чынам, вучні атрымлівалі агульныя веды пра дзейнасць Т. Касцюшкі ў час паўстання 1794 г.

Больш падрабязна жыцце і дзейнасць Т. Касцюшкі разглядалася ў IV класе, у час спецыяльнага курса "На службе Айчыне" (2 гадзіны ў тыдзень). Гэта быў цыкл гістарычных гутарак, мэтай якіх было паглыбіць і дапоўніць веды, атрыманыя вучнямі ў III класе, і падрыхтаваць дзяцей да сістэматычнага курса ўсеагульнай і польскай гісторыі ў V і VI класах усеагульнай школы (2 гадзіны ў тыдзень) [4, с. 3]. Праграма рэкамендавала разглядаць постаць Начальніка паўстання ў раздзеле "Выбраныя польскія князі і правадыры нацыі". Яго біяграфія вывучалася згодна з наступным планам: "Дзяцінства Касцюшкі. Касцюшка ў Кадэцкай школе. Касцюшка ў Амерыцы. Касцюшка – павадыр нацыі. Прысяга на Кракаўскім рынку. Рацлавіцы. Шчэкаціны, абарона Варшавы. Мацяёвіцы. Касцюшка як апякун сялян. Касцюшка ў палоне. Касцюшка ў эміграцыі. Апошнія гады Касцюшкі, смерць і пахаванне" [3, с. 37].

У VI класе ўсеагульнай школы на уроках гісторыі вобраз Т. Касцюшкі зноў вывучаўся ў кантэксце вайны паўночна-амерыканскіх калоній з Англіяй, вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй у 1792 г. і нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. [3, с. 42].

Пэўныя змены ў вывучэнні гісторыі ва ўсеагульнай школе адбыліся пасля правядзення школьнай рэформы ў пачатку 1930-х гг. Як асобны прадмет гісторыя з'яўлялася толькі ў V класе. У першых чатырох класах вучні атрымлівалі пэўныя гістарычныя веды, у тым ліку і пра Т. Касцюшку, на занятках па польскай мове. Сістэматычнае вывучэнне падзей, звязанных з жыццём і дзейнасцю Т. Касцюшкі, адбывалася ў VI класе, дзе вучні праходзілі перыяд з пачатку XVIII ст. да 1926 г. [5, с. 220]. Неабходна адзначыць, што рэфармаваныя праграмы па гісторыі прадугледжвалі ўключэнне ў працэс выкладання элементаў рэгіянальнай гісторыі [5, с. 208]. У сувязі з гэтым, напрыклад, на тэрыторыі Палескай школьнай акругі з'яўлялася магчымасць для больш падрабязнага вывучэння біяграфіі Т. Касцюшкі, як "сына палескай зямлі".

Зразумела, што жыццё і дзейнасць Т. Касцюшкі вывучалася і на занятках па гісторыі ў сярэдняй школе, у гімназіях і ліцэях. Таксама ў другой палове 1930-х гг. у сувязі з курсам на "мілітарызацыю" свядомасці грамадства і актывізацыю патрыятычнага выхавання адбываліся значныя змены ў праграмах навучання. У выніку каля 30%

зместу праграм у той ці іншай меры былі прысвечаны ваеннай гісторыі і гісторыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы, а таксама розным пытанням абароназдольнасці краіны. Асабліва падкрэсліваліся заслугі шматлікіх нацыянальных герояў. Да апошніх адносіўся і Т. Касцюшка [6, с. 13]. Аднак галоўным героем і выхаваўчым узорам у тагачаснай польскай школе з'яўляўся маршал Ю. Пілсудскі. "Сын палескай зямлі" не мог вытрымаць канкурэнцыі з "сынам Віленшчыны", "Першым маршалам і стваральнікам незалежнай Польшчы". Так, у падручніку па гісторыі для VI класа для ўсеагульных школ імя Т. Касцюшкі ў той ці іншай меры ўпаміналася ў 7 падраздзелах: "Касцюшка і Пуласкі ў Злучаных штатах", "Вайна з Расіяй. Дубенка", "Прысяга Касцюшкі", "Рацлаўская перамога", "Абвяшчэнне Паланецкага ўніверсала", "Паўстанне ў Варшаве", "Паражэнне пад Мацяёвіцамі. Трэці падзел Польшчы". Жыццё і дзейнасць Ю. Пілсудская асвятлялася ў 13 падраздзелах: "Маладосць Юзэфа Пілсудскага", "Рэвалюцыя 1905 г.", "Падрыхтоўка да ўзброенай барацьбы", "Пачатак вайны, выступленне кадруўкі 6 жніўня 1914 г.", "Баі Легіёнаў у Келецкім ваяводстве", "Бітва пад Лоўчувкем", "Шляхам Легіёнаў", "Польская вайсковая арганізацыя", "П.В.А. на Крэсах", "Дзень 11 лістапада 1918 г.", "Начальнік Дзяржавы Юзэф Пілсудскі", "Абарона Польшчы ў 1920 г.", "Канстытуцыя 17 сакавіка 1921 г.". І нават у падраздзеле, прысвечаным прэзыдэнту Польшчы І. Масьціцкаму паведамлялася пра яго першую сустрэчу і сяброўства з Ю. Пілсудскім [7].

Тым не менш, становішча, якое склалася ў галіне адукацыі, не садзейнічала паспяховай рэалізацыі афіцыйнай выхаваўчай палітыкі. Так, на тэрыторыі Заходняй Беларусі навучанне ў гімназіях было недаступным для большасці дзяцей. Вядома, што колькасць гімназій скарацілася з 85 (17 800 вучняў) у 1927/1928 навучальным годзе да 54 (15 900 вучняў) у 1938 г. [8, с. 222]. Не лепшай была сітуацыя і ва ўсеагульнай школе. Пасля школьнай рэформы найбольш распаўсюджанымі ў 2-й Рэчы Паспалітай з'яўляліся ўсеагульныя школы першай ступені з I–IV класамі. Напрыклад, у Палескім ваяводстве ў 1939 г. з 1 075 усеагульных школ школамі першай ступені з'яўляліся 811 (75,5%) [9, с. 99]. Такім чынам, навучанне большасці заходнебеларускіх дзяцей спынялася на ўзроўні чатырох класаў, а пасля рэформы школы іх знаемства з гістарычнй асобай Т. Касцюшкі абмяжоўвалася толькі звесткамі, атрыманымі на ўроках польскай мовы.

Неабходна адзначыць, што выхаваўчыя функцыі ў 2-й РП выконвала не толькі школа. Напрыклад, пэўная праца па грамадска-патрыятычнаму выхаванню салдат тэрміновай службы вялася ў арміі. Яшчэ ў 1919 г. быў прыняты закон аб прымусовым навучанні ў Войску Польскім. Акрамя барацьбы с непісьменнасцю, перад гэтым навучаннем ставіліся і выхаваўчыя задачы – салдат павінен быў атрымаць веды, неабходныя для свядомага выканання грамадзянскіх і салдацкіх абавязкаў [10, с. 135].

Праграма прымусовага навучання з'яўлялася скарочаным варыянтам праграмы ўсеагульнай школы. Яна ўключала у тым ліку і гісторыю Польшчы, на якую адводзілася 165 гадзін. [11, с. 3 – 4]. Гістарычнае навучанне праводзілася на трох ступенях, у залежнасці ад узроўня адукацыі салдат. Спачатку адбываліся "гутаркі пра Польшчу і салдата-грамадзяніна", потым "гістарычна-краязнаўчыя гутаркі" [11, с. 36–37]. На заключным этапе патрэбна было "у шэрагу храналагічна выкладзеных вобразаў паказаць салдатам-вучням жыццё польскай нацыі ў мінулым і подзвігі, здзейсненыя палякамі" [11, с. 45]. Праграма гісторыі Польшчы на гэтым этапе была падзелена на 39 "метадычных адзінак". Дзве з іх, прысвечаныя вайне 1792 г. і нацыянальна-вызваленчаму паўстанню 1794 г., прадугледжвалі і знаёмства з жыццём і дзейнасцю Т. Касцюшкі [11, с. 49].

Пасля 1926 г. у Войску Польскім паступова усё большы націск стаў рабіцца не на непасрэдна навучанні, а на грамадска-патрыятычным выхаванні. Вядучай формай гэтай працы сталі т.зв. выхаваўчыя гутаркі. Акрамя ўсяго іншага, яны павінны былі служыць "замацаванню сярод салдат найважнейшых фактаў з гісторыі Польшчы, асабліва нацыянальна-вызваленчай барацьбы". Аднак тут рэкамендавалася рабіць націск на асабістыя дасягненні Ю. Пілсудскага [12, с. 30]. Хаця постаць Т. Касцюшкі ў кантэксце нацыянальна-вызваленчай барацьбы і гісторыі польскай арміі захоўвалася ў тэматыцы выхаваўчых гутарак.

Таксама ў выхаваўчай працы ў Войску Польскім вялікая ўвага надавалася ўдзелу ваеннаслужачых у святкаванні нацыянальных свят. Адным з іх з'яўляўся Дзень 3 мая. Пры гэтым у Войску Польскім гэта быў не толькі дзень Канстытуцыі 1791 г., але і дзень ордэна "Віртуті Мілітары" [13, с. 25]. Зразумела, што ў час гэтых святочных мерапрымстваў нельга было абысціся без, як мінімум, згадвання генерал-лейтэнанта Т. Касцюшкі, які стаў адным з першых кавалераў ордэна за мужнасць, праяўленую у бітве пад Зеленцамі.

Разам са школай і арміяй актыўную выхаваўчую працу сярод маладога пакалення ў міжваенны перыяд вялі і шматлікія моладзевыя арганізацыі – Стралецкі саюз “Стралец”, Саюз польскага харцарства (СПХ), Саюз сельскай моладзі “Сеў” – Саюз маладой вёскі, Арганізацыя працуючай моладзі і інш. Усе яны так ці інакш звярталіся ў гэтай сваёй дзейнасці да гістарычнай постаці Т. Касцюшкі. Аб гэтым, сведчыць, напрыклад, тое, што многія харцарскія дружыны на тэрыторыі Віленскай харугві СПХ выбіралі яго ў якасці патрона свайго атрада. Харцарскія мужчынскія дружыны імя Т. Касцюшкі існавалі ў Баранавічах, Нёмане, Лідзе, Навагрудку, Слоніме, Смаргоні, Шчучыне, Вільні [14, с. 33 – 35]. Таксама з 1914 г. у Вільні існавала і жаночая харцарская дружына імя Т. Касцюшкі [14, с. 26]. Але трэба падкрэсліць, што Статут СПХ у рэдакцыі 1936 г. абвяшчаў ідэйным патронам усей арганізацыі Ю. Пілсудскага [15, с. 182].

Даты, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Т. Касцюшкі, абавязкова прысутнічалі ў “гістарычных календарах” праўрадавых маладзёжных арганізацый і саюзаў. Напрыклад, у “Стралецкім календары на 1937 год” прыводзіліся даты хрышчэння і смерці Т. Касцюшкі, прысягі на Кракаўскім рынку, бітваў пад Рацлавіцамі і Мацяёвіцамі, абвяшчэння Паланецкага ўніверсала [16, с. 9 – 23].

У 1937 г. Праўленне і Камендатура акругі № 9 “Брэст” Стралецкага саюза выдалі праграму грамадзянскага выхавання. У ёй прадугледжвалася знаёмства членаў арганізацыі з гісторыяй Польшчы і польскага нацыянальна-вызваленчага руху. Палескія стральцы павінны былі ведаць не толькі пра біяграфію Т. Касцюшкі, “сына Палескай зямлі”, але і пра палескія мясціны, звязаныя з ім (Мерачоўшчына, Сяхновічы) [17, с. 15]. Сярод свят, якія рэкамендавалася адзначаць ячэйкам саюза разам з насельніцтвам, называўся і дзень 24 сакавіка – “святкаванне гадавіны паўстання Касцюшкі” [17, с. 37]. Але, як і выпадку са школай і арміяй, галоўным гістарычным персанажам, выхаваўчым ідэалам Стралецкага саюза з’яўляўся Ю. Пілсудскі. Менавіта падрабязнае вывучэнне яго біяграфіі рэкамендавалася для вывучэння праграмай.

Такім чынам, постаць Т. Касцюшкі даволі шырока выкарыстоўвалася ў дзейнасці асноўных інстытутаў, якія займаліся выхаваўчай працай сярод маладога пакалення Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд – школы, Войска Польскага, праўрадавых маладзёжных арганізацый. Жыццё і дзейнасць кіраўніка паўстання 1794 г. знайшлі адлюстраванне у школьных праграмах і падручніках, у

праграмах грамадска-выхаваўчай працы армейсккіх і грамадскіх структур. У першую чаргу яны разглядаліся ў кантэксце гісторыі польскай дзяржаўнасці. Рабіліся нават спробы ўлічваць рэгіянальны аспект пры вывучэнні біяграфіі “сына палескай зямлі”. Аднак неабходна прызнаць, што ўсё ж такі галоўнымі гістарычнымі ўзорамі афіцыйнай моладзевай палітыкі з’яўляліся зусім іншыя асобы.

Літаратура:


1. Kulesza, W. Koncepcje ideowo-polityczne obozu rządzącego w Polsce w latach 1926 – 1935 / W. Kulesza. – Wrocław : Ossolineum, 1985. – 311 s.

2. Florek, A. Postacie bohaterów narodowych w programach nauczania historii w okresie międzywojennym / A. Florek // Wiadomości historyczne. – 1984. – № 2. – S. 161 – 170.

3. Program nauki w publicznych szkołach powszechnych. – Lwów : Państwowe wydawnictwo książek szkolnych, 1931. – 144 s.

4. Kisielewska, J. W służbie Ojczyzny. Pogadanki historyczne dla IV oddziału / J. Kisielewska. – Warszawa : Nakład Gebethnera i Wolfa, 1931. – 210 s.

5. Sadowska, J. Ku szkole na miarę Drugiej Rzeczypospolitej. Geneza_ założenia i realizacja reformy Jędrzejewiczowskiej / J. Sadowska. – Białystok: Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2001. – 295 s.

6. Urbanowicz, B. Przysposobienie wojskowe w edukacji szkolnej II Rzeczypospolitej / B. Urbanowicz // Prace naukowe Akademii im. Jana Długosza w Częstochowe. Res Politicae. – 2014. – N. VI. – S. 9 – 26.

7. Pohoska, H. Z naszej przeszłości. Podręcznik do nauki historji dla VI kl. szkół powszechnych / H. Pohoska, M. Wysznacka. – Warszawa : Wydawnictwo M. Arcta, 1934. – 223 s.

8. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк [і інш.]. – Ч. 2 – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.

9. Вабішчэвіч, А.М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921 – 1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выдавецтва БрДУ, 2004. – 116 с.

10. Dziemianko, Z. Edukacja obywatelska żołnierzy w Wojsku Polskim w okresie dwudziestolecia międzywojennego / Z. Dziemianko // Przegląd Naukowo-Metodyczny. Edukacja dla Bezpieczeństwa. – 2010. – № 3. – S. 133 – 139.

11. Instrukcja o przymusowem nauczaniu żołnierzy. – Warszawa : Główna księgarnia wojskowa, 1922. – 88 s.

12. Wyszczelski, L. Oświata i propaganda w Wojsku Polskim w latach 1935 – 1939 / L. Wyszczelski // Przegląd Historyczno-Oświatowy. – 2004. – № 1 – 2. – S. 25 – 40.

13. Instrukcja o pracy oświatowo-kulturalnej i wychowawczej w wojsku. – Warszawa, 1931. – 36 s.

14. Straż nad Wiljią. Jednodniówka Oddziału Wileńskiego Z. H. P. / Kom. red.: A. Narwoycz, E. Gulbinowa, J. Czarny Grzesiak. – Wilno : Drukarnia "Lux", 1929. – 39 s.

15. Statut Związku Harcerstwa Polskiego // Dziennik Urzędowy kuratorjum okręgu szkolnego Wileńskiego. – 1936. – № 8–9. – S. 181 – 192.

16. Kalendarz Strzelecki na rok 1937. – Lwów : Drukarnia Urzędnicza, 1937. – 160 s.

17. Program dla grup wiekowo-wyszkoleniowych w oddziałach i pododdziałach Związku Strzeleckiego w zakresie wychowania obywatelskiego. – Brześć nad Bugiem, 1937. – 45 s.

*Несцярчук Л. М. (Брэст)*

# УШАНАВАННЕ ІМЯ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ Ў БЕЛАРУСІ

Пры жыцці і пасля імя Т. Касцюшкі, ягоны вайсковы і палітычны таленты прызнавалі і шанавалі амерыканскія прэзідэнты і расійскія імператары, аб ім ва ўсім свеце складаліся песні ды легенды. Нават цяпер у гонар нашага земляка ствараюцца мастацкія творы, помнікі, музеі, яго імя носяць населеныя пункты, установы, грамадскія аб'яднанні.

Праз 10 гадоў пасля смерці Т. Касцюшкі знакаміты кампазітар і вайсковы дзеяч ВКЛ, палымяны змагар за адраджэнне Бацькаўшчыны, паплечнік і зямляк Касцюшкі Міхал Клеафас Агінскі ў сваіх "Мемуарах", выдадзеных у 1826-1827 гг. у Парыжы, пісаў, што яму пашчасціла "быць побач з гэтым выдатным чалавекам, які выклікаў захапленне ўсёй Еўропы і жах у ворагаў. Ён быў кумірам для нацыі, узвышаным да рангу дыктатара, які не меў іншых амбіцыяў, апроч служэння сваёй радзіме і барацьбы за яе, заўжды захоўваў сціплую, прыветную і ласкавую манеру паводзінаў, не насіў ніякай асаблівай адзнакі найвышэйшай улады, якой ён быў надзелены, здавальняўся сурдутам з грубай шэрай тканіны, а стол ягоны быў такі самы просты, як стол малодшага афіцэра. Прысутнасць такога чалавека не магла не абудзіць ува мне ўсіх пачуццяў павагі да яго, захаплення і пашаны, шчыра пранесеных мною праз усе часіны майго жыцця" [1, с. 676].

Шануючы памяць пра Касцюшку, Міхал Клеафас пісаў, што "помнікі, усталяваныя ў гонар вялікіх людзей, рэдка зберагаюцца ва ўмовах грамадзянскіх войнаў і рэвалюцый і доўга не супраціўляюцца часу, які разбурае ўсё. Але ўспамін пра Касцюшку, выбіты ў сэрцы кожнага сябра чалавецтва, дойдзе да самых аддаленых нашчадкаў і ніколі не будзе сцёрты. Нашыя нашчадкі не перастануць яго благаслаўляць, і слёзы ўдзячнасці, пралітыя імі на яго магіле, будуць найчысцейшай данінаю павагі да ягоных дабрадзейных якасцяў" [2, с. 118].

Менавіта, М.К. Агінскі першым на Беларусі годна ўшанаваў імя Касцюшкі. Менавіта, сакратар вялікага кампазітара Аляксандр Ходзька ў сваёй паэме "Залессе" узгадвае пра два мемарыяльныя камяні, усталяваныя гаспадаром Залесся Агінскім у парку сядзібы. Адзін з іх прысвечыны паплечніку і сябру М. Клеафаса па паўстанню 1794 г. Тадэвушу Касцюшку і мае надпіс па польску "CIENIOM KOSCIUSZKI" (ЦЕНЯМ [ПАМЯЦІ] КАСЦЮШКІ). На другім камяні высечаны надпіс: "INSTITUTORI SUO JOAN. ROLAY GRATUS DIS-

CIPULUS M. O. MDCCCXXII" (НАСТАЎНІКУ ЖАНУ РАЛЕЮ – УДЗЯЧНЫ ВУЧАНЬ М.А. 1822).

Дарэчы, другі камень у 1995 г. быў знойдзены мясцовымі краязнаўцамі з Залесся, а праз два гады студэнты з Віцебска, разам з вучнямі, настаўнікамі і іншымі аматарамі аховы гісторыка-культурнай спадчыны з Залесся і Смаргоні выкапалі і ачысцілі гэты камень і паставілі яго ў належным месцы парка [60, с. 96].

Сёння немагчыма ўстанавіць дакладную дату усталявання гэтых мемарыяльных камянёў і хто іх выканаўца, але дасканала вядома, што ініцыятарам і рэалізатарам іх быў, безумоўна, сам М. Клеафас. Магчыма, камяні з'явіліся ў канцы 1821 – пачатку 1822 гг. незадоўга да прыезду ў Залессе паэта А. Ходзькі і ад'езду князя з Залесся. Акрамя А. Ходзькі пра камяні ніхто з тагачасных гасцей Залесся ў сваіх мемуарах не гаворыць.

Камень у гонар Касцюшкі напамінае аўтару пра нешчаслівае каханне будучага героя Амерыкі і Еўропы да Людвікі Сасноўскай, што прымусіла Касцюшку пакінуць радзіму і з'ехаць, каб змагацца ў вайне за незалежнасць ЗША побач з першым іх прэзідэнтам Джорджам Вашынгтонам. Цікава, што паэт чамусці называе юную Сасноўскую Юляй.

Шмат эпітэтаў аўтар паэмы "Залессе" адрасуе Касцюшку, называючы яго "занадта адкрытым, занадта цнатлівым", "прыяцелем Вашынгтонаў і дарадцам у Франклінаў", "пастрахам для выскачак", "пагромцам Маскавіцінаў" і г.д. [4, с. 197-180].

Першы велічны копец (курган) герою на тэрыторыі сучаснай Беларусі быў насыпаны ў 1917 г. у г. Стары Быхаў Магілёўскай вобласці. З прыходам савецкай улады копец быў зруйнаваны [5, с. 220].

Месца найбольш верагоднага нараджэння Т. Касцюшкі – урочышча Мерачоўшчыны таксама мае багатую і шматпакутную гісторыю.

У 1845 г. тут пабываў беларускі мастак Міхаіл Кулеша, які ўпершыню намаляваў сядзібны дом. Крыху пазней гэта зрабіў мастак Кастрэўскі. Паступова дом прыйшоў ў запусценне. Але, дзякуючы дабрачыннасці, патрыятычным пачуццям і павазе да асобы Т. Касцюшкі гр. Вандаліна Пуслоўскага, адбылася першая рэканструкцыя сядзібнага дома Т. Касцюшкі пасля заканчэння будаўніцтва Косаўскага палаца ў 1857 г. Ажыццявіў рэканструкцыю сядзібнага дома варшаўскі архітэктар Міхаіл Астрамецкі.

У 1871 г. праз 26 гадоў пасля М. Кулешы Косаўскі гістарычны ансамбль наведаў таленавіты мастак Н. Орда і пакінуў нам у спадчыну

малюнак аднoўленай сядзібы на фоне ўзведзенага прадстаўнічага Косаўскага палаца. Першапачаткова выгляд яго быў крыху зменены, але інтэр'еры пакояў адпавядалі стылю сядзібнага дома незаможнай шляхты XVIII ст.

У міжваенны перыяд польскія ўлады сядзібны домік Касцюшкі мемарыялізавалі і стварылі ў ім музей Касцюшкі, а ў пакоі, дзе, паводле мясцовага падання, нарадзіўся Касцюшка, была ўсталявана памятная дошка з датамі яго нараджэння і асноўнымі датамі жыцця і дзейнасці [6, с. 156].

У гады 2-й сусветнай вайны домік-музей Касцюшкі разам з Косаўскім палацам быў спалены партызанамі.

Больш за 40 гадоў на месцы дома існавала пустка, а ў 1987 г. перад прыездам афіцыйнай польскай дэлегацыі тут быў усталяваны невялікі камень з надпісам на расійскай мове. Месца, дзе стаяў дом, было абнесена ланцугом.

У гэты перыяд у будынку Косаўскага вытворчага мэблевага аб'яднання быў створаны невялікі мемарыяльны куток Т. Касцюшкі.

У перыяд святкавання 250-й гадавіны з дня нараджэння нашага знакамітага земляка паводле ініцыятывы Польскай Касцюшкаўскай Фундацыі сумесна з Брэсцкім абласным Фондам імя Т. Касцюшкі былі адліты бронзавыя пліты, на якіх змяшчаўся тэкст з кароткай біяграфіяй Касцюшкі на беларускай і польскай мовах, яго барэльеф і тэкст аб хрышчэнні ў Косаўскім драўляным касцёле. Аднак дазвол ад уладаў быў атрыманы толькі на ўстаноўку пліты з актам хрышчэння. Астатнія пліты захоўваюцца ў Косаўскім касцёле, у падсобным памяшканні.

У 1997 г. на месцы сядзібы быў усталяваны вялікі мемарыяльны камень, на якім, паводле спецыяльнага рашэння Брэскага абласнога выканаўчага камітэта ад 23 сакавіка 1998 г., у 1999 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё бронзавай пліты Т. Касцюшку, выкананай берасцейскім мастаком Аляксандрам Пашкевічам.

4 снежня 2002 г. каардынацыйны савет аблвыканкама па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны разгледзеў пытанне аб аднаўленні дома Т. Касцюшкі і стварэнні ў ім мемарыяльнага музея, 20 студзеня 2003 г. гэтую прапанову падтрымаў аблвыканкам, які прыняў адпаведнае рашэнне.

У чэрвені-ліпені 2003 г. пад кіраўніцтвам беларускага архітэктара В. Собаля праведзены археалагічныя раскопкі сядзібнага дома, адначасова завершана праца па падрыхтоўцы праектнай дакументацыі

на рэканструкцыю дома (навуковы кіраўнік праекта архітэктар У.Казакоў).

На працягу сакавіка-кастрычніка 2003 г. была дасягнута дамоўленасць з пасольствам ЗША аб аказанні фінансавай падтрымкі амерыканскім урадам у будаўніцтве дома, а 23 верасня 2004 г. дом быў урачыста адчынены. Там пастунова фарміруецца мемарыяльны музей Т. Касцюшкі.

Адначасова вялася карпатлівая праца па ўшанаванні імя Т. Касцюшкі ў в. Малыя Сяхновічы ў школе, якая размешчана ў былым радавым маёнтку Касцюшкаў-Сяхновіцкіх. Спачатку тут да 250-годдзя з дна нараджэння Т. Касцюшкі быў адчынены мемарыяльны пакой, а з 2011 г. у будынку школы пачаў дзейнічаць Жабінкаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

У 2006 г., паводле ініцыятывы пасольства ЗША, на тэрыторыі пасольства ў Мінску быў усталяваны бронзавы помнік-бюст Т. Касцюшкі, а ў Берасцейскім касцёле Уваздвіжання Святога Крыжа – мемарыяльная дошка ў памяць пра героя.

Дзякуючы працы Брэсцкага абласнога фонда імя Т. Касцюшкі, які дзейнічае з 1994 г. (з 2003 г. грамадскае гісторыка-культурнае абяднанне імя Т. Касцюшкі) была адноўлена ў 2004 г. мемарыяльная капліца-пахавальня воінаў-паўстанцаў 1794 г., палеглых у бітве з войскамі А. Суворава пад Крупчыцамі (Жабінкаўскі раён).

Касцюшкаўцы Берасцейшчыны ўняслі вялікі ўклад у развіццё двухбаковых адносін паміж Польскай Касцюшкаўскай Фундацыяй і Брэсцкім грамадскім гісторыка-культурным аб’яднаннем імя Касцюшкі, якія склаліся і рэалізуюцца з 1996 г. на падставе афіцыйна зарэгістраваных Статутаў і гадавых планаў работы.

На працягу апошніх 20 гадоў традыцыйна кожны год 4 лютага дэлегацыя Польскай Касцюшкаўскай Фундацыі з навукоўцаў і прыхільнікаў вывучэння польска-беларускай гісторыка-культурнай спадчыны ўдзельнічае ва ўрачыстасцях, прысвечаных дню нараджэння знакамітага ўраджэнца Беларусі, якія праводзяцца ў Доме-музеі Т. Касцюшкі ва ўрочышчы Мерачоўшчына (г. Косава Івацэвіцкага раёна).

Польскай Касцюшкаўскай Фундацыяй, асабіста яго старшынёй сп. Кшэснякам Л.М., перададзены ў экспазіцыю Дома-музея Т. Касцюшкі адзенне і шабля (копіі), а таксама бюст героя, гарматныя кулі і іншыя каштоўныя археалагічныя знаходкі з апошняга поля бітвы пад

Мацыёвіцамі, шэраг матэрыялаў (копій) з архіваў, музеяў і бібліятэк Польшчы аб жыцці і дзейнасці Касцюшкі.

У 1994 г. кіраўніцтвам Польскай Касцюшкаўскай Фундацыі разам з грамадскімі аб'яднаннямі Санкт-Пецярбурга таксама была ўсталявана мемарыяльная пліта ў гонар Т. Касцюшкі ў Санкт-Пецярбургу.

Брэсцкае грамадскае гісторыка-культурнае аб'яднанне імя Т. Касцюшкі з'яўляецца актыўным ўдзельнікам на Міжнародных навукова-практычных канферэнцый, праведзеных на Брэстчыне ў 1997–2012 гг., прысвечаных жыццю і дзейнасці знакамітых дзеячаў польска-беларускай гісторыі і культуры, ураджэнцаў Беларусі – Напалеона Орды, Юльяна Урсына Нямцэвіча, Адама Міцкевіча, Рамуальда Траўгута, Тадэвуша Касцюшкі, Тадэвуша Рэйтана, Марыі Радзівічуўны і інш., а таксама ўдзельнікам штогадовых Міжнародных Касцюшкаўскіх навуковых сімпозіўмаў у мястэчку Мацеёвіцы (поле апошняй бітвы Т. Касцюшкі).

Пачынаючы з 2006 г. на падставе сумеснага плана па развіццю турызму сярод моладзі паміж Польскай Касцюшкаўскай Фундацыяй, Брэсцкім грамадскім аб'яднаннем імя Т. Касцюшкі і камітэтам прафсаюза работнікаў культуры Брэсцкай вобласці адбылося 38 выездаў у Польшчу з выступленнямі калектываў мастацкай самадзейнасці Брэстчыны ў школах, ліцэях і гімназіях імя Т.Касцюшкі. У гэты лік уваходзяць выезды дэлегацый гісторыкаў, бібліятэчных і музейных работнікаў, архітэктараў, рэстаўратараў Брэстчыны з мэтай наведвання і вывучэння арганізацыі аховы гісторыка-культурнай спадчыны на шэрагу архітэктурных аб'ектаў і гістарычных мясцін Польшчы (Варшава, Грунвальд, Кракаў, Бяла-Падляска, Тэрэспаль, Торунь, Познань, Замасць, Беласток, Гарволін і інш.).

Арганізавана больш за 30 выездаў польскіх турыстычных маладзёжных груп з ліцэяў, школ і гімназій ім Т. Касцюшкі па гістарычных мясцінах Брэстчыны, звязаных з жыццём і дзейнасцю знакамітых дзеячаў польска-беларускай гісторыі і культуры, у тым ліку Т. Касцюшкі, Ю.У. Нямцэвіча, С. А. Панятоўскага, А. Міцкевіча, Н. Орды і інш.

Дэлегацыя Польскай Касцюшкаўскай Фундацыі брала ўдзел у адкрыцці музейнага комплекса А. Міцкевіча ў в. Завоссе Баранавіцкага р-на (1998 г.), Т. Касцюшкі ў г. Косава Івацэвіцкага р-на (2005 г.), мемарыяльнай капліцы 1794 г. і гісторыка-краязнаўчага музея ў в. Сяхновічы (радавое месца роду Касцюшкаў) Жабінкаўскага

р-на (2000, 2012 гг.), шэрагу мемарыяльных дошак на Брэстчыне, у т. л. прысвечаных Н. Ордзе ў Іванаўскім, Р. Траўгуту ў Маларыцкім і Кобрынскім раёнах і інш.

Па запрашэнні Польскай Касцюшкаўскай Фундацыі дэлегацыя Брэсцкага грамадскага гісторыка-культурнага аб'яднання імя Касцюшкі брала ўдзел у адкрыцці помнікаў Т. Касцюшку ў Польшчы (Варшава, Сталёвая Воля, Конін, Тэрэспаль, Кодэнь і інш. гарадах).

У 2015 г. Дому-музею Т. Касцюшкі аўтарам перададзена ў дар асабістае фартэпіяна XIX ст.

Літаратура:


1. Агінскі, М.К. Мемуары пра Польшчу і палякаў з 1788 да 1794 года / М.К. Агінскі ; пер. з франц. В. Рамановіч // ARCHE. Забытае стагоддзе. – № 6 (105). – 2011. – С. 461-722.
2. Несцярчук, Л.М. Міхал Клеафас Агінскі : Ліцвін, Патрыёт, Творца / Л.М. Несцярчук. – Брэст : аблдрукарня, 2015. – 356 с.
3. Верамейчык, С.І. Міхал Клеафас Агінскі, 1765-1833. Продкі, жыццё ў Залессі, нашчадкі (спроба храналогіі) / С.І. Верамейчык. – Мінск : Кавалер, 2008. – 128 с.
4. Ходзька, А. Залессе : паэма / А. Ходзька ; пер. і камент. В. Калніна; уступ. Л. Ходзькі ; пер. уступа А. Рабцовай і В. Рамейкі / А. Ходзька // Спадчына. – 1997. – № 3. – С. 192–207.
5. Несцярчук, Л.М. Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка : вяртанне героя на радзіму / Л.М. Несцярчук. – Брэст : Аблдрукарня, 2006. – 296 с.
6. Несцярчук, Л.М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X-XX стст. / Л.М. Несцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 336 с.

*Бахановіч Н.Л. (Мінск)*

# КАСЦЮШКАЎСКІЯ ЧАСЫ ЯК ЛЕЙТАМАТЫЎ АПОВЕСЦІ "ПОЛАЦКАЯ ШЛЯХТА" ВОЙСЛАВА САВІЧА-ЗАБЛОЦКАГА

Абнаўленне карты Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы ў канцы XVIII ст., у межах якога адбыўся ў тым ліку і трохэтапны падзел Рэчы Паспалітай паміж трыма суседнімі краінамі, засведчыла вызначальную па сваіх наступствах змену палітычнага статусу беларускай зямлі. Уражальны і неабвержны факт уздзейнічае на светаадчуванне, светабачанне і светаразуменне тагачасных грамадзян, а г. зн. і на мастацтва слова XIX ст., дзе заканамерна становяцца заўважнымі рост свядомасці і самасвядомасці нашага народа. Прыкметы гэтага ўздзеяння, думаецца, відавочныя таксама ў мастацкай прозе, якая ў дадзены перыяд развіцця літаратуры пераважна польскамоўная. Яшчэ Арыстоцель падкрэсліваў, што проза сярод іншых літаратурных родаў здольная да больш аб'ектыўнага ўзнаўлення жыццёвага матэрыялу. Над яе пазнавальнымі ўласцівасцямі дагэтуль разважаюць даследчыкі: "Задача прозы больш "прадметная", "зямная", – бо галоўным аб'ектам мастацкай творчасці тут быў чалавек, звязаны з умовамі свайго існавання, уцягнуты ў супярэчнасці грамадскага жыцця, абцяжараны сацыяльнымі зносінамі, традыцыямі, звычаямі, павер'ямі, забабонамі і г. д." [2, с. 33], – адзначае Л. Гаранін. Нават павярхоўны агляд польскамоўнай прозы Беларусі XIX ст. дазваляе гаварыць пра тое, што ў многім яна засяроджана на недалёкім мінулым разам з яго парадкамі, ладам жыцця, настроямі і ідэаламі. Да самага канца стагоддзя яны валодаюць абсалютнай каштоўнасцю, што дэманструе ў тым ліку і аповесць "Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта". Яе разгляд у згаданым аспекце дазволіць асэнсаваць пераемнасць гістарычных эпох і змены ў айчынным менталітэце.

Адна з перакладчыц аповесці В. Савіча-Заблоцкага на беларускую мову Ж. Некрашэвіч-Кароткая вызначае агульную скіраванасць гэтага твора: "Падзеі, што складаюць аснову сюжэта "Арлалётаў і Падканвойнага", разгортваюцца ў самым пачатку XIX стагоддзя, адразу пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і паўстання Тадэвуша Касцюшкі, у той час, калі, як лічыць аўтар, пачалі адбывацца карэнныя змены ў свядомасці і ментальнасці беларусаў, калі прыхільнікі старой шляхецкай культуры адчайна змагаліся з

магутным і разбуральным уплывам новай цывілізацыі і новай ідэалогіі, якую неслі з сабой прадстаўнікі гэтай цывілізацыі" [4, с. 123]. Прадстаўленай у самым пачатку "гульнёй слоў" В. Савіч-Заблоцкі задае тон усяму твору: "...*«сякерак век» мінуў, а «малых брушкаў» надышоў!.. (век сякерак – век 18-ты: сякерка – лічба 7, пісаная па-арабску; малых брушкаў век – век 19-ты; знак 8 «двума брушкамі» завецца)*" [5, № 1, с. 126]. З дапамогай такой "графічнай метафары" пісьменнік, па-першае, апелюе да падзей падзелу Рэчы Паспалітай і звязанага з ім узброенага выступлення на беларускай тэрыторыі, па-другое, адмаўляе негатыўныя праявы сучаснасці праз параўнанне іх са старасвецкімі шляхецкімі традыцыямі. Дзве названыя тэмы разам і ўтвараюць своеадметны лейтматыў твора – праслаўленне часоў, звязаных з паўстаннем Тадэвуша Касцюшкі. "Цень" гэтага рамантычнага героя, а значыць і рэальнага чалавека, які змагаўся за палітычнае аднаўленне краіны і захаванне спрадвечнага грамадскага ладу як у яго духоўна-псіхалагічных, так і матэрыяльна-побытавых праявах, адносіны самога пісьменніка да мінулага прыкладна стогадовай даўніны. На думку даследчыка М. Хаўстовіча, пад псеўданімам "Пламеньчык", які суправаджаў артыкул "Беларуская песня пра Касцюшку", увогуле мог хавацца сам аўтар аповесці "Полацкая шляхта" або нехта не меней "замілаваны ў беларускую гісторыю ды беларускі фальклор" [9, с. 44].

Вобразная сістэма твора скіравана да апявання страчанай краіны Рэчы Паспалітай – парадкаў, якія ў ёй панавалі, і сэнсава-каштоўнаснай сістэмы яе грамадзян. Адпаведна ў цэнтры твора знаходзіцца стылізаваны вобраз апавядальніка – дзевяностагадовага Паўла Завішы: напрыканцы жыцця ён адважыўся па просьбе дачкі, знакамітай аўтаркі, апісаць падзеі часоў сваёй маладосці, сведкам якіх давялося быць. Наратар сюжэтам і шматлікімі лірычнымі адступленнямі стварае выразны лейтматыў памяці аб мінулым. Вобраз старога – адзін са сталых атрыбутаў рамантычнага слоўнага мастацтва, які ў польскамоўнай прозе Беларусі XIX ст. трансфармуецца аўтарамі ў адпаведнасці з актуальнымі ў той час грамадска-гістарычнымі патрэбамі. Такі наратар узнаўляе гісторыю не толькі ў значных падзеях дзяржаўнага маштабу, але і як пэўны тып культуры, і ў побытавых дробязях. Прыналежнасць выяўленага вобраза апавядальніка да старога пакалення і адпаведна тагачаснага ладу жыцця характарызуюць такія заўвагі: "*што ў тыя часы падавалася толькі ў панскіх дамах*" [5, № 4, с. 136], "*рэдкія яшчэ на*

*той час акуляры*” [5, № 6, с. 158], “*паводле старога нашага звычаю...*” [5, № 6, с. 168], “*падагрэтае піва або вінны ці які-небудзь іншы напой, запраўлены карэннямі (а не каву або гарбату, што было яшчэ рэдкасцю), пілі тады ў нашых дамах з ранку пасля абуджэння*” [5, № 6, с. 155] і г. д. Па гэтых рэмарках можна вывучаць гісторыю, культуру і побыт людзей XIX ст., у прыватнасці прадстаўнікоў параўнальна вялікага на беларускай зямлі шляхецкага саслоўя.

Чалавек старога пакалення патэнцыяльна памятаў даволі адцягненыя па часе падзеі: ён дакладна ведаў гісторыю і мог у яркіх фарбах пра яе расказаць. Інфармацыя аб мінулым набывала штораз большую каштоўнасць з пункту погляду таго, што XIX ст. у жыцці народаў былога Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай было трагічным перыядам, які можна ўмоўна назваць этапам ліквідацыі шляхецкага саслоўя ўладамі Расійскай імперыі, да якой былі далучаны нашыя землі. Немагчымасць пацвярджэння свайго паходжання вялікай колькасцю дробнай шляхты (дакументы не захоўваліся або вынішчаліся пажарамі ці ваеннымі падзеямі) ператварала жыццё многіх з іх у сапраўдную трагедыю. Носьбіты высакароднай свядомасці, якія жылі і працавалі сярод прадстаўнікоў знакамітай беларускай магнатэрыі, збяднелыя шляхціцы вымушаны былі зліваццa з сялянствам. Зневажальнасць гэтага працэсу абумоўлівалася не толькі стратай статусу, але і неабходнасцю плаціць падаткі, і абавязкам аддаваць дзяцей у царскія рэкруты. Таму ўзрастала значнасць і самога пакалення, якое застала мудры лад жыцця, і апалагізацыі мінулага ў літаратуры. Да таго ж паступовае знікненне шляхты як такой у сувязі з царскімі рэформамі і рухам часу наперад выклікала натуральнае жаданне пакінуць нашчадкам мастацкае ўвасабленне высакароднасці, шляхетнасці як такой. Прысутная ў айчыннай ментальнасці павага да папярэдняга пакалення мела на ўвазе абсалютную пераканаўчасць і безапеляцыйнасць пачутага, што ў сваю чаргу садзейнічала аўтарскім мэтам. Сярод намераў напісання і выдання твораў, у тым ліку і дадзенага, заўважнае жаданне навучыць чытача, а таксама “задакументаваць” і перадаць наступнікам “праўду”: “*Урэшце рэшт, усё, што я пішу, усе гэтыя мізэрныя апавяданнейкі не для таго выпускаю надрукаванымі ў свет, каб вастразубыя заілы ўздымалі іх на свой кол і каб з іх нагоды плявузгала потым мноства языкоў. Пішу іх, бо хацеў быў я для сваіх нашчадкаў і для іншых, што добразычліва ставяцца да гэтай працы, намаляваць праўдзівую выяву свайго часу...*” [5, № 6, с. 180]. Сацыяльная адказнасць за падзеі, што

адбываліся ў актуальны для аўтара аповесці час, выяўляецца ў жаданні выказаць гістарычную праўду. Такая арыентацыя дазваляла пісьменнікам ачысціць сумленне і папярэдзіць абвінавачванні нашчадкаў у бяздзеянні ў складаны перыяд часу.

Глыбейшага разумення прычын актыўнага фігуравання постаці старога чалавека і праслаўлення мінулых часоў у наратыўнай прасторы твораў дапамагаюць дасягнуць навукова-папулярныя працы сучаснага амерыканскага псіхолага К. Эстэс. Яна скіроўвае сваю чытацкую аўдыторыю да старых людзей як носьбітаў індывідуальна-родавай фальклорнай спадчыны з мэтай яе асэнсавання, захавання і трансляцыі. Даследчыца лічыць, што, калі знікне старое пакаленне, знікнуць і казкі, якія яна разглядае ў сваіх кнігах у якасці лепшых лекаў для чалавечай душы: "Я горача падтрымліваю тых, хто вяртае казкі сваёй сямейнай спадчыны, захоўвае іх, выратоўвае ад смерці – выніка занядбання. Бо паўсюль на зямлі касцяк усіх лекарскіх і духоўных структур складаюць старыя" [7, с. 596]. Для В. Савіча-Заблоцкага стары чалавек каштоўны тым, што захоўвае ў памяці агульнанародную духоўную спадчыну. Асэнсоўваючы падзеі XX ст., становіцца ясна, наколькі важным і актуальным было апяванне страчанага і барацьбы за яе вяртанне напярэдадні наступлення культа моладзі, які разам са знікненнем саслоўнага падзелу зойме ключавое месца ў савецкай дзяржаве. Гэта аўтарская спроба і панастальгіраваць у "псіхатэрапеўтычых" мэтах, і прыгожа развітацца з некалькімі самастойнымі этапамі ў жыцці Беларусі.

І ўсё ж у разглядаемай аповесці, якая была надрукавана напрыканцы XIX ст., такі заангажаваны ў мінулае вобраз старога чалавека, выяўленага ў якасці наратара, мог успрымацца чытачамі як вельмі несучасны, неадпаведны даўно змененым, якасна іншым грамадскім умовам. Таму В. Савіч-Заблоцкі пазіцыянуе яго ў якасці даніны прыгожай традыцыі, літаратурнай "модзе", а таксама як элемент стылізацыі мастацкага твора. Павел Завіша кідае сваю кніжку на падлогу, раз'юшаны абставінамі таго, што яго запісы апублікаваныя, ды яшчэ ў такім скажоным (з-за няшчаднай рэдактарскай праўкі роднай дачкі) выглядзе. Стыль аказваецца нібы зменены да непазнавальнасці, а паўсюль расстаўленыя пазнакі і тлумачэнні архаізмаў, лацінізмаў, старажытных слоў: "*Дык што ж гэта такое! Нашто ж гэта каню пятая нага? Хіба ж можа быць такі чалавек, што не разумее лаціны?*" [5, № 6, с. 177], – так ствараецца эфект старасвецкай адукаванасці апавядальніка. Перад

намі адна з варыяцый той "гульні" з чытачом, якая вядзецца на працягу ўсяго твора на ўсіх узроўнях яго мастацкай структуры і якую варта разглядаць у якасці праявы любові і павагі да гісторыі свайго народа.

Сюжэт аповесці "Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта" пабудаваны на ідэі супрацьстаяння прадстаўнікоў двух шаноўных і аднаго ганебнага родаў. Арлалёты і Мечнікі (аўтар карыстаецца літаратурным прыёмам называння герояў у адпаведнасці з іх пазітыўнай або негатыўнай сутнасцю) пазіцыянуюцца як носьбіты і транслятары добрых, прыгожых старадаўніх традыцый. Гажагорскія паўстаюць як руйнавальнікі спрадвечнага ладу жыцця, арыентаваныя на бяздумнае перайманне новага і іншаземнага. Падкрэсліваецца старажытнасць роду Арлалётаў, якія з'явіліся ў Польшчы ў часы Баляслава III Крывавуснага (XII ст.), што аўтаматычна надае яго нашчадкам арэол знакамітасці, ушанаванасці, ганаровасці. Любоў братоў Арлалётаў да роднага краю не з'яўляецца абстрактнай з'явай і складаецца з вернасці запаветам бацькоў як нормам традыцыйнай культуры з яе непарушнымі маральнымі і хрысціянскімі ідэаламі. Негатыўнае аблічча Гажагорскага абумоўлена тым, што яго продкі шмат і на працягу доўгага часу "грашылі" перад краінай, народам, Богам (адпаведна пра іх ходзіць няслава). Супрацьстаянне родаў падкрэсліваецца і праз даўнасць канфлікту паміж сем'ямі, напрыклад, калі Януш Павел Арлалёт намерваецца адлупцаваць "*маладога нелюдня*" мацней, чым некалі яго праведны стрый – распуснага бацьку Гажагорскага. "*І я зусім не асуджаю гэтага, наадварот: якое дрэва, такі клін, які бацька, такі сын! І праўзор усялякай міласэрнасці, Бог аж у дзясятым пакаленні мае звычай караць вінаватага! І тым самым гаворыць нам, людзям, што ацэнка чалавека будзе жыць вельмі трывала ў народах, якія жывуць па Яго законах, што ацэнка тая ў іх павінна быць гамульцам для пэўных індывідаў*" [5, № 1, с. 151], – эмацыянальна разважае апавядальнік. Павел Завіша штораз сягае ў мінулае, паказвае прычынна-выніковыя сувязі з сучаснасцю, што дэманструе наяўнасць спадчыннасці ў асновах нацыянальнага менталітэту, у прыватнасці прадстаўнікоў беларускай шляхты.

Сям'я Мечнікаў прадстаўлена старым бацькам і яго дачкой на выданні Зоф'яй, а пра іншых членаў сям'і гаворыцца толькі намёкамі аб невылечным смутку: "*...стары бацька глядзіць на згасанне свайго роду, бо з ласкі Божай не меч над яго дзіцячай калыскай, але кудзеля заткнута. Гэта – стары Мечнік і дачка яго Зоф'я*" [5, № 1, с. 126].

Прычына адсутнасці нашчадкаў па мужчынскай лініі палягае ў агульнанароднай трагедыі, пра якую ў творы гаворыцца толькі ўскосна, нібы шэптам. Але алюзія на паўстанне пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі ў 1794 годзе ўсё ж дастаткова зразумелая: "*І вось – толькі курган, на ім шэсць крыжоў, і то без подпісу, бо ставіць помнік ліхадзеям – злачынства!.. Благаслаўлёны, аднак, Род, што мае многа такіх ліхадзеяў: ушанавання варты, калі не дашукаецца ліку такім злачынствам*" [5, № 1, с. 140–141]. Лёс краіны заўсёды адбіваецца на перыпетыях жыцця звычайных людзей, пра што, азіраючыся ў гісторыю, неаднойчы разважаў В. Быкаў, напрыклад у адным з інтэрв'ю: "Я перакананы, што гісторыя і асабісты лёс узаемазвязаныя. Глядзіце, калі каркаломныя павароты здараюцца заўсёды так непрадказальна, як яно заўсёды было ў нашай гісторыі, дык чаго можа чалавек спадзявацца ад свайго асабістага лёсу? (...) Безумоўна, гэта моцна адбіваецца як на асабістым жыцці чалавека, так і на калектыўным жыцці грамадства" [1, с. 349]. В. Савіч-Заблоцкі гераізуе лёсы тых, хто загінуў у паўстанні Тадэвуша Касцюшкі, і атачае арэолам святасць нашчадкаў іх шаноўных знакамітых родаў.

Апагеем вернасці ідэалам канца XVIII ст. выступае апісанне пахавання прадстаўніка старэйшага пакалення – Мечніка, якое дэманструе ўзор беларускай талерантнасці: на ім мірна прысутнічаюць прадстаўнікі ўсіх прысутных на гэтай тэрыторыі канфесій. Рытуал суправаджаецца прамовай сівабародага ксяндза Базылі, асноўным пасланнем якой становяцца сумныя думкі: "*няма ўжо людзей – сышло ў нябыт старое пакаленне*" [5, № 6, с. 167], "*няма правадыроў народных*" [5, № 6, с. 167] і г. д. Пазіцыянуючы сябе як пасланца Бога да "*малых народаў*", якія спяць мёртвым сном, святар арыентуе маладых браць прыклад з продкаў. Ён эмацыянальна прамаўляе да прысутных на пахаванні людзей: "*Народ мой! Нічога не гавораць вам сэрцы вашыя – труп скажа! Вы мёртвыя – памёрлы вас ажывіць... Дыхнула смерць на вас і сталіся вы раскіданым па розныя бакі прахам – ён дасць Вам жыццё і еднасць! Я вею на вас яго памяццю, вею штандарам Чысціні і веры – няўжо ж не ажывеце? Няўжо не зменіцеся ў аснове сваёй? Пужлівыя жаўнеры, што ідзеце ўроскідзь, ці ж вы не далучыцеся да мяне і не пойдзеце ў бой з вашым святаром? Гэты труп – не мёртвы, але вы – мёртвыя! Гэты труп – жывы, але вы павінны ўваскрэснуць! Абуджайцеся ж! Абуджайцеся і збірайцеся на гэтым месцы, бо спазнаеце Праўду, а Праўда вас разняволіць!*" [5, № 6, с. 167]. Ксёндз параўноўвае цяперашні стан

краіны з Ерусалімам у руінах, а яе народ – з габрэямі, якія перасталі бачыць Бога, матывуе ратаваць сябе.

Увага да папярэдняга пакалення – рыса сталага грамадства, якое памятае і паважае сваю гісторыю, што і імкнуліся пранесці ў будучыню нашчадкі айчыннай інтэлектуальнай эліты. На працягу ўсяго твора аўтар-апавядальнік прыводзіць супастаўленне мінулых і сучасных дзён, напрыклад, узгадвае, што раней на пасады прызначалі не "*маладзёнаў*", а толькі мудрых і вопытных, у адрозненне ад цяперашніх парадкаў. Прадметам увагі ў каментарыях становяцца і зусім не апымістычныя перамены маральна-этычнага плану: "*...даўней усе без выключэння былі добра выхаваныя, у той час як сёння – толькі добра адукаваныя; але гэтым разумнікам вельмі не хапае выхавання, што для грамадства больш важна і істотна*" [5, № 3, с. 82]. Заўважаецца, што "*польскія дамы ўвесь час страчваюць свой даўнейшы характар...*" [5, № 1, с. 139] і г. д. Паказальна, што даследчык менталітэту правінцыйнай шляхты ў рускай літаратуры другой паловы XIX ст. Р. Чахор штораз называе яе асяродак "запаведнікам дваранства" [6, с. 31]. Высакароднае саслоўе на беларускай, а таксама польскай, расійскай тэрыторыях адчувала блізкасць карэнных зменаў, таму "настальгіравала" па мінулым і па-мастацку запавольвала незваротны працэс абнаўлення грамадскага ладу.

Адзнака нязменнага патрыятызму пакладзена ў аснову разважанняў аўтара пра Польшчу, Рэч Паспалітую, Рэспубліку, Свабоду, Помсту. Апяваючы ў лірычных адступленнях Свабоду і барацьбу за яе, В. Савіч-Заблоцкі паралельна ганьбіць грамадскую з'яву Рэакцыі: "*Так, як следам за любой вайной крочыць нягода, пошасць, якая падчышчае са свету крыклівыя істоткі, што называюцца "людзьмі", – так следам за безвыніковымі высілкамі вярнуць свабоду надыходзіць штосьці ў сто разоў горшае за пошасць – Рэакцыя. Рэакцыя – гэта ганьба Чалавецтва. Яна – доказ чалавечай слабасці, сведка нікчэмнасці народа. Народы, што саступаюць рэакцыі, часта і доўга не могуць набыць самадастатковасці, не могуць набыць свабоды, бо яны не вартыя Яе*" [5, № 3, с. 105]. Пад палітычнай рэакцыяй разумеецца рух за захаванне існуючых палітычных парадкаў і падаўленне рэвалюцыйных памкненняў. Прыкладна ў гэты ж час расійскі кансерватыўны публіцыст М. Каткоў лічыць рэакцыю выратавальнай з'явай, праз якую арганізм здольны выкінуць хваравіты пачатак і аздаравіць сябе [3, с. 381].

Такім чынам, праслаўленне мінулага – гераічных часоў паўстання Тадэвуша Касцюшкі, тых духоўных ідэалаў і грамадскіх парадкаў, за захаванне якіх ён змагаўся, сталі ў польскамоўнай аповесці "Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта" В. Савіча-Заблоцкага прыгожым, своеадметным, цалкам адпаведным дальнабачнай аўтарскай задуме, лейтматывам.

Літаратура:


1. Гімпелевіч, З. Літаратура застанецца. Фрагменты інтэрв'ю з Васілём Быкавым / З. Гімпелевіч // Беларусь і Беларусы ў прасторы і часе : зб. да 75-годдзя праф. А. Мальдзіса ; пад рэд. С. Запрудскага, А. Фядуты, З. Шыбекі. – Мінск : Лімарыус, 2007. – С.349–354.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Нацыян. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. ; [навук. рэд. І.Я. Навуменка, В.А. Каваленка]. – 3-е выд. – Т. 1 : 1901–1920 / Л.Я. Гаранін [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 583 с.
3. Катков М. Н. Что значит слово реакция? Государственная власть. Наши либералы // Имперское слово. – М. : Изд-во журнала "Москва", 2002. – 512 с.
4. Некрашэвіч-Кароткая, Ж. Вяртанне Арлалёта / Ж. Некрашэвіч-Кароткая // Полымя. – 2004. – № 1. – С. 122–124.
5. Савіч-Заблоцкі, В. Арлалёты і Падканвойны, або Полацкая шляхта / В. Савіч-Заблоцкі // Полымя. – 2004. – № 1. – С. 124–164 ; № 3. – С. 68–111 ; № 4. – С. 134–159 ; № 6. – С. 155–180.
6. Чахор, Р. Менталитет провинциального дворянства в период общественно-политических изменений второй половины XIX века (на примере литературных произведений) / Р. Чахор. – Вроцлав : фонд "Русско-польский институт", 2013. – 200 с.
7. Эстэс, К.П. Бегущая с волками : женский архетип в мифах и сказаниях / К.П. Эстес ; пер. с англ. – М. : ООО Изд-во "София", 2008. – 656 с.
8. XIX стагоддзе : навукова-літаратурны альманах. – У 2-х кнігах. – Кніга першая. – Мінск : Белдзяржуніверсітэт, 1999. – 214 с.

*Горбушина И. Л. (Минск)*

## КОСТЮШКО И МУЗЫКА

Тадеуш Костюшко известен прежде всего как политический деятель, чей талант полководца, военного инженера и революционера проявился не только на родной земле, но и за ее пределами. Национальный герой Польши, борец за независимость США, почетный гражданин Франции... Безусловно, такие фигуры поистине мирового масштаба, каким был Т. Костюшко, уже при жизни становятся мифами о самих себе, будоражат фантазию писателей, поэтов, музыкантов, художников. Образ Костюшко отразился во многих музыкальных произведениях, как вокальных, так и инструментальных; песни о нем стали поистине народными.

Музыкальное образование во времена Тадеуша Костюшко было непременным атрибутом воспитания шляхты. Как отмечает О. В. Дадиомова, «бліскуча адукаваныя знатакі і апякуны мастакоў, яны часта наведвалі музычныя сталіцы свету і падтрымлівалі асабістыя кантакты са славутымі кампазітарамі і выканаўцамі, цудоўна разбіраліся ў музыцы і былі знаёмы з усімі дасягненнямі і моднымі навінамі ў гэтай галіне» [1, с. 11]. Т. Костюшко играл на фортепиано и клавикорде, сам сочинял музыку. До нас дошли три его произведения – два Полонеза и Вальс для фортепиано. Полонез до мажор написан в традиционной для этого жанра форме *Da Capo* с трио. Фактура изложения включает в себя и альбертиевы басы, и аккордовый аккомпанемент. Мелодия в основном проводится в терцовом удвоении, что характерно и для другого полонеза автора. Вальс соль мажор написан в трехчастной форме в размере 3/8 и изобилует частыми репризами. Так, каждое предложение (восьмитакт) предписано сыграть дважды. Примечательно, что фактура аккомпанемента Вальса решена в виде ритмической пульсации аккордов или отдельных повторяющихся звуков, в отличие от более привычной нам вальсовой фактуры «бас и два аккорда».

Наибольшую популярность приобрел Полонез си-бемоль мажор (1792 г.), став впоследствии известным как «Полонез Костюшко» (*Polonez Kościuszki*). Различные источники свидетельствуют о неоднозначности признания авторства этой музыки за Т. Костюшко: одни считают автором Яна Барчинского, другие указывают на некоего «неизвестного польского автора конца XVIII века», третьи все же убеждены, что это сам Тадеуш. Изначально Полонез был написан для фортепиано, но вскоре появился текст (возможно, самого Костюшко)

«*Podróż twoja nam niemiła*», где речь идет о прощании с Родиной. После восстания в Польше 1830 года у Полонеза появился другой текст, написанный Райнольдом Суходольским – «*Patrz, Kościuszko, na nas z nieba*» (1831 г.). Так «Полонез Костюшко» стал патриотической песней, подхваченной народом. Мажорному ладу и бодрому характеру музыки больше соответствует второй вариант текста, нежели меланхоличное «прощание с Родиной». Следует отметить, что мелодии Полонеза стали своеобразной «музыкальной визитной карточкой» Т. Костюшко. Будучи широко известным и, как следствие, узнаваемым, Полонез послужил основой для музыкальных сочинений других композиторов, содержание которых было связано с личностью польского героя.

Здесь хотелось бы отметить некоторые сочинения польских композиторов 10-х годов XIX века, посвященных Т. Костюшко. Это фантазия для фортепиано Йозефа Томасини «Смерть Тадеуша Костюшко» (1818 г., не сохранилась), также «Большая траурная фантазия памяти трех героев – князя Понятовского, Костюшко и Домбровского, посвященная польской нации» (1818 г.) Вацлава Вюрфеля. Примечательно, что в ней используются мелодии, вызывающие ассоциации с героями произведения: любимый марш Понятовского «Память о преданности Родине», трио из Полонеза Костюшко и Мазурка Домбровского. Францишек Лессель в 1810 г. написал, а в 1813 г. опубликовал «Попурри для фортепиано с оркестром» (впоследствии переименованный автором в «Каприс с вариациями»), где использовал две польские темы: Полонез Костюшко и краковяк. «Музыкальный памятник Костюшко, адресованный соотечественникам» (1825 г.) для фортепиано, был написан Казимежем Новакевичем. В основе этой пьесы лежит Полонез Костюшко, разрабатываемый в форме вариаций, а в завершении звучит Мазурка Домбровского, претерпевающая ритмические изменения.

Остановимся на довольно необычном сочинении «Элегия на смерть Костюшко» Кароля Курпиньского. Она написана в 1818 г., то есть через год после смерти Т. Костюшко, на стихи К. Тимонского и предназначена для фортепиано и чтеца. Автор указывает, что в исполнении должны принимать участие два человека, поскольку одному это сделать очень трудно. Сочинение представляет собой чередование музыкальных и текстовых фрагментов, иногда декламировать предписано вместе с музыкой, но в свободной манере и в одном эпизоде «декламирующий должен говорить слоги вместе с нотами, подобно

пению». Музыкальные фрагменты ярко иллюстрируют содержание текста: это и скорбь по ушедшему из жизни герою, и прославление идей свободы, и пасторальные сцены, и воспоминание о подвигах в Америке. Композитор также использует цитаты-маркеры, усиливающие впечатление от поэтического текста. Так, повествование о борьбе за независимость в США сопровождает Марсельеза. Когда речь идет о плене, звучит Полонез 1795 года «Принятие Костюшко в неволе» (*Wzięcie Kościuszki w niewolą*). Ремарку с названием этого Полонеза дает сам композитор, однако его авторства не указывает. Звучит в Элегии и «Полонез Костюшко», но в миноре, при этом размер изменен на 4/4. Впрочем, это компенсируется пульсацией четвертями, что в итоге уравновешивает метрическую первооснову Полонеза. Благодаря смене контрастных по содержанию и музыкальному языку эпизодов, произведение воспринимается на высоком эмоциональном подъеме. В свою очередь, фрагмент из Элегии К. Курпиньского (причем именно тот, который автор предписывает декламирующему читать с совпадением слогов текста с мелодией) использует Ф. Шопен в своей Фантазии на польские темы op.13.

В 1821 г. драматург Константин Майерановский написал пьесу «Костюшко на Сене» (*Kościuszko nad Sekwaną*). Год спустя композитором Франциском Салезием Дуткевичем была написана одноименная опера в двух актах (автором либретто стал К. Майерановский). Опера шла в Кракове, а также в Познани (в рамках гастролей краковской труппы). Отдельные фрагменты звучали и в концертном исполнении. Об этом свидетельствует газета «Кракус» от 18 июня 1822 г. (№121): «В воскресенье, 23 июня в зале Кнотца, музыкального общества, будет дан большой концерт вокальной и инструментальной музыки. Среди представленных произведений будут исполняться хоры композитора Дуткевича из оперы «Костюшко на Сене» [3]. Что касается непосредственно содержания, то оно имеет политическую подоплеку. Как отмечает Галина Филиппович, «фактически, [пьеса] «Первая любовь Костюшко» и ее продолжение, «Костюшко на Сене» – это дань уважения царю Александру I, который сыграл важную роль в создании Королевства Польши в результате водворения Венского конгресса 1815 года» [2, с. 38]. По-видимому, эта опера была актуальна во времена ее написания, сведения об ее исполнении в наши дни фактически отсутствуют.

Несколько слов хотелось бы сказать о народных песнях о Тадеуше Костюшко. Одна из самых известных – «Краковяк Костюшки» (*Kra-*

*kowiak Kościuszki*) посвящена битве под Рацлавицами. Начинается она словами «Бартошу, Бартошу» – обращением к имени героя этой битвы Бартоша Гловацкого, отличившегося в восстании Костюшко 1794 г. Автор слов – польский поэт и переводчик Марцелий Скальковский. Это стихотворение он написал в возрасте 19 лет, и оно, как и ряд его произведений, впоследствии было положено на музыку. Поскольку автор музыки неизвестен, песню по праву причисляют к народным. Еще одна песня, повествующая о битве под Рацлавицами, где прославляются Т. Костюшко и Б. Гловацкий – «Хэй, там в корчме» (*Hej, tam w karczmie*) (1831 г.), автор текста – Винсент Пол. Песня «Вперед, братцы, вперед живо» (*Dalej chłopcy, dalej żywo или Pobudka Krakusów*) вышла из мелодрамы Владислава Людвика Анчица с музыкой Казимежа Хофмана «Костюшко под Рацлавицами», поставленной в 1880 г. в Кракове. Текст этой песни был заимствован из двух народных песен. Как отмечает Мария Вахолк, «первая часть (8 строк) происходит из подлинной песни косиньеров, исполнявшейся во время восстания Костюшки на мелодию мазурки. Следующий фрагмент, начинающийся со слов «Alboświa jacy» — это начальный фрагмент другой известной краковской песенки. Мелодия Казимежа Хофмана, выдержанная в ритме жизнерадостного краковяка, прочно связалась со старыми текстами песни, вытеснив мотивы, на которые они первоначально исполнялись. Этот краковяк был любимой песней солдатов I Дивизии Войска Польского им. Тадеуша Костюшко» [4, с. 40–42].

Музыка Т. Костюшки звучит в наши дни в различных концертах. Так, оригинальные сочинения для фортепиано исполняют ученики музыкальных школ, в том числе и на международных конкурсах. Вальс и Полонез си-бемоль мажор входят в репертуар известного белорусского квартета деревянно-духовых инструментов «Ривьера» (флейта, гобой, кларнет, фагот), музыканты которого в своей творческой деятельности пропагандируют белорусскую музыку разных исторических эпох. В 2007 г. состоялась премьера сочинений Т. Костюшко на вершине горы в Австралии, названной его именем. Песни о Костюшко пользуются популярностью и сохраняют память о герое.

Литература:

1. Інструментальная музыка Беларусі XVIII стагоддзя [Ноты] ; склад. В.У. Дадзіёмава. – Мн, 1991. – 111 с.

2. Filipowicz, H. Taming a transgressive national hero. Tadeusz Kościuszko and nineteenth-century polish drama / H. Filipowicz // The great tradition and its legacy. The evolution of dramatic and musical theater in

Austria and Central Europe. – New York – Oxford : Berghahn Books. – 2006. – P. 33–51.

3. Krakus. Wtorek 18 czerwca 1822 Nr. 121. [Электронный ресурс]. // Jagiellońska Biblioteka Cyfrowa. – Режим доступа : http://jbc.bj.uj.edu.pl/Content/359943/NDIGCZAS016200_1822_121.pdf. – Дата доступа : 15.06.2017.

4. Wacholc, M. Śpiewnik polski / M. Wacholc. – Kraków : Oficyna Wydawnicza «Impuls», 2002. – 280 p.

*Костюкович М. Г. (Минск)*

# ЭПОХА ТАДЕУША КОСТЮШКИ В КИНЕМАТОГРАФИЧЕСКОМ ВОПЛОЩЕНИИ

Эпоха Тадеуша Костюшки в кинематографе не так популярна, как середина и конец 19 века: возможно, просто потому, что о ней сохранилось меньше свидетельств. Тем не менее по игровым фильмам, снятым в разных странах, можно составить вполне целостный, хоть далеко не достоверный образ этого времени.

Следует сказать, что личность Тадеуша Костюшки выгодна для кинематографа, потому что совмещает авантюрное начало с патриотическим, героическое с трагическим. Он связан со значительными историческими событиями и ключевыми деятелями сразу нескольких стран: Екатериной Второй, Павлом Первым, Александром Первым, Наполеоном, Томасом Джефферсоном. Это позволяет создать в кино тот самый увлекательный контраст «отдельный человек и большая эпоха». Единственное существенное препятствие, которое снижает интерес кинематографистов к персоне Костюшки, – высокая стоимость исторической костюмной постановки. Это заранее определяет формат любого фильма о нем: высокобюджетный фильм с участием кинозвезд.

Самый ранний фильм о Костюшке был обнаружен в 2013 году – это польская кинодрама «Костюшко под Рацлавицами» 1913 года. Раньше этот фильм считался утерянным. Пока он реставрируется, говорить о его образном строе вряд ли возможно, тем не менее, можно сказать, что первая известная попытка создать кинообраз Костюшки касается одного из судьбоносных сражений польских войск с российскими в восстании 1794 года – битвы под Рацлавицами, когда поляки под предводительством Костюшки одержали победу.

В 1929 году польский кинорежиссер Ежи Оршон ставит по сценарию Тадеуша Пентовского мелодраму «Первая любовь Костюшки». В основе сюжета – мелодраматическая коллизия, основанная на достоверном случае: когда после окончания парижской учебы Костюшко возвращается в Польшу, король Станислав Август отказывает ему в приеме на государственную службу, и тот едет работать воспитателем в имение Юзефа Сосновского. Оттуда он пытается бежать с дочерью Сосновского, но беглецов настигают, и Костюшко вынужден вернуться в Париж в одиночку. Сценарист разворачивает этот случай в любовную историю с классическим любовным треугольником, в котором

Костюшко выступает в необычной роли жертвы (ее обычно отводят женским персонажам): воевода желает женить его на местной шляхтянке, а Костюшко влюблен дочь воеводы, с которой и пытается бежать, чтобы обвенчаться в Варшаве.



*Рис. 1. Кадр из фильма «Первая любовь Костюшки» (1929)*

Сыкстус Левицкий, который исполняет роль Костюшки, дает своему персонажу романтичные, даже немного женственные черты, история никоим образом не касается героических, революционных мотивов – разве что в экспозиции честолюбивое желание героя служить родине дает импульс действию, правда, развивается оно исключительно в мелодраматическом ключе. История остается камерной и не выходит за пределы имения.

Следующий известный кинообраз Костюшки создан накануне Второй Мировой войны, в 1938 году, вероятно, на волне патриотического подъема в Польше. Отвага и достоинство – акцентные черты образа Костюшки в фильме Юзефа Лейтеса «Костюшко под Рацлавицами» (1938). Впрочем, наш герой все же второстепенен в сюжете, а магистральная сюжетная линия – снова мелодраматическая: история любви поручика Яна Милевского и Ханки, которую хотят выдать замуж за другого. Игровое кино стремится трактовать образ Тадеуша Костюшки совокупностью мотивов борьбы за родину и несчастной любви и даже переносит эти мотивы на других персонажей, но смысловые акценты остаются неизменными: мелодрама для привлечения зрителей и борьба для возвышения образа.

Этим фильмом, насколько нам известно, завершились попытки экранизировать биографию Тадеуша Костюшки, польский игровой кинематограф, равно как и белорусский, больше не обращался к его образу. Возможно, это связано с тем, что после присоединения Западной Белоруссии к БССР Тадеуш Костюшко, уроженец спорных земель, надолго попал в подцензурный, нежелательный тематический круг. А

в более позднее время, когда кинематограф Польши находился под советским идеологическим влиянием, Костюшка как носитель польской национальной идеи наверняка был под негласным запретом.



***Рис. 2. Кадр из фильма «Костюшко под Рацлавицами» (1938)***

В то же время эпизодический персонаж Костюшки возникает в американском патриотическом фильме «Джон Пол Джонс» режиссера Джона Фэрроу (1959 год). Личность адмирала Джона Пола Джонса тоже связывает историю и культуру нескольких стран. Костюшко, мелькнувший в кадре как соратник Томаса Джефферсона, трактуется как образ героический, связанный с идеями смелости, самоотверженности и одержимости высокой мечтой.

Линия идеалистической трактовки его образа продолжена и утрирована в американском документальном фильме из цикла «Путешествие сквозь время» (2014), где Тадеуш Костюшко назван величайшим революционером в американской истории. Путешествие по местам его жизни в Америке подано как экскурсия по знаковым местам американской истории, впрочем, смягченное юмором.

В докудрамах белорусского производства, например, в фильме «Тадеуш Костюшко» Олега Лукашевича (2016), романтический образ одноименного героя вписан в пасторальный образ эпохи. Костюшко изображен молодым, вдохновенным патриотом, который в деревенской глуши мечтает о свободе отечества. Как правило, белорусские документалисты изображают Костюшку в молодости, его старость реже изображается на экране – и обычно в свете меланхолическом. Тривиальность трактовки объяснима скорее скромными производственными возможностями, нежели стремлением принизить этот героический образ.



***Рис. 3. Эмиль Яннингс в роли Павла Первого в фильме «Патриот» (1929)***

Что касается современников Костюшки, то больше других популярен у кинематографистов Павел Первый: вероятно, за эксцентричность, с которой ассоциируется в фильмах и Российская империя. Павел, по сути, и становится ее воплощением: жестокий, обидчивый, импульсивный. В фильме «Патриот» Эрнста Любича (1929) по роману Дмитрия Мережковского Павел Первый, сыгранный Эмилем Яннингсом, воплощает зло тирании, а предавший его граф Петер Людвиг фон дер Пален изображается патриотом, который избавляет страну от деспота.

В белорусском фильме «Поручик Киже» (1934) Александра Файнциммера по сценарию Юрия Тынянова царствование Павла Первого изображается как время беспросветной глупости и бюрократии, которая даже наделена животворной силой.



***Рис. 4. Михаил Яншин в роли Павла Первого в фильме «Поручик Киже» (1934)***

Павел Первый – выглядит как человек, лишь по случайности оказавшийся на троне. Михаил Яншин, сыгравший его, трактует роль даже не сатирично, как требует повесть Тынянова, а гротескно, так что анекдот о бестелесном поручике Киже, который возник из описки писаря, насыщается мрачными, зловещими коннотациями – безысходности, обреченности, бессмысленности и этого персонажа российской истории, и власти как таковой.

Задуманный, разумеется, как памфлет против самодержавия, фильм прозрачно говорит и об абсурдности власти вообще, а больше – о чудовищной силе бюрократии, плодящей призраков, очевидно перекликаясь и с гоголевской «Шинелью». Россия как страна призраков – еще один важный образ сюжета о Павле Первом.

Впрочем, материал российской истории зарубежные кинематографисты всех времен используют как основу для экзотичной истории, которая именно экзотичностью и впечатляет. В ход идут всевозможные вампуки и смысловые клише, связанные с русскостью: дремучесть, отсталость, роскошь и щедрость, безумие и импульсивность, распутство, жестокость, словом, средневековье. На этом построены и колоритный образ Павла Первого в картине «Патриот», и образ Екатерины Второй в постановке Джозефа Штернберга «Распутная императрица» (1934) с Марлен Дитрих в главной роли.



***Рис. 5. Кадр из фильма «Распутная императрица» (1934)***

В общем-то, фильм этот ставился специально для Марлен Дитрих, поэтому экзотичные декорации и световые эффекты, основанные на тематическом контрасте «просвещенная европейская цивилизация – дикая и страшная Россия», работают на то, чтобы выгодно оттенить ее красоту и рисунок ее роли.

Образ Екатерины Второй контрапунктом развивается от наивной образованной девушки с идеалистическим взглядом на мир к жестокой императрице, потакающей своим прихотям.



***Рис. 6. Кадр из фильма «Распутная императрица» (1934)***

В решениях художника-постановщика прослеживается стереотипный ассоциативный ряд – «русский» в понимании западной цивилизации: «меха – мороз – терем – икона – лучина – тройка – водка – разгул». В целом же Россия изображается как царство дикости.

Образ Екатерины Второй насыщается от этого ведьминскими чертами: она предводительница темных сил, оборотень, существо стихийное, властное, пугающее и этим притягательное.

В игровых фильмах эпоха Костюшки часто ассоциируется с упадком, тьмой, смутой – временем страшным, таящим угрозу. Оно лишено спокойствия, радости, ему больше не свойственна камерность. Обычно кинематографисты выбирают три маркера: война, убийство и подлое нападение.

Так трактует конец восемнадцатого века мистический фильм «Дьявол» Анджея Жулавски (1972). Действие происходит в 1792 году, когда в Польшу вступают прусские войска. Прусский шпион с именем Дьявол доводит до безумия польского студента-патриота, которому помогает сбежать из тюрьмы. Череда фантасмагорических сцен, в которых главным мотивом становится раздвоение, зеркальное отражение, иллюзия, нагнетает интонацию ужаса, предчувствия неотвратимого зла, смерти. Низкий тональный ключ, замкнутость декораций, камерность сцен работают на создание образа опустошенной земли, разоренного дома. Действие происходит в брошенных усадьбах, пустынных дворцах, старых монастырях, в голых пейзажах, где нет людей. Безумие, приводящее к гибели,– основной эмоциональный тон фильма.



***Рис. 7. Кадр из фильма «Дьявол» (1972)***

Таким образом, в игровых фильмах преобладает героическая трактовка образа Костюшки. Мифологизированный персонаж, он появляется как воплощение героизма, патриотизма, отваги. Авантюрное начало в его образе ослабляется, зато часто выделяется начало мелодраматическое. Эпоха же трактуется как время мрачное, даже безысходное, в основе ее образа контраст «свобода – смерть».

*Ефіменка С. А. (г.п. Дружны)*

# ВОБРАЗ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ Ў КУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ

На свеце ёсць шмат краін і кожная ганарыцца сваімі героямі. Але ж героем некалькіх краін адначасова давялося быць не многім. Тадэвуш Касцюшка, наш суайчыннік, адносіцца да такіх асобаў. Ён стаў народным героем Беларусі, Польшчы і Злучаных Штатаў Амерыкі, ганаровым грамадзянінам Французскай рэспублікі, генералам войск ЗША і Рэчы Паспалітай. У памяці беларусаў ён назаўсёды застаўся як кіраўнік нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г., гістарычныя ўрокі якога больш чым праз стагоддзе паўплывалі на ўзнікненне беларускай дзяржаўнасці. Аднак з цягам часу імя Касцюшкі стала менш вядома на радзіме, чым у Польшчы і ЗША. Сёлета, калі адзначаецца 200-годдзе памяці Тадэвуша Касцюшкі, думаецца, айчынныя бібліятэчныя ўстановы павінны зрабіць неабходныя намаганні для папулярызацыі гэтай выбітнай асобы.

Нарадзіўся Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка-Сяхновіцкі ў шляхецкай сям'і. Дакладна дата яго прыходу на свет невядома, існуе толькі згадка пра хрышчэнне, што адбылося ў лютым 1746 г. у Косаўскім касцёле. Нялёгкім было дзяцінства будучага Героя Двух Кантынентаў. Рана памёр бацька, маці адна вяла гаспадарку і гадавала дзяцей, сярод якіх Тадэвуш быў малодшым. З дзевяці гадоў ён вучыўся на Валыні, у калегіуме піяраў у Любяшове, дзе атрымаў трывалыя веды па музыцы, граматыцы, матэматыцы, латыні. Свой лёс Касцюшка звязаў з вайсковай службай, паспяхова закончыў Варшаўскі кадэцкі корпус. Сам кароль Станіслаў Аўгуст заўважыў Касцюшкавы здольнасці і накіраваў маладога афіцэра паглыбляць свае веды ў Францыю. Пасля вяртання дамоў, паколькі месца ў паспалітым войску яму не знайшлося, Касцюшка працаваў хатнім настаўнікам. Аднак хутка, калі даведаўся пра барацьбу паўночнамерыканскіх каланістаў за сваю незалежнасць, накіраваўся валанцёрам праз акіян. Дзякуючы сваім ведам і асабістым якасцям праз сем гадоў Тадэвуш Касцюшка становіцца брыгадныммм генералам войск ЗША. Першы прэзідэнт Злучаных Штатаў Джордж Вашынгтон высока ацаніў заслугі нашага земляка. Аднак ні слава, ні грошы не маглі замяніць Бацькаўшчыны. Пасля бітваў, у якіх амерыканцы атрымалі незалежнасць, вярнуўся Касцюшка дамоў. Пасяліўся ў спадчынным маёнтку Сяхновічы (зараз у Жабінкаўскім раёне Брэсцкай вобласці), дзе на працягу пяці гадоў займаўся мірнай працай, пакуль яго зноў не паклікала ў дарогу вайна.

Вайсковыя здольнасці Касцюшкі, яго прага свабоды і вольнаці на гэты раз спатрэбіліся Радзіме. У 1794 г. ён становіцца на чале паўстання супраць падзелу Рэчы Паспалітай паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй. У Кракаве прымае прысягу і разам са сваімі паплечнікамі пачынае ўзброенае супраціўленне. Першыя баі былі пераможнымі, але не ўсё залежала толькі ад кіраўніка паўстання. Як потым гаварылі ў народзе: "Касцюшка заваяваў бы свет цэлы, каб паны яго слухаць хацелі". У рашаючай бітве пад Мацяёвіцамі паўстанцы былі разбітыя, іх цяжка паранены Начальнік (як тытулавалі Касцюшку) быў захоплены ў палон і ўвязнены ў Санкт-Пецербурзе. Толькі напрыканцы 1796 г., пасля прыходу да ўлады Паўла І, Тадэвуш Касцюшка быў вызвалены, прынёс асабістую прысягу імператару. Далі свабоду і Касцюшкавым паплечнікам, што ўдзельнічалі ў паўстанні. Астатак жыцця генерал правёў у Амерыцы і Францыі, памёр восенню 1817 г. у Швейцарыі.

Такая надзвычай багатая біяграфія героя і сёння выклікае зацікаўленасць у маленькіх чытачоў. Аднак асаблівасці дзіцячай аўдыторыі, што наведвае бібліятэкі, патрабуе, каб пра Тадэвуша Касцюшку расказвалася даступна, цікава і вобразна. Гэта дазваляюць зрабіць нарысы, якія належаць пяру гісторыка і пісьменніка Анатоля Бензерука. Сярод ягоных твораў, адаптаваных для дзяцей школьнага ўзросту, вылучаюцца артыкулы "Успамін пра Радзіму" са зборніка "Сорак дарог", "Наш Касцюшка слаўны быў" з кнігі "Свята для сэрца" (Мінск: Литература и Искусство, 2009) і "Жыццё Тадэвуша Касцюшкі" са зборніка часопіса "Вясёлка" (Мінск: Мастацкая літаратура, 2012). Карыстаючыся імі, можна праводзіць у бібліятэках мерапрыемствы, прысвечаныя асобе Героя Двух Кантынентаў.

Пры гэтым партрэты Касцюшкі размяшчаюцца на выставах, яркія карціны з ягонай біяграфіі ілюструюцца з дапамогай відэа, аздабляючы мерапрыемства, гучаць паланезы, створаныя Касцюшкам і ягонымі сучаснікамі. Карысна таксама пазнаёміць дзяцей з помнікамі Тадэвушу Касцюшку, якіх шмат у свеце. Магчыма выкарыстоўваць элементы перфоманса. Напрыклад, гістарычны тэатр "Дукорскага маёнтка" знаёміць дзяцей са шляхецкай музыкай і старадаўнімі строямі, чым робіць яшчэ больш каларытным расповяд пра жыццё героя. Абавязкова на гэтых мерапрыемствах гучыць музыка Міхала Клеафаса Агінскага, дэманструюцца карціны Напалеона Орды, дэкламуюцца вершы Адама Міцкевіча, творы сучасных паэтаў, прысвечаныя Тадэвушу Касцюшку. Напрыклад, верш Расціслава Бензерука "1794" (Бензярук, Р.М. Сорак дарог. Брэст: Альтернатива, 2007. С.128-129) і г. д. У кнізе Анатоля Трафімчыка "Наш Касцюшка

слаўны!” (Мінск: Выдавец А.М. Янушкевіч, 2017) можна знайсці цэлы шэраг выдатных твораў, прысвечаных гэтай слыннай асобе.

Абавязкова дзецям даецца мажлівасць паразважаць і адказаць на пытанні, якія пакажуць наколькі маленькія слухачы ведаюць асобу славутага генерала і час, у якім ён жыў. Пытанні, напрыклад, могуць быць наступныя: Чаму Касцюшку называюць Героем Двух Кантынентаў? Дзеля чаго адбылося паўстанне 1794 г.? Паразважайце, навошта чалавеку патрэбна свабода? Дзе і калі ў Беларусі адбылася самая вялікая бітва Касцюшкаўскага паўстання? Як народы свету шануюць імя Тадэвуша Касцюшкі?

Надзвычай важна засяродзіцца на ўдзеле нашых землякоў у падзеях паўстання 1794 г., якое ахапіла значную частку сучаснай Беларусі. Для нас цікавым момантам Касцюшкаўскай інсурэкцыі стала вывучэнне маршруту рэйду паўстанцкага атрада пад кіраўніцтвам Стэфана Грабоўскага, што ўлетку 1794 г. прайшоў па землях сучаснага Пухавіцкага раёна.

Стэфан Тамашавіч Грабоўскі (1767–1847) быў адным з найбольш прыкметных кіраўнікоў паўстання на Літве. Шлях ягонага аддзела па Міншчыне і Магілёўшчыне можна прасачыць на падставе шматлікіх дакументаў, што захаваліся да нашых часоў. На ўсходзе сонца 19 жніўня Грабоўскі падышоў да Іўя, дзе нанёс паразу царскаму атраду, і праз дзень заняў Івянец, у якім шмат жыхароў далучылася да паўстанцаў. Далейшы рух “грабоўчыкаў” пралягаў праз Ракаў, заняты 23 жніўня, Койданава, Дудзічы, Дрычын, Пухавічы, дзе паўстанцы мелі нараду і затрымаліся да 28 жніўня. У той дзень казакі атрада Пляханава сутыкнуліся паблізу Пухавічаў з паўстанцамі. Завязалася бойка, ліцвіны перайшлі праз раку Свіслач (на Магілёўшчыне). А далей праз Бабруйск і Глуск – пераход пад Любань, дзе 4 верасня 1794 г. паўстанцы прынялі бой, які скончыўся для іх паразай.

Гэтыя гістарычныя падзеі адбываліся зусім недалёка ад мясцін, дзе ў XX ст. быў пабудаваны гарадскі пасёлак Дружны. І канечне ж, праводзячы імпрэзу ў Дружненскай дзіцячай бібліятэцы і расказваючы пра Тадэвуша Касцюшку, не прамінаем зрабіць акцэнт на падзеях паўстання, якія адбываліся на Пухаўшчыне.

Калі не рабіць крокаў да папулярызацыі асобаў, што ў ранейшыя часы змагаліся пад дэвізам “За вольнасць нашу і вашу”, іх імёны могуць аказацца забытымі. Падрастаючыя пакаленні неабходна выхоўваць патрыятызму і любові да Айчыны на прыкладах слынных асобаў роднай гісторыі і культуры, якія баранілі свой край у часы паўстанняў і войнаў.

*Сосна У.А. (Мінск)*

# ПАЎСТАННЕ ТАДЭВУША КАСЦЮШКІ Ў ВЫКЛАДАННІ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Калі ў польскай гістарычнай літаратуры, прысвечанай паўстанню 1794 г., постаць Тадэвуша Касцюшкі вырасла да статусу нацыянальнага героя, то стаўленне гісторыкаў суседніх краін не было такім адназначным, што яскрава праявілася ў абагульняючай і асабліва навучальнай літаратуры, якая ў найбольшай ступені ішла да масавага чытача і фарміравала яго ўяўленні.

У царскія часы М.В. Каяловіч у сваіх лекцыях па гісторыі так званай Заходняй Расіі лаканічна паведамляў пра паўстанне 1794 г. наступнае: "Палякі… дайшлі да крайняй лютасці…, сабралі якія засталіся ў іх сілы, уцягнулі і свайго караля Станіслава, і паўсталі супраць Расіі і Прусіі. Вядомы Касцюшка стаў на чале паўстаўшых і нават заклікаў, але марна, польскі просты народ. Саюзнікі зноў задушылі палякаў, прычым асабліва шмат зрабіў наш знакаміты Сувораў" [1, с. 283]. Увогуле, паўстанне падавалася чужым гісторыкамі расійскай скіраванасці, хоць не адмаўляючы мужнасці і самаахвярнасці асобы кіраўніка. Стрыманасць у ацэнках паўстанцаў праявілі заснавальнікі беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі. Між тым, У.М.Ігнатоўскі ў "Кароткім нарысе гісторыі Беларусі" прызнаў іх рэчыпаспалітаўскі патрыятызм, прывёў біяграфію Касцюшкі, характарызаваў падзеі ў Літве-Беларусі з ухілам ва ўзаемадачыненні з сялянствам [2, с. 163-164].

Далей савецкія ўлады фактычна наклалі табу на вывучэнне палітычнай гісторыі Беларусі познафеадальнай эпохі, выкідваючы з яе шляхту і яе ўдзел у палітычным жыцці. Паўстанне 1794 г. лічылася з'явай польскай госторыі, яго не раскрылі нават у акадэмічнай пяцітамовай "Гісторыі Беларускай ССР" і зусім праігнаравалі ў школьным вучэбным дапаможніку пад рэдакцыяй Л.С. Абецадарскага. Стараннямі выкладчыкаў БДУ сціслая інфармацыя аб паўстанні і яго кіраўніку трапіла ў дапаможнік для студэнтаў-гісторыкаў, хоць яно прызнана выключна "як яскравая старонка ў барацьбе польскага народа за сваю незалежнасць" [3, с. 163].

Толькі ў Рэспубліцы Беларусь Касцюшка і паўстанне 1794 г. сталі паўнавартасна належаць і нашай гісторыі, што разгорнута прадстаўлена у асобным параграфе трэцяга тома шасцітамовай гісторыі Беларусі [4, с. 245-259]. Яго аўтар, У.П. Емяльянчык, выявіў

“беларускі след” у паўстанні не толькі праз характарыстыку мясцовых дзеячаў, удзел сацыяльных нізоў, але і ў яго літвінскіх ідэйна-палітычных асаблівасцях, выкарыстанні партызанскіх, дыверсійных метадаў змагання. У такім плане ўводзяцца і пашыраюцца сюжэты аб падзеях паўстання на беларускіх землях у новыя дапаможнікі для сярэдніх [гл.: 5, с. 3, 131-137] і вышэйшых [гл.: 6, с. 573-582] навучальных устаноў, а постаць Касцюшкі залічваецца ў шэраг выдатных айчынных дзеячаў. Пакуль яшчэ здараюцца рэцыдывы, і ў вучэбнай літаратуры, вяртання да ацэнак паўстання як выключна каталіцка-паланізатарскага [7, с. 231-232], неразумення яго, пры ўсіх слабасцях і недахопах, аб’ектыўнай прагрэсіўнасці для ўсіх земляў першай Рэчы Паспалітай. Але нават нашыя беластоцкія гісторыкі, асабліва адчувальныя да паланізацыйных праяваў ва ўсіх Рэчах Паспалітых, у мясцовым падручніку, адстойваючы “перш за ўсё беларускі, а ня польскі пункт гледжаньня”, сцвердзілі, што Касцюшка “ўдыхнуў у беларусаў надзею на лепшую будучыню. Яны падняліся на паўстаньне ня горш за палякаў” [8, с. 14, 35]. Асабліва падкрэсліваюцца раўнапраўныя і паважлівыя адносіны да праваслаўных, памыснае адлюстраванне ў песнях і паданнях. Больш за тое, паводле трапнага вызначэння Алега Латышонка, “у асобе Касьцюшкі мы назіраем столькі праяваў беларускасьці, колькі іх магло быць у дадзеных гістарычных абставінах” [9, с. 393].

Прапаную сучаснае бачанне гэтай тэмы праз фрагменты з аўтарскага варыянту лекцыі “Паўстанне 1794 г. Трэці падзел Рэчы Паспалітай”, напісанай у адпаведнасці з “Праграмай па гісторыі Беларусі” для студэнтаў гістарычнага факультэта Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта [гл.:10, с. 21].

Нацыянальны герой Польшчы і Злучаных Штатаў Амерыкі, ганаровы грамадзянін Францыі Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка належаў да старажытнага беларускага шляхецкага роду, вядомага з 1458 г. Спачатку Касцюшкі вызнавалі праваслаўе, а ў першай палове XVII ст. былі ўжо каталікамі. Іх прадстаўнікі займалі значныя дзяржаўныя пасады ў Берасцейскім павеце. Да канца XVIII ст. уладанні збяднелага роду абмяжоўваліся маёнткам Сяхновічы (зараз Вялікія Сяхновічы і Малыя Сяхновічы ў Жабінкаўскім раёне). Хутчэй за ўсё будучы кіраўнік паўстання тут нарадзіўся і быў ахрышчаны 30 лістапада 1745 г. як Андрэй у мясцовай царкве паводле жадання маці Тэклі з праваслаўна-ўніяцкага роду Ратамскіх з Аршанскага павета. Толькі потым бацька павёз яго хрысціць нанова ў

Косаўскі касцёл, дзе былі дададзены імёны Тадэвуш і Банавентура, а, зыходзячы з метрыкі, датай нараджэння пачало лічыцца 4 лютага 1746 г., месцам – бліжэйшы да мястэчка Косава фальварак Марачоўшчына (цяпер у Івацэвіцкім раёне), што тады належаў бацьку. Як і ўсе дзеці небагатай шляхты, да дзевяці гадоў Тадэвуш выхоўваўся дома, у беларускай вёсцы. Першапачатковую адукацыю атрымаў у піярскай школе мястэчка Любешаў Пінскага павета, а з 1765 г. працягнуў яе ў Варшаўскай рыцарскай школе. У 1769 г. здольнаму афіцэру прафінансавалі паездку на вучобу ў Францыю. За тры гады знаходжання ў Парыжы Касцюшка не толькі ўдасканальваў свае ваенныя і асабліва ваенна-інжынерныя веды, быў слухачом у акадэміі жывапісу і скульптуры, але і пазнаёміўся з ідэямі французскіх асветнікаў, што спрыяла развіццю рэспубліканскага светапогляду. Пасля наведвання Англіі, Італіі, Швейцарыі і Германіі, улетку 1774 г. ён вярнуўся ў Варшаву, аднак афіцэрскай пасады ў войску не знайшлося, таму вымушаны быў працаваць хатнім настаўнікам. Увосень 1775 г. Касцюшка зноў едзе ў Францыю, а ўлетку 1776 г. – у Паўночную Амерыку, каб ваяваць за незалежнасць англійскіх калоній. Праявіў сябе найперш як вайсковы інжынер. Яго талент забяспечваў шэраг перамог амерыканскай арміі, у іх ліку пад Саратогай (1777 г.). Касцюшка даслужыўся да звання генерала, зблізіўся з Джорджам Вашынгтонам, быў узнагароджаны найвышэйшым амерыканскім ордэнам Цынцыната, атрымаў там грамадзянства, пажыццёвую пенсію і зямельны надзел. Пазней, у 1798 г., набытай у Злучаных Штатах маёмасцю ён даручыў распарадзіцца свайму сябру Томасу Джэферсану для выкупу і даравання свабоды неграм, іх навучання, маральнага і патрыятычнага выхавання.

Аднак усе заакіянскія поспехі і заслугі не адарвалі Касцюшку ад лёсу Радзімы, куды ён вяртаецца пасля сканчэння вайны і дасягнення рэальнай незалежнасці ЗША. Праўда, вайсковай пасады давялося чакаць, займаючыся гаспадаркай у Сяхновічах, пяць гадоў, ды і тая аказалася ў арміі Каралеўства Польскага, а не ВКЛ. Гэта з горыччу, якая сведчыць аб глыбокіх земляцка-патрыятычных пачуццях, даводзіў Касцюшка ў лісце 1790 г. да генерала Несялоўскага: "Хіба Вы адмаўляецеся ад мяне і лічыце няздольным служыць Вам? Кім жа я з'яўляюся? Няўжо я не ліцьвін, Ваш зямляк, Вамі абраны? Каму павінен дзякаваць, калі не Вам? Каго павінен абараняць, калі не Вас і сябе самога? Калі гэта Вас не кране для ўнясення прапановы пра мяне на сойме, каб вярнуўся, то я сам буду вымушаны, бачыць Бог, што-

небудзь кепскае сабе ўчыніць! Таму што злосць мяне бярэ: каб з Літвы ў Кароне служыў, калі Вы не маеце трох генералаў”. Патрыятызм ВКЛ тады сумяшчаўся і з патрыятызмам супольнай краіны, якую ён на чале дывізіі паспяхова абараняў у 1792 г. на Валыні, але ў знак пратэсту супраць далучэння караля да Таргавіцкай канфедэрацыі падаў у адстаўку і выехаў за мяжу. Касцюшка быў прыхільнікам “інтэграцыі” этнасаў, што насялялі Рэч Паспалітую на грунце польскіх традыцый, прывітых нашай шляхце за часы сумеснага існавання ў “дзяржаве абодвух народаў”. Вядомы наступны яго выраз адносна “русінаў”: “Прывучаць іх трэба да польскай мовы, няхай па-польску будуць усе іхныя набажэнствы. З часам у іх увойдзе польскі дух”. Распаўсюджванне польскай мовы, якая выконвала функцыі міжэтнічных зносін, выступала важнейшым сродкам цэментавання дзяржаўна-палітычнага адзінства Рэчы Паспалітай. У той гістарычны перыяд яшчэ не склаліся ўмовы для фарміравання ўласна беларускай нацыянальнай ідэі, а таму спадзявацца на наяўнасць яе элементаў у дзяржаўніцкім светапоглядзе шляхты было б заўчасным. Ва ўсякім разе, найперш дзейнасць Касцюшкі была скіравана на дасягненне свабоды і незалежнасці краіны, якую раздзіралі агрэсіўныя суседнія манархі. Аб сацыяльным складніку касцюшкаўскага разумення свабоды сведчыць і наступная яго заява: “Толькі за шляхту біцца не буду. Жадаю свабоды для ўсяго народа і толькі для яго гатовы ахвяраваць жыццём”. Прадастаўленне свабоды і грамадзянскіх правоў сацыяльным нізам, сялянству – асноўнаму носьбіту беларускай этнічнасці – стварыла б перадумовы для з’яўлення асобнага беларускага руху. Для беларусаў, украінцаў, этнічных літоўцаў сацыяльнае разняволенне абумоўлівала тады і нацыянальна-культурнае адраджэнне.

У ВКЛ першы акт паўстання 16 красавіка абвясцілі аддзелы літвінскага войска ў Шаўлях на Жмудзі. Праз дзень іх прыклад перанялі вайскоўцы ў Лідзе, а ў Смаргоні пры падтрымцы жыхароў узяў уладу падпалкоўнік Стафан Грабоўскі і рушыў да Вільні. У ноч з 22 на 23 красавіка паўстанцы Вільні, у ліку якіх быў і рамесны люд, раптоўна захапілі вайсковыя пасты і авалодалі горадам. У палон трапіў начальнік расійскага гарнізона генерал М. Арсеньеў. 24 красавіка на Ратушнай плошчы быў урачыста абвешчаны “Акт паўстання народу Вялікага Княства Літоўскага” (Віленскі акт). Перад вялікім сходам гараджан з патрыятычнай прамовай выступіў Якуб Ясінскі. Быў створаны паўстанцкі ўрад – Найвышэйшая рада ВКЛ.

Рада склалася ў большасці з прадстаўнікоў левага крыла шляхецка-буржуазнага блоку і ахоплівала асноўныя адміністрацыйныя адзінкі дзяржавы, у тым ліку і гістарычныя, як Смаленскае ваяводства. У ёй прысутнічалі наваградскі ваявода Юзаф Несялоўскі, мінскі стараста Міхал Бжастоўскі, рэчыцкі падкаморы Станіслаў Валовіч, аршанскі маршалак Мікалай Храпавіцкі, дэлегаты ад гарадоў і паветаў (Слонімскага, Наваградскага, Лідскага). Галоўным кіраўніком паўстання прызнаваўся Касцюшка. На наступны дзень былі асуджаны прыхільнікі Таргавіцкай канфедэрацыі: павешаны гетман вялікі літоўскі Ш. Касакоўскі і пазней маршалак Віленскай канфедэрацыі І. Швыкоўскі.

У красавіку-маі 1794 г. паўстанне шырылася па паветах заходняй часткі Беларусі. Яно перамагло ў Берасці, Ваўкавыску, Слоніме, Наваградку, Пінску, Ашмяне, Кобрыне, Лідзе, Браславе. Цэнтрамі руху былі найперш гарады. З-за варожых адносін жыхароў Гародні расійскі генерал П. Цыцыянаў 26 красавіка вымушаны быў вывесці войскі за горад. З сабой ён прыхапіў касы Гародзенскай эканоміі, скарбовай камісіі і сукно са складоў. Пагражаючы абстрэлам горада з гармат, генерал сарваў з гараджан кантрыбуцыю і адступіў да Нясвіжа. 4 мая пакінуў Берасце і адышоў у напрамку Пінска невялікі аддзел палкоўніка Чэсменскага. Расійскія войскі скіроўваліся ў бок дзяржаўнай мяжы, вызначанай паводле падзелу 1793 г.

Вызваленчы рух ахапіў практычна ўсю тэрыторыю тагачаснай афіцыйнай Рэчы Паспалітай, дзе ўсталёўваліся паўстанцкія органы ўлады і кіравання. Найвышэйшая рада ВКЛ як выканаўчы орган паўстання складалася з дэпартаментаў, а пасля рэарганізацыі ўрада – з дэпутацый: парадку (адміністрацыі і парадку), публічнай бяспекі, бюджэту і таемнай (для кіравання ваеннымі аперацыямі). Пасада Старшыні Рады павінна была займацца пачаргова штодзень згодна алфавіту. Першапачатковы склад Рады з 29 асоб прадугледжвалася дапаўняць дэлегатамі ад ваяводстваў і паветаў. Для пакарання ворагаў і здраднікаў быў утвораны Найвышэйшы крымінальны суд.

Друкаваным органам Рады стала “Віленская нацыянальная газета”, якая выходзіла двойчы на тыдзень і рэдагавалася ксяндзом-піярам Піліпам Галанскім. У ёй змяшчаліся матэрыялы “якабінскага” характару, што сведчыла аб большай радыкальнасці літвінскага кіраўніцтва паўстаннем, чым польскага. Віленскі акт паўстання, у адрозненне ад Кракаўскага, змяшчаў заклік не толькі да “вольнасці”, але і да “грамадзянскай роўнасці”. Перавагу такіх настрояў паказваў

“Універсал да ваяводстваў і паветаў правінцыі Вялікага Княства Літоўскага і гарадоў вольных”, прысвечаны канкрэтнай арганізацыі паўстанцкага руху на месцах, які пачынаўся словамі: “…Слухай, Народзе Літоўскі, што табе гаворыць не кароль слабы са слабейшага яшчэ трона, не свавольны збор людзей, што нічога акрамя марнага тытулу не маюць, але спакойнае згуртаванне спагадлівых тваіх сыноў, якія доўга для вызвалення твайго працавалі тады, калі ты ўжо ў ім зняверыўся”. Рэспубліканскія погляды, палітыка літвінскіх паўстанцаў, іх імкненні пашырыць правы ВКЛ на самастойнасць выклікалі недавер і падазронасць у Польшчы сярод тых удзельнікаў паўстання, якія прытрымліваліся ўмеркаваных поглядаў. Знамянальна, што лозунгам паўстання ў Княстве сталі словы “свабода, роўнасць, незалежнасць”, а ў Каралеўстве замест слова “роўнасць” ужывалася “цэласць”.

На месцах узніклі непаразуменні адносна падпарадкаванасці і прызнання Кракаўскага ці Віленскага актаў паўстання. Кіраўніцтва Берасцейскага ваяводства і Кобрынскага павета раней далучыліся да Кракаўскай дэкларацыі Касцюшкі, і калі атрымалі загады з Вільні, накіравалі начальніку паўстання ліст з прапановай аб падпарадкаванасці непасрэдна яму. Таго ж пажадалі паўстанцкія кіраўнікі Гародзенскага павета. Дзеля інтарэсаў паўстання, канфлікт быў хутка вырашаны на карысць падначаленасці мясцовага кіраўніцтва Найвышэйшай радзе ВКЛ.

У паўстанні на тэрыторыі абодвух частак Рэчы Паспалітай было больш агульнага, чым асобнага, пра што сведчыла наяўнасць “парадкавых камісій” як арганізацыйных цэнтраў паўстання на месцах, згодна з Кракаўскім актам. Яны ўзніклі яшчэ падчас працы Чатырохгадовага сойма, але ў перыяд паўстання іх паўнамоцтвы былі пашыраны і скіраваны амаль выключна на яго патрэбы. У кожным павеце абіраўся і прадстаўляўся на канчатковае зацвярджэнне Касцюшку так званы “генерал зямянскі” ці “генерал міліцыі”. Ягоным абавязкам было дапамагаць парадкавым камісіям арганізоўваць паспалітае рушанне і ўзначальваць добраахвотныя паўстанцкія фарміраванні. Сярод такіх генералаў найбольш вядомымі былі: Т. Корсак і Ю. Стакоўскі ў Віленскім ваяводстве, М. Пашкоўскі ў Берасцейскім; К. Белікавіч у Браслаўскім павеце, К. Коцел у Ашмянскім, К. (Юзаф) Нарбут у Лідскім, Сегень у Ваўкавыскім, К. Ельскі ў Гародзенскім, К. Рушчыц у Кобрынскім.

Рада ВКЛ абвясціла рэкруцкі набор у войска сялян і добраахвотнікаў са шляхты. Толькі ў Вільні з ахвочых была створана трохтысячная гвардыя. Большасць шляхты далучылася да паўстання ў рэгіёнах яго распаўсюджання, а таксама частка мяшчан. Найскладаней было з асноўнай масай насельніцтва – сялянствам, ад стаўлення якога ў рашаючай ступені залежаў лёс паўстання. Несумненна, просты люд хутка даведваўся аб паўстанні, пра што сведчыць немалая колькасць фальклорных твораў. "Ай у Вільні ўво ўсе званы зазванілі, у барабаны забілі… Маладзенькі Кастуська ён пры століку стаяў у руках шапку дзяржаў…", – хоць і з блытанінай у канкрэтыцы падзей сцвярджалася ў народнай песні. У фальклоры адлюстраваліся пераважна дадатны вобраз Касцюшкі і спачувальныя адносіны да паўстання, аднак рэальныя паводзіны сялян вызначаліся спадзяваннямі на ліквідацыю прыгоннага права і перадачу ім зямлі, што ў сапраўднасці не адбылося. Выдадзены Т. Касцюшкам 7 мая Паланецкі ўніверсал абяцаў сялянам асабістае вызваленне і некаторае змяншэнне феадальных павіннасцяў. Аднак стараннямі памешчыкаў універсал застаўся на паперы і фактычна не дайшоў да сялян. Літоўская рада абмежавалася агульным і няпэўным абяцаннем "вольнасці".

Барацьба за сялянскія душы набыла шырокі размах. Касцюшка, Ясінскі, іншыя радыкальна настроеныя кіраўнікі былі гатовы да кардынальнага вырашэння сялянскага пытання, аж да поўнага скасавання прыгонніцтва. Аднак асноўная маса шляхты, і асабліва землеўладальнікі, да такіх кардынальных крокаў былі яшчэ не падрыхтаваны, што і абумовіла абмежаванасць Паланецкага ўніверсалу і тым больш магчымасці яго рэалізацыі. Царскія ж генералы давалі сялянам дэмагагічныя абяцанні і настройвалі іх супраць паўстанцкай шляхты, што з'явілася адной з прычын абмежаванага ўдзелу сялян у паўстанні і нейтральна-пасіўнай пазіцыі іх асноўнай масы.

Са свайго боку кіраўніцтва паўстаннем рабіла контркрокі, каб нейтралізаваць дзеянні царскіх улад. У адмысловым звароце Найвышэйшай нацыянальнай рады ад 17 чэрвеня 1794 г. да "польскіх і літоўскіх жыхароў" між іншым сцвярджалася: "Расія не можа абяцаць вам лепшага стану, калі ў свеце няма горшай няволі, у якой яна земляробаў сваіх трымае, дазваляючы прадаваць тых як быдла, на пляцах… Не спакушайцеся ні шляхціцы, ні пасяляне фальшываю надзеяю расійскіх дэкларацый… Польскае праўленне ўсякага стану людзям плён працы іх і гаспадарчае кіраванне раз і назаўсёды жадае

забяспечыць" [Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў. Ф. 16, спр. 758, ч. 2, арк. 196]. Т. Касцюшка імкнуўся выбіць з рук у царызма і рэлігійна-праваслаўную карту, спецыяльна заклікаючы праваслаўнае жыхарства да сумеснай барацьбы за вольнасць і адстойваючы роўнасць іх правоў. У адозве да жыхароў Валынскага ваяводства ад 5 верасня ён заклікаў: "… пакіньце ў спакоі людзей, якія маюць з вамі неаднолькавае веравызнанне, злучыцеся з імі любасцю да бацькаўшчыны і вольнасці народнай, адшукайце свабоду вашу і зрабіце народнае паўстанне" [Расійскі дзяржаўны ваенна-гістарычны архіў. Ф. ВУА, спр. 2734, арк. 508].

Чыннікам ідэйна-палітычнага ўздзеяння на насельніцтва Беларусі з'явіўся адзін з лепшых вершаваных твораў другой паловы XVIII ст. – "Песня беларускіх жаўнераў 1794 г.". Напісаная ў адукаваным шляхецка-паўстанцкім асяроддзі, стылізаваная пад народную, песня з'явілася першым у беларускай літаратуры непасрэдным заклікам да мас узяць у рукі зброю, "косы ды янчаркі", каб "бацькаўшчыну адзыскаць" і "гнуць каркі" знешніх і ўнутраных яе ворагаў. Менавіта да беларускага селяніна звернуты наступныя радкі верша-песні:

*Ці ўжо мы ўсе сабакі?*
*Гаспадары – не бурлакі.*
*За што маем крыўду знаці?*
*За што церпіць наша маці?*
*Прадавайма оўцы, волы,*
*Жыта зь свірна ды ўсе долы.*
*Няхай ксёндз нас пасвянцае*
*Няхай бог дапамагае.*
*Бывай здарова, Грыпіна,*
*Параска! Мая дзяўчына!*
*Ад вас зараз ад'яжджаем,*
*Да Касцюшкі ўсе прыстаем.*
*Калі назад павярнемся,*
*Тады з вамі ўсьцісьнемся.*
*Вольнасць для нас паны даюць*
*І за людзей нас прызнаюць.*

Арганізатарская і агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць пры ўсёй яе непаслядоўнасці і абмежаванасці, прыносіла свой плён. Агульны лік удзельнікаў паўстання ў Беларусі на ўсім яго працягу склаў да 30 тысяч чалавек. Прысутнасць касінераў у паўстанцкіх аддзелах дасягала 20-30% іх колькасці.

Вызначальным для замацавання і пашырэння паўстання было правядзенне паспяховых баявых аперацый. Для забеспячэння цэнтралізацыі кіравання вайсковымі сіламі 3 мая ў Вільню прыбылі генералы літвінскай арміі. Рада абвесціла Я. Ясінскага галоўным камандуючым узброеных сіл ВКЛ. Касцюшка надаў яму званне генерал-лейтэнанта. Аднак пры раскіданасці складаючых узброеныя сілы трох дывізій, Ясінскі рэальна камандаваў толькі адной у раёне Вільні. Ліквідацыю пагрозы сталіцы з усходу ён лічыў сваёй першачарговай ваеннай задачай.

Валодаючы ініцыятывай, Ясінскі рушыў на трохтысячны аддзел палкоўніка М. Дзеева ў Ашмянскім павеце. У паўстанцаў было каля дзвюх тысячаў рэгулярнага войска і амаль тысяча мясцовых сялян-касінераў. Бітва адбылася 7 мая каля в. Паляны з прымяненнем артылерыі і доўжылася з раніцы да вечара. Расійскі бок, страціўшы 174 чалавекі забітымі і больш трохсот параненымі, вымушаны быў адступіць да Смаргоні. Страты паўстанцаў, якія адышлі пад Вільню, склалі некалькі дзесяткаў забітымі і 34 чалавекі трапілі ў палон разам з трыма гарматамі. Упартасцю ў змаганні вылучылася асобная група шляхціцаў, віленскіх стральцоў і сялян, узброеных стрэльбамі, сякерамі, дзідамі і косамі. Поспех Ясінскага прыспешыў Цыцыянава да адыходу з-пад Гародні.

Развіццю дзеянняў літвінскай арміі перашкаджала не толькі нарастаючая канцэнтрацыя расійскіх войск, але і ўнутраныя супярэчнасці ў супольным кіраўніцтве паўстаннем. Пад націскам абвінавачванняў у радыкалізме і літвінскім сепаратызме, што зыходзілі з кансерватыўнага лагеру, Касцюшка 4 чэрвеня адхіліў Ясінскага ад агульнага камандавання войскамі. Літоўская рада, што "уносіць дух нязгоды, які абражае унію братніх народаў" была распушчана, а замест яе 10 чэрвеня створана Цэнтральная дэпутацыя Вялікага Княства Літоўскага, цалкам падпарадкаваная Найвышэйшай нацыянальнай радзе ў Варшаве. Гэта скавала ініцыятыву віленскіх кіраўнікоў. Новым адзіным камандуючым быў прызначаны безыніцыятыўны польскі генерал Міхал Вяльгорскі.

Змены ў галоўным камандаванні падарвалі дух літвінскай арміі. У канцы чэрвеня расійскія войскі перахопліваюць ініцыятыву. Агульнае кіраванне здушэннем паўстання ажыццяўляў з Нясвіжа рыжскі генерал-губернатар князь Мікалай Рапнін. Ён сканцэнтраваў у Заходняй Беларусі і Курляндыі 30 тысячаў салдат, добра ўзброеных і

вымуштраваных. Яны пачалі паступова выцясняць інсургенцкія атрады з тэрыторыі Беларусі.

Тым часам з Украіны на Беларусь рухаўся расійскі корпус пад камандаваннем А.В. Суворава. На Берасцейшчыне яму супрацьстаяў польскі корпус генерал-маёра Караля Серакоўскага. У ліпені-жніўні гэты корпус прайшоў паспяховым рэйдам ад Высокага праз Шарашова, Пружаны, Ружаны да Слоніма, затым вярнуўся да Бярозы. Першапачаткова Серакоўскі меў паўтары тысячы чалавек, даволі добра ўзброеных. За кошт мясцовай шляхты і сялянства склад корпуса дасягнуў пяці тысячаў пры 26 гарматах. Аднак корпус Суворава па гэтых паказчыках меў больш чым двайную перавагу. Пасля асобных сутычак праціўнікі сышліся 17 верасня каля вёскі Крупчыцы непадалёку ад Кобрына (цяпер Жабінкаўскі раён). Найбуйнейшая ў Беларусі бітва распачалася амаль на світанні і скончылася каля 16 гадзін. Першапачаткова паўстанцы паспяхова адбівалі атакі сувораўскай кавалерыі і пяхоты, бо займалі выгодную пазіцыю перад забалочанай ракою Трасцяніца. Тады Сувораў абыходным манеўрам фарсіраваў гэтую раку, з часткай войска выйшаў у фланг абароны і захапіў узвышша над пазіцыяй паўстанцаў. Каб выратаваць асноўныя сілы, Серакоўскі адышоў у кірунку Брэст-Літоўска. Выключную ролю адыграў Берасцейскі батальён, які, ахвяруючы сабою, прыкрываў выхад з бою астатніх. З абодвух бакоў, а пераважна з наступаючага расійскага, страты склалі звыш тысячы ваяроў. Некаторыя паўстанцы ратаваліся за сценамі крупчыцкага кармеліцкага кляштара, але былі там пасечаны казакамі. Серакоўскі перайшоў Буг і спыніўся лагерам каля вёскі Цярэспаль. Ён разлічваў на пару дзён у запасе для атрымання падмацаванняў з Польшчы і перагрупоўкі сіл. Аднак Сувораў не затрымаўся і раптоўным моцным ударам раніцай 19 верасня разграміў і рассеяў корпус Серакоўскага.

У руках паўстаўшых заставаўся яшчэ абмежаваны гародзенскі рэгіён. Сюды на кароткі час прыбывае Касцюшка для азнаямлення з сітуацыяй у літвінскім войску і арганізацыі адпору расійскаму наступленню на Падляшшы. 30 верасня ў каралеўскім замку ён правёў нараду вышэйшых камандзіраў, раздаў узнагароды, але і сурова ацаніў іх дзеянні. Упэўніўшыся ў немагчымасці адстаяць Гародню, Касцюшка вярнуўся ў Варшаву. Туды ж па яго загадзе адправіліся рэшткі інсургентаў і Цэнтральная дэпутацыя ВКЛ.

З-за неспрыяльнай міжнароднай сітуацыі, пралікаў кіраўніцтва, недахопу сіл нацыянальна-вызваленчае па сутнасці і буржуазна-

дэмакратычнае па змесце паўстанне на землях Рэчы Паспалітай не змагло перамагчы. Але ў памяці людской яно засталося і будзіла да барацьбы наступныя пакаленні шляхецкіх рэвалюцыянераў. "Касцюшка быў мілы Богу..., – сцвярджалася ў беларускіх народных паданнях, – Касцюшка заваяваў бы свет цэлы, каб паны яго слухаць хацелі, але паны як паны: гулялі, банкетавалі, Касцюшкі не слухалі, затым і Польшча прапала. Кажуць, што ў Касцюшкі то быў такі плашч, што кулі яго не прабівалі... Касцюшка быў надта адважны і храбры генерал..."

Расійскі імператар Павел І уласнаручна вызваліў Касцюшку, які перанёс двухгадовае зняволенне ў Петрапаўлаўскай крэпасці, і дазволіў выехаць за мяжу, у ЗША, адкуль той вярнуўся на пражыванне ў Францыю, а апошнія два гады жыцця правёў у Швейцарыі. Клапоцячыся, ужо пераважна дыпламатычнымі метадамі, аб аднаўленні страчанай дзяржаўнасці, ён ніколі не забываў пра сваю родную зямлю – "Літву", якой "заслона будучыні пакрывае яшчэ лёсы". За паўгода да смерці, у красавіку 1817 г. Касцюшка падрыхтаваў дакумент, фактычна апошні зварот да суайчыннікаў, у якім абвясціў: "Глыбока адчуваючы, што прыгонны стан супярэчыць закону прыроды і дабрабыту народаў, я сведчу гэтым, што знішчаю яго цалкам і на вечныя часы ў маім маёнтку Сяхновічы ў Брэст-Літоўскім ваяводстве як ад майго імя, так і ад імя наступных яго ўладальнікаў. Я прызнаю жыхароў вёскі, якія належаць да гэтага маёнтка, вольнымі грамадзянамі і нічым не абмежаванымі ўласнікамі зямель, якімі яны валодаюць. Я звальняю іх ад усіх без выключэння данін, паншчыны і асабістых павіннасцяў, якія яны да гэтага часу абавязаны былі адбываць у адносінах да ўладальнікаў гэтага маёнтка. Я заклікаю іх толькі, каб яны дзеля свайго ўласнага дабра і дзеля карысці краіны паклапаціліся аб наладжванні школ і пашырэнні асветы... ". Помнікі нашаму вялікаму земляку стаяць у Кракаве (Польшча), Залатурне (ад Беларускага аб'яднання ў Швейцарыі), Вашынгтоне, Чыкага, Кліўлендзе і Мілуокі, яго імем названы горад у штаце Місісіпі, астравы на Алясцы (ЗША), горны пік і нацыянальны парк у штаце Новы Паўднёвы Уэльс (Аўстралія).

Імя і справа Касцюшкі сталі прыкладам і крыніцай натхнення для барацьбітаў за свабоду і незалежнасць у Еўропе і свеце. Паўстанне адкрыла перыяд шляхецкай рэвалюцыйнасці на землях Польшчы, Літвы, Беларусі і Правабярэжнай Украіны, які працягваўся да сярэдзіны 60-х гадоў наступнага стагоддзя.

Літаратура:


1. Коялович, М.И. Чтения по истории западной России / М.И. Коялович. – Минск : БелЭн, 2006 – 480 с.

2. Ігнатоўскі, У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У.М. Ігнатоўскі ; уступ. арт. А.П. Грыцкевіча ; камент. і заўвагі Э.Н. Гнеўкі. – 5-е выд. – Мінск : Беларусь, 1991. – 190 с.

3. История БССР: учеб. пособие для вузов / под ред. В.В. Чепко, А.П. Игнатенко. – Ч.1. – Минск : Из-во БГУ, 1981. – 328 с.

4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т.3. : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIII стст.) / Ю. Бохан, В. Голубеў, У. Емельянчык і інш. ; рэдкал. : М. Касцюк (гал.рэд.) і інш. – Мінск : Экаперспектыва, 2004. - 344 с.

5. Лойка, П.А. Гісторыя Беларусі, XVI-XVIII стст.: вучэб. дапам. для 7-га кл. установ, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі з бел. і рус. мовамі навучання / П.А. Лойка; пад рэд. П.Ф. Дзмітрачкова, У.А. Сосны. – Мінск : БДУ, 2004. – 191 с.

6. Гісторыя Беларусі : у 2 ч. – Ч.1 : Са старажытных часоў да канца XVIII ст. : Курс лекцый / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель, С.В. Марозава, С.Я. Сяльверстава, І.А. Фёдараў ; рэдкал. : П.І. Брыгадзін і інш. – Мінск : РІВШ БДУ, 2000. – 656 с.

7. Гісторыя Беларусі: падручнік : у 2 ч. – Ч.1 : Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / Я.К. Новік [і інш.] ; пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – 2-е выд. – Мінск : Выш. шк., 2006 – 416 с.

8. Латышонак, А., Мірановіч, Я. Гісторыя Беларусі ад сярэдзіны XVIII ст. да пачатку XXI ст. / А. Латышонак, Я. Мірановіч. – Вільня : Інстытут беларусістыкі ; Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2010. – 368 с.

9. Латышонак, А. Нацыянальнасьць – Беларус / А. Латышонак ; Інстытут беларусістыкі, Беларускае гістарычнае таварыства, 2009. – 558 с.

10. Праграмы агульных курсаў : для студэнтаў гіст. фак. спец. 1-21 03 01 “Гісторыя” : у 3 ч. – Ч.1 / рэд. савет: А.А. Яноўскі, С.М. Ходзін, В.В. Сяргеенкава. – Мінск : БДУ, 2005. – 403 с.

*Трафімчык А В. (Мінск)*

# ТАДЭВУШ КАСЦЮШКА Ў ПАМЯЦІ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

## 1. Народная памяць пра Касцюшку паводле фальклору

У беларускай літаратуры не існуе «касцюшкіяны». Хаця тэндэнцыі да гэтага назіраліся. Яшчэ пры жыцці героя ўзнікалі і працяглы час бытавалі ў народным асяродку песні, звязаныя з імем Тадэвуша Касцюшкі. У легендах, паданнях, песнях, як сведчаць зборы Міхала Федароўскага (іл. 1), захаваны светлы ўспамін пра свайго земляка-заступніка.

*L.* Kościuszko. Zabór kraju.

*Sk. Od Suchowoli. (Chodorówka, Pościętno)*

20. *a)* Kaściuszko był miły Bogu, bo nim poczoł wojować, sto dni pościł i u kościeła modlił sie. — *b)* Kaściuszko zawajewaųby świet cěły, żeb pany jehò słùchać chaciěli, ále pany jàk pany: hulàli, bankietawali, Kaściùszki nie słùchali, zatým i Pùlszcza prapàła. — *c)* Kàżuć, co u Kaściùszki to byų taki płaszcz, co kùli jehò nie prabiwàli: jèdnało ràzu maskali na jehò z niezèųka napàli, tak jùn nie uśpièų tahò płaszcza złażýć, tak jehò czýsto pasièkli i zabràli. — *d)* Kaściùszko byų nàdto adważny i chràbry gienerał, mùj tàtko śpiewàų ab jòm pièśniu jàkśei:

— „Nasz Kaściùszko słàųny byų,
Maskàlikoų dòbro bių,
Jak Kaściùszku złapàli,
Kijam bòki złatàli“

àle dàlej nie wièdaju, bo zabýųsie. (Jan Dzieżko).

*W. Od Szydłowic, (Ozeranki małe).*

21. Jak Kaściùszka zławili, to zaraz) pryweli pieràd carà, da-j kazàli jemù, kab jùn prysiahnùų Rasii, tak jùn skazàų: „Na czyjùj ziemlè stajù, tamù prysiahàju i za tahò hòlaų pałażù“! A jùn upierùd nabràų ziemli u czòbaty, jak z Pùlszczy wyjehdżàų i na tùj ziemli prysiahàų: ot i tamù to jùn ni źniewièryųsie. Ot kàli chitry byų da razùmny [1]. (Benadýk Czàbiołka).

***Іл 1. Паданні пра Касцюшку з кнігі Міхала Федароўскага (адбітак з першакрыніцы: Federowski, M. Lud białoruski na Rusi Litewskiej: materyały do etnografii słowiańskiej zgromadzone w latach 1877-1905 / Federowski M. – Kraków, 1903. – T. 3, Baśnie, przypowieści i podania ludu z okolic Wołkowyska, Słonima, Lidy i Sokółki. Cz. 2, Tradycye historyczno-miejscowe oraz powieści obyczajowo-moralne. – S.11.).***

Найбольш значным фальклорным творам пра Касцюшку з'яўляецца ліра-эпічны сказ, умоўна названы даследчыкамі «Беларускай песняй пра Касцюшку». Твор быў адшуканы і апублікаваны ў другой палове XIX ст. практычна паралельна трыма збіральнікамі фальклорнага багацця: у 1872 г. Пятром Бяссонавым (ён падрыхтаваў і выдаў зборы Пятра Кірыеўскага, якія не пазней 1856 г. (год яго смерці) запісаў песні пра Касцюшку ў этнічна беларускім сяле Данькова Смаленскага павета і на землях у глыбі Расіі), у 1874 г. Паўлам Шэйнам (непасрэдна запіс гэтай песні зрабіў пад Барысавам памагаты вядомага даследчыка, падпісаны як «Н.А. Рубековский») і ў 1882 г. нейкім Пламеньчыкам (запіс быў зроблены пад Лепелем – іл. 2).

**Pieśń białoruska o Kościuszce.**

Słanno Wilno, słanno Hrodno
A słanniej Warszawa
. . . . . . . . . . . . **)
. . . . . . . . . . . . .
Wyjeżdżajeć pan Kaściuszka
Maskwu wajować,
Zaświstali kozaczenki***),

Z pounocz na wychodzie,
Zapłakała Marusieńka
U swoje jasnyja woczy:
„Nia jedź, nia jedź pan Kaściuszko
Maskwy wajować,
Maskwa silna i wialika
A hdzież jaje mała?"
„Jość u kozakou koni waranyje,
Cwiaki*) zalatyje.
Nie płacz, nie płacz Marusieńka
Ja waźmu z saboju,
Ja ciebie waźmu z saboju
Nazawu siastroju,
Choć siastroju nia rodnoju
Zaunierskoj żanoju.
A my budzim Maskwu wajować,
Marusia harować,
A my budzim miód, wino pić,
Marusia ślozki lić."
Wajowali, wajowali
Kaściuszku zabili.

Łażyć, łażyć pan Kaściuszka
Na biełym kamieniu.
Pryszła jaho Marusieńka
Słozmi zaliłasia:
„A jaż ciapier niesczasnaja
Adna astałasia!
Czy jaż tabie pan Kaściuszka
Czy jaż nie kazała,
Czy jaż tabie pan Kaściuszka
Czy nie hawaryła:
Szto nia jedźte pan Kaściuszka
Maskwy wajować,
Maskwa silna i wialika
A hdzież jaje mała?
Waźmi matka piasku żmieniu

Pasiej na kamieniu,
Jak hetot piasok uzojdzieć
Tak Kaściuszka z wajny prydzieć.
Lacić piatuch czeraz reku
Piajeć kukareku,
Ja niauwiżu Kaściuszeczki
Ad wieku da wieku.
Lacić woron czeraz more,
A łatuczy kraczyć;
A chtoż majho Kaściuszeczki
Mahiłku apłaczyć?!"

*Іл. 2. «Беларуская песня пра Касцюшку» з публікацыі Пламеньчыка (адбітак з першакрыніцы: Płomieńczyk. Pieśń białoruska o Kościuszce / Płomieńczyk // Dziennik poznański. – 1882. – 23 marca. – S. 1).*

Усе тры згаданыя рэгіёны адносяцца да ўсходняй часткі Беларусі. А трохі пазней, у 1903 г., варыяцыі твора былі адсочаны Вячаславам Камінскім у Відзах (Браслаўшчына – Паўночная Беларусь) і

Уладзімірам Дабравольскім (апошні на заключным адрэзку свайго жыцця жыў у вышэйзгаданым сяле Данькова і таксама карыстаўся спадчынай П. Кірыеўскага).

Гэта цікава і ў нейкім сэнсе знамянальна ўжо само па сабе, бо сведчыць пра этнічнае адзінства вялікай беларускай тэрыторыі: як бачна з песні, насельніцтва нават тых земляў, на якіх не вялося ваенных дзеянняў інсурэкцыі 1794 г., усведамляла падзеі паўстання як блізкія ім і ў той жа час, не зважаючы на асіміляцыйную палітыку суседзяў, ясна адрознівала сябе ад палякаў і расейцаў («маскалёў»).

Найбольш поўныя варыянты зафіксаваны П. Шэйнам і Пламеньчыкам і маюць 44 і 50 радкоў. Сюжэтна яны падобныя: жаўнер выязджае «Маскву ваёваць», развітваецца з каханай, якая пасля пагібелі героя галосіць па ім. Твор выкананы ў класічных традыцыях гэтага жанру.

Сюжэтна бяднейшымі, эмацыйна больш адстароненымі з'яўляюцца "смаленскія" рымейкі гэтага твора. Галоўная ўвага тут звернута на любоўныя матывы ў кантэксце падзеі, дзе гіне «панъ Кастюшка» і яго аплаквае «паня маладая». Важна, аднак, што ні падзея, ні імя галоўнага героя не сцерліся з народнай памяці. У той жа час не наступіла і атаясамлення з Масквой, якая фігуруе ў абодвух тэкстах і прадстаўляецца таксама дыстанцыйна, як і Кракаў, Вільня, «Бѣлы Стокъ» / «Биласток».

Варыянт, занатаваны В. Камінскім на Браслаўшчыне, да таго часу з нейкіх прычын застаўся без першапачатковай завязкі. Песня пачынаецца з кароткага, канстатацыйнага апісання сутыкнення шляхты і маскалёў і вынікаў гэтай падзеі.

*Ляжаць, ляжаць палячанькі*
*Па тры па чатыры.*
*Ляжыць, ляжыць панъ Касцюшка*
*Ашъ падъ Бѣлым-стокомъ...*

Запіс В. Камінскага мае канцоўку са з'едлівай рыторыкай – своеасаблівай высновай адносна падзеі.

*Палячанькі дварачанькі!*
*Дзѣ жъ вы царства дзѣлі?*
*У Варшаві, ў слаўным мѣсця*
*На абѣдзя зъѣли*

*Палячанькі двaрaчанькі!*

*Дзѣжъ вашъ розумъ дзѣўся?*
*У сабакі блізка сракі,*
*Падъ хвастомъ звярц'еўся [4, с.756].*

Перцэпцыя і мастацкая канструкцыя вобраза Касцюшкі ў песнях таксама не тоесная. У лепельскім варыянце прысутнічае эмпатыя ў сувязі з трагічным лёсам героя, ступень якой значна змяншаецца ў запісанай пад Барысавам песні і, бадай, не захоўваецца да пачатку XX ст. у браслаўскім варыянце.

Такім чынам, як паказвае аналіз, з аднаго боку, існаванне «Беларускай песні пра Касцюшку» ў розных рэгіёнах сведчыць пра іх роднаснасць як тэрыторыі адной народнасці, аднак, з іншага боку, адрозненні, разыходжанні ў інтэрпрэтацыях і ўспрыманні апісаных падзей, а таксама ў канструяванні вобраза галоўнага героя – Касцюшкі – гавораць пра неаднолькавую ступень уздзеяння тых падзей на насельніцтва рэгіёнаў будучай Беларусі. Адметна, што адчужанасць ад гістарычнай постаці Касцюшкі ў беларускім фальклоры ўзрастае з часам: пакрысе давалася ў знакі нацыянальнае развіццё беларусаў у рамках Расійскай імперыі. Рэшткі фальклорных здабыткаў на тэму паўстання і яго кіраўніка, тым не менш, даюць падставу меркаваць пра наяўнасць у мінулым прыкметнай колькасці песень, народжаных падзеямі 1794 г.

## 2. Аўтарскія літаратурна-мастацкія творы

*Вершы канца XVIII–XIX ст.*

Беларуская літаратура канца XVIII– пачатку XIX ст. утрымлівае такі загадкавы здабытак, як «Песня беларускіх жаўнераў 1794 года». Гэта – ананімны, але аўтарскі твор, які мае ўкраінскі і польскі аналагі. Адам Мальдзіс адзначае, што «мы сустракаемся са свядомай стылізацыяй пад народную песню, увядзеннем дыялектных форм» [6, с.289]. (Пра твор гл. таксама іншы наш артыкул у гэтым выданні.) Ёсць падставы сумнявацца ў аўтэнтычнасці «Песні…» [гл. падрабязней: 9], аднак пакуль будзем кіравацца прынятым успрыманнем твора акадэмічнай навукай.

Пасля таго, як сціхлі бурлівыя падзеі інсурэкцыі, вобраз ачольніка паўстанцаў стаў мастацкім не толькі ў фальклорным дыскурсе. Літаратары таксама яго не абміналі. Але ў сілу сацыяльна-палітычных варункаў многія сыны ліцвінскай зямлі часта працавалі на культуры суседніх народаў – польскага і расійскага, выкарыстоўваючы пры

гэтым адпаведныя мовы, без якіх тады не было магчымасцей інтэлектуальнага развіцця. У гэтым кантэксце можна назваць інтымна-лірычную песню Яна Чачота «Развітанне Касцюшкі з Юліяй». Апошнім дасавецкім зваротам да нацыянальна-вызваленчых матываў з выкарыстаннем імя Касцюшкі як кангеніяльнага сімвалу з'яўляецца верш беларускага адваката (у простым і пераносным сэнсе) Францішка Багушэвіча, напісаны з нагоды сотых угодкаў інсурэкцыі – «Да 100-годдзя».

Гэты верш Ф. Багушэвіча стаў апошнім у XIX ст. творам на Беларусі з выкарыстаннем вобраза Касцюшкі як літаратурна-мастацкага канцэпта і кангеніяльнага сімвала.

*Вершы канца XX–пачатку XXI ст.*

Рэанімаванне ў беларускім мастацкім слове вобраза Касцюшкі адбылося толькі ў канцы 70-х гг. XX ст.: Данута Бічэль-Загнетава, не пагаджаючыся з духоўнай стратай у памяці народа, забыццём свайго нацыянальнага героя, дэкларуе, што ён «перад *жывымі* (курсіў наш. – *А. Т.*) ў змаганні заўжды» [2]. З 1990-х гг. узнікае мэйнстрым у асваенні вобраза Т. Касцюшкі беларускімі мастакамі слова, найперш паэтамі. Свае слова тут сказалі: Васіль Жуковіч (трыпціх «З імем Тадэвуша Касцюшкі»), Раіса Баравікова (верш “Дзіўлюся я, – узор які!”), Сяргей Патаранскі (верш «Маналёг Касьцюшкі»), Мікола Пракаповіч (верш «Водгулле»), Алесь Корнеў (трыпціх «За свабоду Айчыны пакутнай»), Аляксей Белы (верш «Сны аб Радзіме»), Расціслаў Бензерук (верш «1794»), Уладзімір Гардзейка (верш «Ружа Касцюшкі»), Віктар Шніп “Балада Тадэвуша Касцюшкі (12.02.1746 – 15.10.1817)”[113], Алесь Мацулевіч (верш “Шынель на піках”), Аляксей Саламаха (паэма “Касцюшкава прысяга”). Асобна адзначым, што ў мультыплікацыйнай гісторыі Беларусі (аўтар слоў – Лявон Вольскі) вобразу Тадэвуша Касцюшкі ўдзелена больш увагі, чым каму іншаму (напрыклад, Вітаўту, Скарыне, Кастусю Каліноўскаму).

Зварот прафесіяналаў пяра да тэмы жыцця і дзейнасці Тадэвуша Касцюшкі стаў каталізатарам творчай ўвагі падрастаючага пакалення. Многія школьнікі пішуць па гэтай тэме сачыненні.

Акрамя таго, лірыка не факусіруе ўвагі на фігуры героя, прытым ужывае яго вобраз у якасці канцэптуальнай мастацкай дэталі. Звычайная з'ява, калі імёны значных нацыянальных постацей з

[113] NB аўтар памыляецца ў дацІроўцы дня нараджэння Т. Касцюшкі. Паводле адной з версій гэта – 4 лютага 1746 г., другой – 30 лістапада 1745 г.

гістарычнага мінулага народаў выкарыстоўваюцца ў якасці мастацкага канцэпту ці сімвалу для надання твору. Увогуле вобраз Тадэвуша Касцюшкі, апеты ў паэтычных творах як эстэтычна-ідэйны канцэпт для рэалізацыі галоўнай задумы, характарызуецца ўзорным патрыятызмам і адданасцю дэмакратычным ідэалам. Праходзячы па вершы своеасаблівым штрыхом, гэты мастацкі канцэпт у сілу значнасці фігуры героя ўзмацняе грамадзянскае гучанне твора. Прычым прасякнутасць патрыятычнымі пачуццямі мае ліцвінска-беларускі характар без размежавання на ліцвінскасць ці беларускасць і тым самым нібыта стварае мосцік паміж імі, падкрэсліваючы пераемнасць розных гістарычных эпох на зямлі сённяшняй Беларусі.

З гэтага можна зрабіць наступную выснову: калі імя, мастацкі вобраз Касцюшкі выкарыстоўваецца ў якасці канцэпту, то постаць героя трэба прызнаць укаранёнай у культуралагічны і гістарычны дыскурс беларускага народа. На карысць азначанага ўкаранення сведчыць як шматлікасць вершаваных твораў з прымяненнем вобраза Касцюшкі, так і характар таго прымянення, калі імя згадваецца як нейкі паказчык, крытэрый, арыенцір, пры гэтым расшыфроўка для чытача не патрабуецца, знакавасць з'яўляецца апрыёрнай.

Вобраз гэтага героя беларускай гісторыі ў якасці мастацкага канцэпту за апошнія два дзясяткі гадоў, відавочна, «падцягнуўся» да пантэону найвыбітнейшых нацыянальных дзеячаў, якія аналагічна выкарыстоўваюцца ў беларускім прыгожым пісьменстве, – такіх, як у першую чаргу Кастусь Каліноўскі.

*Проза*

Касцюшкаўскі мастацка-літаратурны цыкл мае працяг у малафарматнай беларускай прозе і ўключае лірычныя нарысы Яраслава Пархуты пра малую радзіму кіраўніка паўстання, Расціслава і Анатоля Бензерукоў пра апошнія імгненні жыцця героя, эсэ Уладзіміра Арлова «Тадэвуш Касцюшка» з цыклу «Імёны свабоды» і Уладзіміра Хільмановіча «Феномен Касьцюшкі», а таксама біяграфічную замалёўку Ірыны Масляніцынай і Міколы Багадзяжа «Генерал Свабоды» і «пацерку» з «нізкі караляў» Ніны Дыдышка «Радасць і смутак кахання Тадэвуша Касцюшкі» пра яго пасій. Ці не самым першым (для беларускага дыскурсу) папулярным нарысам адгукнуўся пра героя-земляка вядомы аўтар гістарычнай прозы Кастусь Тарасаў. Сведчаннем несуціхлай цікавасці да каласальнай па значэнні постаці Т. Касцюшкі з'яўляюцца таксама свежыя публікацыі

Ігара Мельнікава. Шмат сачыненняў на тэму жыццядзейнасці героя створаны школьнікамі, лепшыя творы ўбачылі свет (верагодна, розных нарысаў і эсэ пра героя ў беларускім прыгожым пісьменстве больш, але не ўсе яны трапілі пад нашу ўвагу).

Эсэ, нарысы пра Касцюшку беларускіх аўтараў атрымліваюцца дужа стракатымі. У кожнага – «свой» Касцюшка. Герой, убачаны праз асабістую прызму, кшталтаваную, пэўна, узростам, адукацыяй, геаграфіяй жыццёвых шляхоў… У той жа час ва ўспрыманні ёсць і агульнасць: у кожнага з аўтараў знакаміты ліцвін не толькі «*свой*», але і «*наш*», беларускі. Пры гэтым аўтары не адбіраюць героя ў іншых народаў: Касцюшкі, маштаб дзейнасці якога глабальны, хопіць на ўсіх.

Гістарычная постаць Тадэвуша Касцюшкі ў сілу яго ваенна-палітычнай дзейнасці даволі «раманная». З гэтай прычыны ён стаў вельмі папулярным сярод празаікаў-эпікаў самых розных краін. Але ў беларускай літаратуры да XXI ст. не было твораў пра знакамітага земляка ў форме эпічнай прозы.

Ягор Конеў стаў аўтарам чатырох аповесцей (2003–2009): «Срэбны арол у чырвоным полі» і «Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі» – пра амерыканскі перыяд жыцця і дзейнасці Т. Касцюшкі, “Грэчкасейная ідылія Тадэвуша Касцюшкі” і «Літоўская адысея Тадэвуша Касцюшкі». У іх створана мастацкая панарама “дапаўстанцкага” жыцця і дзейнасці аднаго з самых вядомых у свеце ўраджэнцаў беларускай зямлі. Гэтым самым зроблены яшчэ адзін важкі ўнёсак у вяртанне нашага знакамітага земляка ў дыскурс беларускай гуманітарнай традыцыі. Прычым аўтар-беларус імкнецца не прысвоіць Т. Касцюшку, але паказаць яго верным і адданым сынам зямелькі роднае і ўвогуле чалавекам, годным як сваёй Айчыны, так і ў цэлым цывілізацыі – такім, якім і быў насамрэч герой двух кантынентаў.

У 2014 г. на Беларусі ўбачыў свет яшчэ адзін эпічны твор пра Тадэвуша Касцюшку – рускамоўны раман Юрыя Усціна «Лабірынты свабоды».

*Драматургія*

З нядаўняга часу вобраз Касцюшкі звярнуў на сябе ўвагу аўтараў п’ес. Алесь Петрашкевіч гістарычнай драмай «Развітанне з Радзімай» адкрывае старонку закату некалі магутнага канфедэрацыйнага ўтварэння двух дзяржаў – ВКЛ і Польскай Кароны – Рэчы Паспалітай. Тадэвуш Касцюшка, аднак, не з’яўляецца ў творы пратаганістам. У далейшым А. Петрашкевіч канцэптуальна перапрацаваў п’есу пра

Касцюшкаўскае паўстанне, змяніўшы і назву (гістарычная трагедыя "Смерць або Перамога").

Зінаіда Дудзюк у аднаактовай п'есе «Нарадзіўся я літвінам», упершыню пастаўленай калектывам Народнага тэатра Івацэвіцкага РДК у 2005 г., уздымае тэму, якая дагэтуль не асэнсоўвалася беларускімі мастакамі слова, хаця фігуруе ў выяўленчым мастацтве і распрацавана ў гістарычнай навуцы, – тэму зняволення Т. Касцюшкі, у ходзе якога ён азіраецца назад, у мінулае, спрабуе не толькі ўзважыць яго, асабліва свае памылкі, але і метафізічна вярнуцца да некаторых момантаў.

У 2017 г. на беларускай сцэне постаць названага героя з'явілася другі раз: Беларускі дзяржаўны моладзевы тэатр ажыццявіў пастаноўку па п'есе Ганны Баярскай пад назвай «Урок польскага». У ёй гаворыцца пра астатнія гады жыцця славутасці.

У цэлым п'есы беларускіх аўтараў пакідаюць шырокія магчымасці асвойваць далей вобраз Тадэвуша Касцюшкі ў драматургічным кантэксце.

Рэзюміручы, трэба канстатаваць, што паўстанне 1794 г. і ў прыватнасці яго кіраўнік знайшлі свой выразны адбітак у мастацкім слове беларускага народа, што, як слушна заўважыў А. Каўка яшчэ чвэрць веку таму, найлепшым чынам сведчыць пра гістарычна-духоўнае сваяцтва славутага земляка з беларускім народам, у памяці якога гэтая крэўнасць даўно выверана высокімі этычнымі і эстэтычнымі крытэрыямі[114].

### 3. Гістарычныя даследаванні

Да часу суверэннасці Беларусі ў яе гістарычнай навуцы пра Тадэвуша Касцюшку і паўстанне 1794 г. інфармацыі было мінімум. Так, у аўтарытэтным для савецкіх часоў пяцітомным выданні гісторыі Беларусі з удзелам сумна вядомага Лаўрэнція Абэцэдарскага Касцюшка згадваецца адно двойчы: 1) як «выдатны польскі патрыёт» беларускага паходжання, 2) мімаходзь паведамляецца пра падаўленне паўстання пад яго кіраўніцтвам [3, с. 194, 446].

Сёння аб'ём прац беларускіх даследчыкаў на тэму падзей 1794 г. – ад невялікіх артыкулаў да грунтоўных кніжных выданняў – прыкметны. Легендарная постаць Тадэвуша Касцюшкі ў папулярнай гістарычнай літаратуры прадстаўлена дастаткова падрабязна:

---

[114] Гл. падрабязней на тэму Касцюшкі ў беларускім фальклоры і мастацкай літаратуры: [7].

асветлены найперш яго грамадска-палітычная дзейнасць, якая мела глабальныя маштабы, стасункі з сябрамі і роднымі, не забыта і каханне. Такая цікавасць з'яўляецца натуральнай. Тадэвуш Касцюшка зацвердзіўся як падставовы герой айчыннай гісторыі ў адным шэрагу з такімі асобамі, як Вітаўт, Канстанцін Астрожскі, Кастусь Каліноўскі...

Знакавай публікацыяй тут з'яўляецца невялікая кніжка Язэпа Юхо і Уладзіміра Емяльянчыка «Нарадзіўся я ліцвінам...» (Мінск, 1994). Значна больш разгорнута, з добрым ілюстрацыйным суправаджэннем, на аснове матэрыялаў шматлікіх архіваў розных краін расказваецца пра Т. Касцюшку ў выданні Леаніда Несцярчука "Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка: Вяртанне героя на радзіму" (Брэст, 2006). Шырока папрацаваў у справе папулярызацыі постаці Т. Касцюшкі берасцейскі тандэм краязнаўцаў бацькі і сына Расціслава і Анатоля Бензерукоў. У кнізе апошняга прыводзіцца спіс публікацый пра героя ў беларускім друку за 40 гадоў – ад 1965 (!) да 2005 [1, с.110–120]. Іх лік – ад газетных нататак да навуковых работ – ідзе на сотні. Прычым аўтар зарэгістраваў не ўсе публікацыі, некаторыя засталіся па-за яго ўвагай. Можна не сумнявацца, што за апошні тузін гадоў спіс папоўніўся значна.

Што датычыцца навуковай літаратуры, неабходна найперш успомніць агромністы аб'ём працы, выкананы на рубяжы стагоддзяў Яўгенам Анішчанкам (усіх больш за дзясятак манаграфій і зборнікаў дакументаў). Хоць нельга сказаць, што фігура Касцюшкі і падзей, звязаных з яго жыццём, карыстаецца павышанай навуковай увагай сярод гісторыкаў дзяржаўных устаноў Беларусі.

Акрамя таго, праведзена некалькі канферэнцый, прысвечаных паўстанню 1794 г. і яго кіраўніку (найбольш значныя: Міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 200-годдзю паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, Брэст, 1994 г. (зборнік не выйшаў); Міжнародны семінар "Беларусь і Тадэвуш Касцюшка: спадчына, час, здабыткі", Мінск, 28–29 лістапада, 2000 г.; Міжнародная канферэнцыя, прысвечаная 210-годдзю паўстання пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі, "Тадэвуш Касцюшка і яго час", Брэст, 20-21 мая 2004 г.; Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Тадэвуш Касцюшка ў дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці», Мінск, 22-23 чэрвеня 2017 г.).

Такім чынам, сёння ўжо можна казаць пра існаванне пэўнага беларускага дыскурсіўнага поля вакол Касцюшкавай постаці, што стаяла ў цэнтры лёсавырашальных для нашых зямель падзей.

Пакрысе ў беларускім дыскурсе схіляюцца да меркавання, што тэрмін «паўстанне», хаця ён выкарыстоўваўся і самімі ўдзельнікамі, не зусім адпавядае развіццю падзей тагачасся, таму што, па сутнасці, ішла вайна за захаванне дзяржаўнай незалежнасці Рэчы Паспалітай з яе боку і за набыццё калоній з боку саюзнікаў. Таму, магчыма, варта было б тую ваенную барацьбу народа маркіраваць як збройны чын ці вайну як такую, што часткова, відаць, з прычыны дасягнення навуковай карэктнасці, робіць Я. Анішчанка ў назве свайго выдання "Восстание и война 1794 года в литовской провинции" (Мінск, 2001). Тэрмін жа «паўстанне» ў пэўным сэнсе легалізоўваў правамернасць расійскіх імперыялістаў на гэтыя землі, якія нібыта адбіліся ад «Руси-матушки». Насамрэч антыдзяржаўным, антыканстытуцыйным паўстаннем стала Таргавіцкая канфедэрацыя, інспіраваная Расіяй, з наступствамі, якія сёння палітолагамі правамерна называюцца «гібрыднай вайной».

Тым не менш на тэме паўстання 1794 г. і адносінаў да яго кіраўніка востра сказваюцца дзве супрацьлеглыя ідэалагічныя тэндэцыі ў беларускай гуманітарыстыцы. Першая – якая бачыць у Касцюшку патрыёта Літвы / Беларусі. Другая – заходнеруская – лічыць гэту гістарычную фігуру варожай беларускаму народу. Парадаксальна, але апошнія, з'яўляючыся, як правіла, паланафобамі, фактычна па гэтым пытанні салідарызуюцца са сваімі ідэйнымі праціўнікамі.

Аднак хапіла чвэрці стагоддзя, каб убачыць, што другая з названых паступова здае пазіцыі. Лепшым індыкатарам такога працэсу з'яўляецца захаванне памяці ў сацыяльным кантэксце (гл. наступны раздзел).

**4. Касцюшкаўская мемарыялізацыя: тапаніміка, памятныя мясціны і помнікі**

Імя Касцюшкі шануецца ва ўсім свеце. Са зразумелых прычын найбольшая канцэнтрацыя мемарыялізацыі назіраецца ў Польшчы і ЗША.

Шанаванне памяці пра Тадэвуша Касцюшку на радзіме многімі лічыцца недастатковым. У якасці доказу прыводзіцца ўзровень інфармацыйнай абазнанасці народа: толькі прадстаўнікі гуманітарнай інтэлігенцыі ўспрымаюць Касцюшку як непасрэдна прыналежнага да нашай гісторыі. Тым часам люду паспалітаму больш вядома фігура Аляксандра Суворава, які праліў на Беларусі нямала крыві пры падаўленні інсурэкцыі, аднак у далейшым расійская імперыялістычная прапаганда зрабіла з яго вызваліцеля беларусаў з-пад прыгнёту польскіх ды літоўскіх феадалаў.

Да 1990-х гг. доўгі час на Беларусі існаваў толькі адзін знак у гонар Касцюшкі. (Міжваенны перыяд уваходжання Заходняй Беларусі ў склад Польскай Рэспублікі ў разлік не бяром.) Тым знакам быў валун у колішнім смаргонскім парку Агінскіх з высечаным надпісам "Cieniom Kościuszki". З атрыманнем незалежнасці краіны пачаліся зрухі ў бок шанавання памяці пра сусветна знакамітага земляка. Шырока адзначалася 200-годдзе паўстання (1994). Адных публікацый у беларускіх СМІ лік ішоў на сотні. Да сярэдзіны 1990-х гг. у Беларусі імем Касцюшкі былі названы вуліцы ў Гродне, Брэсце, Косаве, устаноўлены мемарыяльныя знакі ў Гродне і Косаве. Адным з апошніх праяўленняў той тэндэнцыі стала правядзенне 15 кастрычніка 1997 г. дакументальна-мастацкай выставы, прысвечанай памяці Тадэвуша Касцюшкі ў Беларускім рэспубліканскім навучальным комплексе "Гімназія-каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка".

Але потым зноў настаў зацішак. Ён быў абумоўлены галоўным чынам дзяржаўным курсам Беларусі на інтэграцыю з Расіяй.

З пачатку XXI ст. савецкая культурная і гістарычная спадчына ў Беларусі паступова страчвае значэнне. Разам з тым большая ўвага звяртаецца ў мінулае менавіта беларускага народа. У т. л. да тэмы паўстання 1794 г. і яго лідара. Працэс Касцюшкавай мемарыялізацыі на Беларусі з часам інтэнсіфікуецца. Павялічваецца колькасць вуліц з імем сусветнавядомага земляка, помнікаў яму, памятных знакаў, музейных экспазіцый.



*Іл. 3. Адзін з апошніх фотаздымкаў радзіннага дома Касцюшкаў у Марачоўшчыне (фотамастак Юзаф Шыманьскі, 1937 г.). Крыніца: Radzima.org [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.radzima.org/pl/object-photo/534.html. – Дата доступу: 13.01.2018.*

У прыватнасці варта адзначыць з'яўленне населенага пункта на Магілёўшчыне з імем Касцюшкі, устаноўку помніка-бюста ў Малых Сяхновічах, побач з якімі расце адзіны Касцюшкаўскі парк з дрэвамі, некалі пасаджанымі генералам, і там жа, у школцы, зроблены музейны пакой. Узведзена памятная капліца ва ўшанаванне палеглых касцюшкаўцаў на Крупчыцкім полі. У 2004 г. у Марачоўшчыне (Івацэвіцкі раён Брэсцкай вобласці) аднавілі родавы маёнтак Касцюшкаў (іл. 3), дзе стварылі і адпаведны музей. Пачалася рэстаўрацыя Косаўскага палаца Пуслоўскіх у адным ансамблі з Касцюшкавым фальваркам. Яшчэ адзін бюст героя стаіць на тэрыторыі амерыканскага пасольства ў Мінску. Да двухсотых угодкаў смерці Т. Касцюшкі адкрылі памятную дошку на сцяне фарнага касцёла Гродна.

Апошнім часам актыўнасць беларусаў па ўшанаванні памяці пра свайго земляка-героя выйшла за межы яго радзімы, сягнуўшы нават Швейцарыі. Там у 2017 г. адкрыўся першы ў свеце помнік Тадэвушу Касцюшку, пастаўлены суайчыннікамі (іл. 4).



***Іл. 4. Помнік Тадэвушу Касцюшку ў Швейцарыі. Крыніца: Помнік Тадэвушу Касцюшку (Золатурн) // Вікіпедыя [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Помнік_Тадэвушу_Касцюшку_(Золатурн) – Дата доступу: 13.01.2018.***



***Іл. 5. Помнік Тадэвушу Касцюшку ў Марачоўшчыне. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://1reg.by/2018/01/23/ivacevicki-rayvyikankam-dazvoliu-pastavic-pomnik-kascyushku-u-kosave/. – Дата доступу: 13.01.2018.***

Плануецца ўстаноўка помніка Касцюшку на яго Бацькаўшчыне. Самае галоўнае ў гэтай сітуацыі – з боку Міністэрства культуры і Брэсцкага аблвыканкама паступіла канструктыўная рэакцыя на праект [5][115].

У беларускай грамадзянскай супольнасці вітае ідэя прысваення Т. Касцюшку найвышэйшага ганаровага звання нашай краіны – Героя Беларусі.

Ініцыятыва большасці падобных мерапрыемстваў належыць галоўным чынам грамадскай арганізацыі «Брэсцкае міжраённае грамадскае гісторыка-культурнае аб'яднанне імя Т. Касцюшкі» і яе старшыні Леаніду Несцерчуку. У 2017 г. названай арганізацыі праз ЮНЕСКА выдзелены грант з мэтай далейшага ўшанавання Касцюшкі і захавання памяці пра яго.

Важным крокам не толькі ўшанавання памяці, але і папулярызацыі імя і дзейнасці Касцюшкі стаў выпуск дакументальных фільмаў. Іх да гэтага часу нам вядома пяць:

першы – чатырохсерыйны фільм Алега Лукашэвіча «Тадэвуш Касцюшка. Вяртанне героя» (агулам больш чым 100 хвілін), выйшаў на Першым нацыянальным тэлеканале ў 2007 г.;

другі – дваццаціхвілінны «Вобраз героя. Тадэвуш Касцюшка» вытворчасці «Белвідэацэнтра», з'явіўся да 265-годдзя нараджэння героя (2011);

трэці – у серыі "Гісторыя пад знакам Пагоні" фільм на восем хвілін "Тадэвуш Касцюшка", выпусціў "Белсат" (2013);

чацвёрты – зняты той жа кампаніяй у серыі "Загадкі беларускай гісторыі" фільмы "Касцюшка контра Сувораў" (трынаццаць хвілін, 2015);

пяты – 5-хвілінны ролік пра інсурэкцыю на рускай мове "1794 – Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі", што зняла Тэлерадыёкампанія "Брэст".

І гэта без уліку шматлікіх інфармацыйныхролікаў (часам да пяці і больш хвілін), якія рэгулярна прадукуюцца з нагоды розных дат, звязаных з жыццём Т. Касцюшкі і паўстаннем 1794 г.

20 студзеня на сустрэчы з журналістамі пасля цырымоніі адкрыцця ў цэнтры Мінска мемарыяльнай дошкі на месцы размяшчэння ў 1919 г. Камісарыята па замежных справах БССР Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей заявіў: "Я лічу, што абсалютна няправільна,

---

[115] Падчас падрыхтоўкі матэрыялу да друку 12 мая 2018 г. гэты помнік быў адкрыты (іл. 5).

калі Ігната Дамейку ў Чылі і Тадэвуша Касцюшку ў ЗША ўспрымаюць як прадстаўнікоў іншай дзяржавы. Таму мы проста абавязаныя зрабіць так, каб беларуская гісторыя была напісаная аб'ектыўна, каб бачылі, што карані беларускай дзяржавы сягаюць далёка ў мінулае і што нам ёсць чым ганарыцца". Прыведзеныя словы пацвярджаюцца на практыцы. Так, Цэнтр вывучэння Беларусі ў Пекіне сярод партрэтаў бясспрэчна і адназначна беларускіх дзеячаў гісторыі і культуры Рыгора Барадуліна, Уладзіміра Караткевіча, Янкі Купалы, Уладзіміра Мулявіна размясціў на сваёй сцяне і выяву Т. Касцюшкі. Сімптаматычна, што на сайце Міністэрства абароны Беларусі ў раздзел, прысвечаны беларускім героям розных эпох, таксама патрапіў Т. Касцюшка (парадаксальна, аднак, што разам са сваімі праціўнікамі) [паводле: 8].

Такім чынам, шэраг аб'ектаў, якія носяць ганаровае імя героя, апошнім часам на Беларусі няўхільна пашыраецца. Нярэдка гэтыя працэсы каталізуюцца беларускім грамадствам, што сведчыць пра ўспрыманне фігуры Касцюшкі як з'явы сваёй гісторыі і культуры. Усё больш канструктыўна рэагуе на ініцыятывы дзяржава, дазваляючы Касцюшкаўскай мемарыялізацыі рассунуць межы.

* * *

Пры ўсёй інфармацыйнай насычанасці дадзены артыкул змясціў толькі асноўныя, найбольш важкія паказчыкі і вынікі захавання памяці беларускага народа пра Тадэвуша Касцюшку. Тым не менш з вышэйнапісанага бачна: зараджэнне мадэрнай беларушчыны ў XIX ст. адбывалася з арганічным успрыманнем ў сваім кантэксце гістарычнай постаці героя. Прынамсі з ім звязаны фальклор. Былі і аўтарскія творы. Аднак гэту тэндэнцыю ў лоне Расійскай імперыі змаглі прыглушыць.

Адраджэнне рэцэпцыі Т. Касцюшкі як свайго славутага земляка ў беларусаў адбылося напоўніцу ў часы суверэннасці краіны. Тон задалі паэты. Падключыліся празаікі і драматургі. Звярнула ўвагу на Касцюшку маладое пакаленне творцаў.

Натуральна, пачаліся гістарычныя даследаванні з беларусацэнтрычных пазіцый. У выніку падзеі падзелаў Рэчы Паспалітай і тагачасныя дзеячы сталі разглядацца як частка айчыннага мінулага, а не чужароднай дзяржавы. Разам з тым захавалася моцнай адваротная лінія, калі той жа Т. Касцюшка адназначна маркіруецца не толькі палякам, але і (іншым разам) ворагам беларушчыны. Час

паказвае, што першая візія – разгляду Т. Касцюшкі ў канструктыўным святле – бярэ верх над другой.

Лепшым доказам пашырэння памяці пра Касцюшку ў культуры беларускага народа з'яўляецца распаўсюджванне яго імя на шыльдах (перадусім назваў вуліц), у музеях, адбываецца аднаўленне памятных мясцін, устаноўка помнікаў. Пра героя як пра свайго загаварылі ў вышэйшых колах беларускай палітыкі.

У той жа час нельга казаць, што імя Тадэвуша Касцюшкі татальна ўвайшло ў памяць паспалітых беларусаў. Пакуль яно вядома галоўным чынам гуманітарнай інтэлігенцыі. Яго замацаванне ў беларускай культуры пры захаванні азначанай тэндэнцыі, несумненна, адбудзецца, але паступова. Калі ж тэма стабільна выйдзе на ўзровень дзяржаўнай справы, можна быць упэўненым, вобраз Тадэвуша Касцюшкі ў якасці дабратворнага элемента нацыятворчасці за кароткі час трывала ўкараніцца ў народнай свядомасці беларусаў.

Літаратура:

1. Бензярук, А. Касцюшкі-Сяхновіцкія : гісторыя старадаўняга роду / А. Бензярук. – Брэст : Издательство "Академия". – 132 с.

2. Бічэль-Загнетава, Д. Ценям Касцюшкі / Д. Бічэль-Загнетава // ЛіМ. – 1978. – 18 жніўня. – С. 4.

3. Гісторыя Беларускай ССР. У 5-і т. Т. 1. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 632 с.

4. Каминский, В. Белоруссы Ново-Александровскаго уезда, Ковенской губерніи, въ ихъ песняхъ, обрядахъ и обычаяхъ (Изъ отчета о командировке съ этнографической целью въ апреле 1903 года) / В. Каминский // Филологические записки. – Воронеж, 1910. – Выпуск V. – С. 755-756.

5. «Касцюшка наш!» Калі ў Марачоўшчыне адкрыюць помнік нацыянальнаму герою Беларусі // Planeta Belarus Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://planetabelarus.by/articles/1162-ivatsevichi-region/7114-kastsyushka-nash-kali-maracho-shchyne-adkryyuts-pomnik-natsyyanalnamu-geroyu-belarusi-/. – Дата доступу : 13.01.2018.

6. Мальдзіс, А.І. На скрыжаванні славянскіх традыцый : літаратура Беларусі пераходнага перыяду (другая палавіна XVII – XVIII ст.) / А. Мальдзіс. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 352 с.

7. Трафімчык, А. В. «Наш Касцюшка слаўны!» : гістарычная постаць Тадэвуша Касцюшкі ў беларускай літаратуры / А.В. Трафімчык. – Мінск : А.М. Янушкевіч, 2017. – 192 с.

8. У Мінабароны Беларусі прызналі героямі Касцюшку і Астрожскага // euroradio.fm [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://euroradio.fm/u-minabarony-belarusi-pryznali-geroyami-astrozhskaga-kascyushku-i-klimuka. – Дата доступу : 13.01.2018.

9. Хаўстовіч, М. В. Праблемы атрыбуцыі літаратуры Беларусі канца XVIII стагоддзя / М. В. Хаўстовіч // Гісторыя беларускай літаратуры : стан і перспектывы даследавання (да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа) : матэрыялы Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі (Мінск, 15–16 лістапада 2017 г.) / Цэнтр даследаванняў бел. культуры, мовы і літ. Нац. акадэміі навук Беларусі. – Мінск : Права і эканоміка, 2017. – С. 296-302.

***Навуковае выданне***

Тадэвуш Касцюшка ў дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці.

Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі

Падпісана да друку 20.11.2018
Папера афсетная. Друк лічбавы.
Фармат 60х84 1/16. Гарнітура "Таймс"
Ум. выд. арк 8. Ум. друк. арк. 10.
Наклад 50 ас. Заказ 65

УП «Энцыклапедыкс»
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюдніка друкаванай прадукцыі
ад 3 красавіка 2014 г. № 1/266
вул. К. Маркса, 15, 203А, 220030, Мінск.
Тэл./факс 328-45-39, E–mail: encyclopedix@tut.by,
Сайт www.who-is-who.by

Надрукавана на тэхніцы УП «Энцыклапедыкс»

ISBN 978-985-7153-58-9

9 789857 153589

**Тадэвуш Касцюшка** у дыскурсе 200-гадовай прасторы памяці